Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 3 (4446) 18 студзеня 2008 г.

У нумары:

Падарожжа са старымі паштоўкамі

Альбом «У пошуках страчанага: Гісторыя Беларусі ў старых паштоўках» — чарговая падзея ў айчынным кнігавыданні.

Стар. 3

Творчая рэпутацыя

Агляд 12-х нумароў часопісаў «Полымя», «Маладосць» і «Нёман».

Стар. 7

Помніцца...

Да 100-годдзя беларускага скульптара, народнага мастака СССР Заіра Азгура.

Стар. 11

Мова фарміруе нашу супольнасць

У аснове духоўнага і нават эканамічнага развіцця грамадства — мова.

Стар. 14

«Ты помніш, Алёша...»

Гісторыя знакамітага верша К. Сіманава звязана з вёскай Трасцянка Талачынскага раёна.

Стар. 15

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

ПАДПІСАЦЦА НА ШТОТЫДНЁВІК «ЛіМ» МОЖНА З ЛЮБОГА МЕСЯЦА

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 6400 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 8300 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: першае паўгоддзе, на 1 месяц — 4400 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска: 1 месяц — 6500 руб.
Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

З пачуццём гонару

Закончыўся стары год, пачаўся новы... Нехта падсумоўвае вынікі, хтосьці вызначае планы на наступны. На гэты перыяд заўсёды прыпадае шмат знамянальных падзей і святаў. Доўгачаканыя зімовыя канікулы ў школьнікаў, каталіцкія і праваслаўныя Каляды, навагоднія ёлкі, кірмашы, выстаўкі, імпрэзы... Пачатак новага года вылучаецца традыцыйнай дзеяй урачыстага ўзнагароджвання прэміямі "За духоўнае адраджэнне" і спецыяльнымі прэміямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячаў культуры і мастацтва.

На гэты ж перыяд прыпадае своеасаблівае адраджэнне прыроды. Адметнае "адраджэнне" сонца, якое пакрысе пачынае вышэй узнімацца па небасхіле і шторання "нараджае", дорыць яшчэ крыху больш падоўжаны дзень... Так і эпоха Адраджэння паўстае своеасаблівым духоўным пераломам чалавецтва, калі развіваліся асвета, культура, пісьменства. Менавіта на гэты час прыпадае жыццё гуманіста, навукоўцы-асветніка, першадрукара Францыска Скарыны. Дзейнасць выдатнай асобы ўвасоблена і адлюстравана яго спадкаемцамі не толькі ў шматлікіх даследаваннях, кнігах і помніках, але і ў ганаровых дзяржаўных узнагародах — ордэну і медалі Францыска Скарыны.

Імі ганаруюць работнікаў навукі, народнай адукацыі і культуры за выдатныя дасягненні ў галіне нацыянальнай мовы, літаратуры, мастацтва, прапаганду культурнай спадчыны беларускага народа.

Так, традыцыйнае свята Старога Новага года сталася для некаторых яшчэ і асабістым святам — у гэты дзень дзяржаўных узнагарод, падзяк Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і ганаровых званняў былі ўдастоены лепшыя прадстаўнікі нашага грамадства.

На цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод Кіраўнік нашай краіны адзначыў: "Мы падкрэсліваем важнасць умелай і мэтанакіраванай выхаваўчай работы, паслядоўнай і актыўнай пазіцыі ў прапагандзе культурных і маральных каштоўнасцей, кансалідацыі грамадства дзеля ўмацавання і росквіту нашай маладой дзяржавы".

Сярод узнагароджаных — кіраўнікі ВНУ, вучоныя і педагогі, дзеячы мастацтва, прадстаўнікі СМІ...

Так, ордэнам Францыска Скарыны ўзнагароджаны галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка" Уладзімір Ліпскі, медалём Францыска Скарыны — галоўны дырыжор Прэзідэнцкага аркестра Віктар Бабарыкін, галоўны рэдактар часопіса "Маладосць" Раіса Баравікова, хормайстар Ала Ігумнава...

Адразу пасля атрымання высокай дзяржаўнай узнагароды карэспандэнт "ЛіМа" запытаўся ў пісьменніцы Раісы Баравіковай, што значыць для яе асабіста і творчай супольнасці краіны медаль Францыска Скарыны. *"Вельмі цудоўна, што ў нас ёсць такія ўзнагароды, як ордэн і медаль Францыска Скарыны,* — зазначыла Раіса Андрэеўна. — *А яшчэ лепш, што традыцыйна гэтыя ўзнагароды атрымліваюць нашы творцы. Бо Скарына, перш за ўсё, — наша дзяржаўнасць, беларускасць, духоўнасць. Хвалюючы момант — атрымаць такую ўзнагароду. Адразу напрошваецца пытанне: а ці заслугоўваеш ты яе? Бо падчас уручэння любых узнагарод міжволі пракручваеш сваё жыццё, падсумоўваеш, што зроблена, што недароблена, трэба мець нейкую напрацаванасць, творчы падмурак.*

Творца, як і работнікі іншых сфер, павінен адчуваць, што і ягоная праца патрэбная і паважаная. Вельмі прыемна, калі гэта падзяка ідзе ад чытача, але, безумоўна, яшчэ больш прыемна, калі твае набыткі адзначае дзяржава. Значыць, літаратура не адкінутая ад жыцця, ад грамадства, а цэніцца і ўшаноўваецца.

Вельма часта ў творчым асяродку гучыць слова "бестселер". Бестселеры — найчасцей з'ява масавай нізкамастацкай літаратуры. Такая літаратура ўзнікае ў час вялікіх трывог, хваляванняў. А для росквіту нармальнага грамадства, якое пачынае стабільна развівацца, патрабуецца высокая духоўнасць, інтэлект, увогуле, культура. Тады ствараецца добрая літаратура: адметная, глыбакадумная проза, лірычная, філасофская паэзія, дзіцячая літаратура...

Сённяшнім днём усё гэта ў нас ёсць. У мяне асабіста пачуццё гонару за нашу краіну, нашу літаратуру. Яна можа перакладацца на іншыя мовы і вельмі хораша ўспрымацца ў любой краіне свету".

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымку: пісьменнікі Уладзімір Ліпскі і Раіса Баравікова.

Фота БелТА

Святлынь старонкі роднай

Майстар манументальнага жывапісу, вучань Гаўрылы Вашчанкі і Уладзіміра Стальмашонка, перакананы рэаліст і натхнёны рамантык, Віктар Барабанцаў адзначае сваё 60-годдзе вялікай персанальнай выстаўкай.

Маштабная экспазіцыя разгарнулася пад скляпеннямі сталічнага Палаца мастацтва. Яе ёмістая назва —"Спадчына" — гучыць з купалаўскім падтэкстам: гэты мастак грунтоўна вывучае і малюе тое, што засталося яму "ад прадзедаў спакон вякоў", з цікавасцю ўглядаецца ў абліччы легендарных продкаў і адметных асоб новага часу, замілавана апявае старонку родную. Тэматычныя карціны, пейзажы, нацюрморты, партрэты... Больш як паўтары сотні ўзораў рознажанравай творчасці Віктара Барабанцава, сабраныя разам, люструюць абагульнены вобраз Беларусі — такой дарагой для мастака, адзінай на ўвесь свет, непаўторна прыгожай, самабытнай, святой зямлі з яе шчырым, добрым, шматпакутным і трывушчым, цягавітым і таленавітым людам.

(Працяг на стар. 11)

Будзённых дзён святочнасць…

Для жыхароў Мінскай вобласці пачатак студзеня быў асабліва святочным. У палацах культуры і сельскіх клубах выступалі артысты, гучалі ўрачыстыя словы пра родную старонку, падводзіліся вынікі работы за мінулы і некалькі апошніх гадоў. Мінскай вобласці, створанай 15 студзеня 1938 года, споўнілася 80 гадоў. Падзея? Несумненна, падзея, вартая ўвагі. Ці заўважылі яе ва ўсіх гарадах і вёсках? Ці сталася яна прадметам гонару і ўвагі самых розных груп насельніцтва?..

Цяжка меркаваць за ўвесь рэгіён, цяжка гаварыць за дзесяткі і сотні тысяч жыхароў краю, і ўсё ж...

Адзін з адрасоў святкаванняў — Мар'іна Горка, цэнтр Пухавіцкага раёна. Па тварах людзей, якія сабраліся ў зале палаца культуры, можна было ўжо на самым пачатку сказаць: "Усе прыйшлі на свята..." І ўсіх, хто сабраўся ў святочнай зале, ушанавалі, адзначылі. Не было сярод удзельнікаў святкавання людзей выпадковых. Узнагароды Мінскага аблвыканкама, якія ўручаў намеснік старшыні аблвыканкама Анатоль Мірчук, граматы і падзякі райвыканкама, каштоўныя падарункі — і кіраўнікам вытворчасці, і настаўнікам, і ўрачам, і прадпрымальнікам, і таленавітым школьнікам, работнікам сферы бытавога абслугоўвання і гандлю, банкірам, работнікам сельгаспрадпрыемстваў, будаўнікам...І нават землякам, якіх на сустрэчу прыехала асабліва шмат: ганаровыя грамадзяне Мар'інай Горкі доктар медыцынскіх навук Арнольд Смеяновіч, генерал-лейтэнант у адстаўцы Яўген Мікульчык, доктар тэхнічных навук Міхась Міцкевіч... Сам факт, што ўсіх , літаральна ўсіх, хто асабліва рупіўся ў розных галінах, на розных нівах, заўважылі, ацанілі, уразіў удзельнікаў свята. Прыемнымі, цёплымі словамі адзначыў, каго толькі мог, старшыня Пухавіцкага райвыканкама Пётр Караленя.

Пра свята, настрой, які задавалі самадзейныя і прафесійныя артысты, можна распавядаць доўга. Але лепей — пра тое, што засталося ў кулуарах... Давялося выслухаць меркаванні аднаго з ганаровых гасцей — ураджэнца вёскі Благадаць Пухавіцкага раёна доктара гістарычных навук, прафесара Валерыя Ананіча. Дасведчаны ў гісторыі і юрыспрудэнцыі (многія гады выкладае ў Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь), Валерый Антонавіч выказаўся за тое, што пара паяднаць землякоў, стварыць своеасаблівы зямляцкі клуб з разлікам на тое, што знакамітасці будуць працаваць на свой край. Пра клопат паяднання землякоў гаварыў і старшыня райвыканкама Пётр Караленя. Ці адбудзецца гэта і ў якой форме — пакажа час.

...Гэтыя дні супалі з выданнем арыгінальнай кнігі: трохтысячным накладам у выдавецтве "БелЭН імя Петруся Броўкі" пабачыў свет першы том двухтомнай энцыклапедыі "Мінская вобласць". Такі вопыт рэгіянальнай энцыклапедыі ўражвае і прыцягвае ўвагу. Відаць, рэгіянальныя энцыклапедыі і землякоў "прарэвізуюць", паяднаўшы тым самым яшчэ болей жыхароў, як правіла, сталіцы з вяскоўцамі родных раёнаў Міншчыны. Прыемна, што ва ўшанаваннях на той жа Пухавіччыне не забыліся пра майстроў прыгожага пісьменства, пра людзей культуры і асветніцтва. У Мар'інай Горцы жывуць і працуюць члены Саюза пісьменнікаў Беларусі Браніслаў Зубкоўскі, Вольга Савасцюк, Мікалай Гурын. У апошні час выдалі свае кнігі Сяргей Сіпач, Уладзімір Рунцэвіч. На сцэну Палаца культуры для ўшанавання падымаліся і Браніслаў Зубкоўскі, і паэт Алена Радкевіч...Свой верш, прысвечаны Міншчыне, чытала член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь , дырэктар мар'інагорскай гімназіі Ала Ралькевіч. І хто ведае, магчыма, якраз яшчэ менавіта Мар'іна Горка і стане адным з чарговых адрасоў Дня беларускага пісьменства. Падставы на тое ёсць — на Пухавіччыне нарадзіліся Аляксандр Ельскі, Міхась Чарот, Васіль Гарбацэвіч, Анатоль Вольны, Аркадзь Моркаўка, Макар Паслядовіч, Захар Бірала, Алесь Бачыла, Уладзімір Хадыка, Пятро Рунец, Генадзь Кляўко, Валянцін Мыслівец, Уладзімір Ляпёшкін, Таіса Бондар. Тут пісалі свае творы Янка Маўр, Якуб Колас, Пятрусь Броўка, Антон Бялевіч. Пантэон імёнаў! За кожным —кнігі і творы! За кожным — кавалачак Пухавіччыны, Міншчыны...

Мікола МІРШЧЫНА

Запрашае «Славутасць»

Паводле рашэння Мінгарвыканкама па развіцці Мінска як турыстычнага цэнтра і пашырэнні культурна-гістарычнай структуры Старога горада, на тэрыторыі Траецкага прадмесця адкрылася новая мастацкая галерэя — галерэя рамёстваў "Славутасць".

У адрозненне ад галерэі "Славутыя майстры", якая знаходзіцца побач і скіравана на аўтэнтычнае сялянскае мастацтва, тут прадстаўлены менавіта гарадскія рамёствы.

Як зазначыла дырэктар галерэі, мастацтвазнаўца Алена Спірыдонава, у экспазіцыі яны імкнуцца выставіць работы лепшых майстроў Беларусі, якія працуюць у традыцыі гарадскіх цэхаў рамёстваў. А гэта больш чым 500 майстроў-прыкладнікоў з усёй краіны: як членаў розных творчых саюзаў, так і асобных умельцаў...

Алена Аляксандраўна падкрэсліла, што тут няма ніводнай рэчы, якая прывезена з Польшчы, Расіі або Кітая, — усё зроблена айчыннымі майстрамі. Прычым рэчы не канвеерныя, ніводная з работ не паўтараецца. Іх можна не толькі паглядзець, але і набыць.

І сапраўды, тут кожны можа знайсці нешта прыдатнае як для падарунка, так і для сябе асабіста. (Ды і месца для такой установы вельмі добрае: Траецкае прадмесце наведваюць прадстаўнікі дыпламатычных службаў, шматлікія замежныя турысты і экскурсійныя групы.) У галерэі выбар агромністы і на любы густ. Розныя віды керамікі Д. Панамарэнкі, А. Ткачова, Л.Нішчык; жывапіс Я. Жыліна; разнастайныя вырабы з саломкі Л. Главацкай, Л. Селівончык, Р. Раманені; батык В. Удавенкі; лялькі І. Ражко, В.Ахмеравай; адмысловыя керамічныя шахматныя партыі Р. Пашкова. А яшчэ вырабы са скуры гродзенскага майстра В. Макея, карціны з салёнага цеста В. Грэк, дыхтоўныя вырабы з бяросты, абразы, пісанкі, мэбля з лазы... Унікальны від народнага мастацтва — драўляная скань — прадстаўляюць майстры з Гомеля У. Цэкуноў, М. Шумскі. І шмат, шмат іншага.

Апроч экскурсій (яны, да слова, як і ўваход, — бясплатныя) плануецца правядзенне майстар-класаў па батыку, керамічцы, роспісе па шкле. Дзейнасць установы спалучае эстэтычную, пазнавальную і аднаўленчую функцыі. Так, адноўлены вясельны абрад: разам з майстрам на ганчарным крузе маладыя могуць стварыць першы сумесны сасуд шчасця, і на яшчэ вільготных сценках напісаць словы віншаванняў або пажаданняў. Пагадзіцеся, карысная разнастайнасць у вясельную "будзённасць" ЗАГС — рэстаран.

У цэнтры залы знаходзіцца дрэва — сімвалічнае дрэва жыцця, дрэва рамёстваў. Ды і лозунг, адзначае Алена Спірыдонава, для новай галерэі абралі адпаведны — "Традыцыі і творчасць": адноўленыя традыцыі, памножаныя на талент і душу мастака, увасабляюцца ў арыгінальных работах.

Віктар КАВАЛЁЎ
Фота аўтара

Месца сустрэчы — « F.-ART.by»

Значную частку студэнтаў беларускіх ВНУ складае замежная моладзь. Гэта каля 7000 чалавек з 72 краін СНД, Балтыі і далёкага замежжа. Добрай магчымасцю распавесці пра сваю культуру, рэалізавацца ў творчым плане і наладзіць кантакт з тутэйшымі студэнтамі для такой моладзі стаў Рэспубліканскі фестываль творчасці замежных студэнтаў "F.-ART.by".

Непасрэдным арганізатарам мерапрыемства з'яўляецца Установа адукацыі "Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі" Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Ужо 5 гадоў фестываль спрыяе стварэнню асяродка творчых камунікацый беларускіх і замежных студэнтаў, падтрымлівае моладзевыя ініцыятывы і папулярызуе вопыт фарміравання выхаваўчага асяродка ў ВНУ. Творчая камунікацыя студэнтаў у межах дадзенага праекта дапамагае моладзі ідэнтыфікаваць сябе нацыянальна, засвоіць важнейшыя духоўныя каштоўнасці — павагу да іншых культур, нацыянальную талерантнасць і рэлігійную цярпімасць, захаванне нацыянальных традыцый і развіццё беларускай культуры.

У гэтым годзе змяніўся маштаб фестывалю — замест некалькіх дзён ён расцягнуўся на цэлыя два месяцы. Распачаўся фестываль канцэртам творчых калектываў ВНУ і замежных студэнтаў: ансамбля "Ярыца" ("Завітайце, госці", "Чувер"), фальклорнага гурта "Гаманіна" (вакальна-харэаграфічная кампазіцыя "Чобаты"), Ху Мін (кітайская народная песня), Ван Тунсяо (арыя з оперы Дж. Вердзі "Турандот") і г. д. У праграму "F.-ART.by" увайшла прэзентацыя стэндаў з даведачнай літаратурай па аказанні адукацыйных паслуг замежным студэнтам, выстава-дэманстрацыя дзіцячай творчасці "Асеннія фантазіі", канцэрт-перформанс "Свет у далонях", аўкцыён творчых ініцыятыў студэнтаў, тэматычныя канцэртныя праграмы "Шчыра вітаюць сяброў беларусы", "Арнаменты краін — у арнаменце свету" і г. д.

"Дні культуры краін" змясцілі ў сабе цыкл мерапрыемстваў, арганізаваных зямляцтвамі замежных студэнтаў, а "Дзень культуры Беларусі" пазнаёміў моладзь з адметнымі мясцінамі сталіцы падчас экскурсіі "Мінск старажытны і сучасны", наведвання Мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Завяршыўся двухмесячны карагод студэнцкай фантазіі "круглым сталом" з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, выкладчыкаў і навучэнцаў ВНУ ды ўзнагароджаннем самых актыўных удзельнікаў фестывалю.

Ганна КОТ

Беларускія пісьменнікі ў Літве

Віленская сярэдняя школа імя Ф. Скарыны вядомая не толькі ў Літве, але і ў Беларусі. Аб гэтым сведчыць той факт, што ў школу рэгулярна наведваюцца госці з нашай краіны — пісьменнікі, навукоўцы, людзі, якія цікавяцца беларускай культурай.

Трэба сказаць, што беларускія традыцыі ў школе ашчадна і дбайна захоўваюцца — дзякуючы намаганням настаўнікаў і вучняў тут створаны літаратурны музей, праводзяцца мастацкія выставы, імпрэзы, на якіх спяваюцца беларускія песні, чытаюцца вершы. У школе працуе таксама літаратурны гурток, выдаецца маладзёжная газета.

Цесна супрацоўнічае з прадстаўнікамі беларускай культуры ў Літве, у тым ліку з беларускай школай і Саюз пісьменнікаў Беларусі. Напрыканцы снежня па запрашэнні Пасольства Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы сталіцу суседняй краіны наведалі беларускія літаратары: намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Маладосць" Аляксей Чарота і супрацоўнік шматыдзённіка "Літаратура і мастацтва" Янка Лайкоў. Візіт гасцей у сярэднюю школу імя Ф. Скарыны быў прымеркаваны да святкавання юбілеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа. На сустрэчы абмяркоўвалася шырокае кола пытанняў. Госці распавялі пра мерапрыемствы, якія адбываліся ў Беларусі ў сувязі з юбілеямі класікаў. Літоўскую моладзь сапраўды цікавіць тое, што адбываецца ў нашай краіне. У прыватнасці, навучэнцы задавалі пытанні пра маладзёжныя праекты, што ажыццяўляюцца Саюзам пісьменнікаў, пра тыя магчымасці, якія існуюць у нашай краіне для маладых літаратараў у плане друкавання і выдання твораў. Сярод вучняў школы шмат хто таксама спрабуе сябе ў прыгожым пісьменстве. У сувязі з гэтым госці запрасілі маладых творцаў да супрацоўніцтва з беларускімі выданнямі. Па просьбе слухачоў Янка Лайкоў чытаў свае вершы, Аляксей Чарота распавядаў пра сваю перакладчыцкую і літаратуразнаўчую дзейнасць.

Шчырая, зацікаўленая гутарка дала плён: гаспадары і госці імпрэзы засталіся задаволеныя, абодва бакі атрымалі ад сустрэчы неабходны зарад эстэтычнага задавальнення. Беларускія госці пакінулі ў падарунак школе юбілейныя выданні твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама кнігі вядомых сучасных беларускіх пісьменнікаў, выдадзеныя ў серыі "Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі". Такі ж камплект быў падараваны і Пасольству Рэспублікі Беларусь у Літве.

Іван ПЛЁСАЎ

Новыя артэфакты

Радзівілы ў Нясвіжы жылі вельмі ж ахайна: усё смецце з замкавага комплексу старанна збіралася і вывозілася — таму і так званага культурнага слоя непасрэдна ў Нясвіжскім замку амаль не захавалася. Іншая справа — тэрыторыя вакол замка, якая шораз прыносіць археолагам новыя сюрпрызы.

Летась работы археолагаў зводзіліся да ачысткі замкавага рова ля паўднёва-заходняга бастыёна і ачысткі валоў ад культурнага слоя, які закрывае валы першапачатковыя.

— *Равы ўжо чысціліся неаднойчы,* — распавёў карэспандэнту "ЛіМа" кіраўнік праекта, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі **Андрэй Мяцельскі**. — *У першы раз — у 40-я гады XVIII стагоддзя, калі было знойдзена шмат гарматных ядраў. Іх склалі ў кучу, і прадстаўнік роду Радзівілаў сказаў тады даследчыкам: "Бачыце, як нас шведы частавалі". Вось і летась мы знайшлі шмат ядраў ад гармат, пушку малога калібра канца XVI стагоддзя, шматлікае ўзбраенне. Ахоўны элемент*

шлема воіна — другая па ліку падобная знаходка ў Беларусі.

Даследчыкі нарэшце "дабраліся" да радзівілаўскай стайні, якая ўпершыню згадваецца ў інвентары замка 1653 года. Археолагі знайшлі яе сцены, а дакладна вывучаць пачнуць ужо сёлета. Ёсць меркаванні, што з яе існуе ўваход на бастыён.

Увогуле, новы маштаб набыло ў 2007-м вывучэнне падземных хадоў Нясвіжскага замка, якія даўно "абраслі" легендамі і паданнямі.

Сёння вядомыя чатыры падземныя хады. Два, вышынёй 1,2 метра кожны, мелі тэхнічнае прызначэнне — магчыма, для каналізацыі. З двух высокіх (1,6—2,3 метра) — адзін, даўжынёй 42 метры, выкарыстоўваўся для таго, каб можна было набраць вады з замкавага рова падчас аблогі. А другі, даўжынёй 25 метраў, выходзіў з хаты гарматніка на баявыя пазіцыі. Андрэй Мяцельскі не выключае, што неўзабаве будуць знойдзены новыя хады пад замкавым комплексам, але не такія фантастычныя, як 25-кіламетровы ход да Міра.

Сёлета спецыялісты плануюць прадоўжыць ачыстку валоў, даследваць стайню. Археолагі маюць жаданне пашукаць рэшткі замка Мікалая Радзівіла Чорнага — таго, які існаваў да будаўніцтва мураванага замка, вядомага нам сёння.

— *Можа, атрымаецца "зачапіць" падмуркі тых будынкаў, і хоць бы пліткай выкласці іх контуры — паказаць наведвальнікам, дзе яны стаялі. Ёсць жаданне папрацаваць і ў Альбе. Там дагэтуль адгадваюцца старажытныя алеі, трэба іх толькі аднавіць. Усё ж такі, гэта — адзін з найстарэйшых паркаў Еўропы.*

Мікалай АНІШЧАНКА

На здымку: гарматныя ядры, знойдзеныя ў рове Нясвіжскага замка.

Падзеяй у айчынным кнігавыданні мінулага года можна назваць выхад альбома "У пошуках страчанага: Гісторыя Беларусі ў старых паштоўках", які пабачыў свет у РВУ "Літаратура і Мастацтва". Ажыццёўленае па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выданне сабрала пад адной вокладкай 340 паштовак з калекцыі вядомага філакартыста, лаўрэата прэміі "За духоўнае адраджэнне" Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА. 239 старонак паядноўваюць відарысы беларускіх гарадоў і мястэчак, часам звычайных вёсак, зусім невялікіх паселішчаў. Кніга раскладзена па раздзелах, у якіх прадстаўлены ўсе вобласці краіны, сталіца, абласныя цэнтры. Асобна вылучаны найбольш прыкметныя ў гісторыі Беларусі гарады — Пінск, Полацк, Навагрудак. Прадмова да сапраўды унікальнага альбома належыць пяру заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь, лаўрэата прэміі "За духоўнае адраджэнне", галоўнага рэдактара газеты "Советская Белоруссия" Паўла ЯКУБОВІЧА.

Падарожжа са старымі паштоўкамі



Вось што, у прыватнасці, ён зазначае, звяртаючыся да чытачоў: "Перад вамі унікальная кніга, якая дазволіць вам здзейсніць падарожжа ў часе. Пагартайце старонкі яе, і вы ўбачыце сівыя замкі і мураваныя храмы, вузенькія вуліцы і вытаптаныя сцяжынкі, запыленыя гарады і жывапісныя мястэчкі. Вы наяве ўбачыце людзей, якіх ужо няма, але якія жылі ў Беларусі і дзякуючы гэтай кнізе сталі вашымі сучаснікамі".

Уважліва ўглядаючыся ў старыя паштоўкі, сапраўды становішся сведкам многіх, дагэтуль не вядомых падзей. Захаванае з дапамогай фотаздымка імгненне ўсё ж такі дазваляе з ролі статычнага сузіральніка ператварыцца ў дынамічнага ўдзельніка тых ці іншых падзей. Старая фатаграфія нараджае новае ўяўленне, дапамагае падарожнічаць у часе, уносіць у нашы развагі пра розныя дзесяцігоддзі пэўную інтрыгу. Часам падаецца, што на гасцінным двары ў Брэсце альбо на Водным кірмашы ў Пінску мог бы прысутнічаць і ты сам. Дастаткова толькі зусім крышачку пашырыць веданне пра гэтае месца, зазірнуць за межы фотаздымка. Але ж першаштуршок ёсць — старая паштоўка. Калекцыя Уладзіміра Ліхадзедава, якая ўбірае ў сябе болей як 10 тысяч паштовак, нагадвае планету, дзе ёсць месца ўсім жыхарам Беларусі — палякам і рускім, яўрэям і татарам, гараджанам і сялянам, местачкоўцам і хутаранам... Побыт, асветніцкае і культурнае жыццё нашых прашчураў, трывога і пакуты, узлёты і ўзнёсласць штодзённага і святочнага жыцця — пра ўсё расказваюць цікавыя і насычаныя на інфармацыю відарысы. Досыць часта, асабліва пры аглядзе не самых вядомых паселішчаў, здымкі выклікаюць не проста цікавасць, але і здзіўленне. Давыд-Гарадок уражвае Рынкавай плошчай, кліча на прыстань 1930-х гадоў... Углядайцеся, краязнаўцы! Углядайцеся, жыхары пачатку трэцяга тысячагоддзя! Іншай крыніцы па ўзнаўленні таго часу ва ўсёй яго дакладнасці няма!.. Астатняе можна дабудоўваць. Вядомая Белая вежа з Камянца прадстаўлена паштоўкай, якая была выдадзена гуртком па вывучэнні Гродзенскай губерні, што існаваў пры Санкт-Пецярбургскім універсітэце. Ці ёсць гурток па вывучэнні пэўнага рэгіёна пры гістфаку Беларускага (а не Пецярбургскага!) дзяржаўнага універсітэта сёння, адразу падумалася мне, калі ўглядаўся ва унікальны здымак.

Не можа не прыцягваць увагу раздзел з дзевяці паштовак, які знаёміць з даўнім Полацкам. Від горада з Нікольскага сабора, агульны від горада з вышыні птушынага палёту, шпіталь таварыства Святога Георгія, Пятніцкая царква, Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, від на горад і Сафійскі сабор, Полацк, які аглядаецца з аднаго берага Дзвіны, від з Краснага моста... Палітра ўражанняў і адкрыццяў! Падказка ў дарогу, накірунак канкрэтнага экскурсійнага маршруту!.. Вось што дае кніга, якая, здавалася б, усяго толькі пра мінуўшчыну. На самай справе ў альбома "У пошуках страчанага" — велізарны эмацыйны зарад. З гэтай кнігай можна і адпачываць, і насычацца турботамі пра ўласнае духоўнае ўзвышэнне.

Завяршаюць раздзелы асобна вылучаныя паштоўкі цыкла "Беларускія вобразы". Дванаццаць паштовак нагадваюць пра нашых прашчураў — пра сялянскае вяселле ў кобрынскім Воўчыне, пра жыхароў Брэст-Літоўскага павета (асобна сфатаграфаны мужчыны і асобна жанчыны), палескія дзеці... Уражваюць кажухі сялянак Мінскай губерні, здзіўляюць капелюшы жыхароў з вёскі Чэрск, што на Брэстчыне. Прыгледзьцеся да паштовак з гэтага раздзела найболей уважліва — мо дзе знойдзеце і вам блізкія рысы, рысы прадзедаў і прабабуль.

...У паслясловў'і да кнігі "У пошуках страчанага" лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар Адам Мальдзіс падкрэслівае: "Матэрыялы кнігі, з якой вы пазнаёміліся, маюць для нашага грамадства, нашай дзяржавы, такой маладой і адначасова такой сталай, з тысячагадовай, багатай, але далёка не да канца спазнанай гісторыяй, вялікае павучальна-пазнаваўчае і выхаваўчае значэнне. Павучальнае — таму, што вучаць павазе да продкаў, да гістарычных традыцый. Пазнаваўчае — таму, што дазваляюць нам шырэй глянуць на мінулае: не ўсё ў ім было такое дрэннае, як нам часам у працэсе самасцвярджэння здаецца; і раней узводзіліся будынкі, якія мелі і маюць эстэтычную каштоўнасць. Іншая справа, што войны і наша нядбайнасць прывялі да разбурэння многіх помнікаў архітэктуры. А выхаваўчае — таму, што вучаць нас любові да Айчыны, малой і вялікай.

Вядома, пакуль не ўсе рэгіёны і раёны апісаны ў кнізе з аднолькавай падрабязнасцю. Падчас не ўсюды аднолькава вытрыманы алфавітна-геаграфічны прынцып размяшчэння матэрыялу. Але я веру, што ў гэтага унікальнага выдання будзе доўгае і шчаслівае жыццё, што за першым выданнем пасля распродажу яго тыражу будзе другое, істотна дапоўненае. А потым і трэцяе, дзе даўнія паштоўкі будуць спалучацца з сённяшнімі здымкамі, І тады мы пабачым, дзе і што мы прыдбалі, памножылі, а дзе і што згубілі. Прыдбалі найперш у маштабнасці, мадэрнасці і адначасова згубілі ва ўтульнасці, сувымернасці месца і чалавека. Што ж, прагрэс часам патрабуе ахвяр. Абы толькі гэты прагрэс не быў бяздумным, абы паступальнасць пры ім спалучалася з захаваннем традыцый, зразумела, лепшых".

Шматпаважаны прафесар Адам Мальдзіс выклаў праграму, падказаў, якім шляхам ісці і калекцыянеру, і яго памагатым у выданні кнігі. Дарэчы, варта сказаць пра той выдавецкі калектыў, які рупіўся над тым, каб альбом прыйшоў да чытача. І рупіўся, варта заўважыць, настойліва. Рэдактар кнігі — Мікола Мінзер. Мастацкім афармленнем і макетам займалася вядомы кніжны дызайнер і графік Маргарыта Шкурпіт. Кіраўнік вытворчага аддзела РВУ "Літаратура і Мастацтва", шматвопытны выдавец (гэта дзякуючы ёй прыйшлі да юнага чытача ў свой час многія кнігі выдавецтва "Юнацтва") — Маргарыта Лейко. Варта ўсім ім сказаць: "Вялікі дзякуй і за асэнсаванне тэмы, і за ўдалае яе выкананне!" Падрыхтоўка альбома да выдання неаднойчы абмяркоўвалася на мастацкім савеце Міністэрства інфармацыі. Многія парады, якія толькі паспрыялі поспеху справы, выказаў кансультант упраўлення выдавецкай дзейнасці і кніжнага гандлю міністэрства вядомы мастак, кніжны графік Валерый Рагалевіч. Аддрукавана кніга "У пошуках страчанага" на Мінскай фабрыцы каляровага друку. Нельга не заўважыць, што аддрукавана выдатна і, дарэчы, у сціслыя тэрміны.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

З любоўю да роднага слова

Адзін са снежаньскіх тыдняў у нашай Тэльмаўскай сярэдняй школе быў прысвечаны беларускай мове. Дарэчы, ён так і называўся "Тыдзень беларускай мовы і літаратуры".

Трэба сказаць, што многія нашы настаўнікі, а ў першую чаргу, выкладчыкі беларускай мовы, добра прадумалі праграму і нямала пакарпелі над яе ажыццяўленнем. Таму ўсе пяць навучальных дзён прайшлі для нас па-святочнаму захапляльнага і з карысцю, бо былі непадобныя адзін да аднаго.

Напрыклад, у першы дзень тыдня ў школьным вестыбюлі была арганізавана выстава фотаздымкаў "Па родных мясцінах Якуба Коласа", зробленых падчас нашай летняй паездкі на радзіму класіка. Тут жа можна было прачытаць і паэму дзесяцікласніка Цімафея Герасімука, прысвечаную юбілею Якуба Коласа, а таксама палюбавацца пляценнем з саломкі і вырабамі з бісеру.

У сераду вучні 5-6 класаў глядзелі відэаэкскурсію "Шляхам Якуба Коласа", у чацвер праводзіўся конкурс чытальнікаў беларускай лірыкі і інсцэніровак гумарыстычных твораў, у пятніцу адбылося сапраўднае свята нацыянальнай кухні. Былі прадстаўлены такія беларускія стравы, як дранікі і таўканіца, бульба з лупінамі і квашаная капустка з гурочкамі, клёцкі, аладкі ды варэнікі, куцця і дамашняя каўбаска, шмат іншых страў.

Але найбольшае задавальненне атрымалі мы, старшакласнікі, калі нашу школу ўпершыню наведала берасцейская паэтка Надзея Парчук, з творчасцю якой мы не толькі даўно знаёмы, але і шмат яе вершаў ды гумарэсак ведаем на памяць, бо не раз даводзілася выкарыстоўваць іх на розных мерапрыемствах, інсцэніраваць на школьных і раённых конкурсах.

Прадставіла вучням паэтку наша настаўніца беларускай мовы — Мая Паўлаўна. Яна распавяла пра яе літаратурныя поспехі: дзе Надзея Мікалаеўна друкавалася, колькі кніжак выдала, засяродзіла нашу ўвагу на яе трапных і дасціпных афарызмах. Напрыклад, "Не дачакаўшыся старасці — не вучы старога, як жыць трэба", "Няшчаснымі робіць нас лёс, а шчаслівымі — добрыя людзі", "Не папракай сляпога ягонымі сінякамі, глухога — раўнадушшам, бязногага — гультайствам, маладога — нявопытнасцю, старога — нямогласцю. І калі ты ні ў чым не можаш ім дапамагчы, то памаліся хоць за сябе, што ты — не адзін з іх". Затым прагучала некалькі павучальных вершаў са зборнікаў Н. Парчук.

Калі ж загаварыла наша госця, то з першых яе слоў усе адчулі, што перад намі не толькі шчыры і чулы паэт, не толькі мужны і сумленны чалавек, але і выдатны прамоўца, тонкі псіхолаг, настаўнік моладзі, патрыёт сваёй Радзімы і да таго ж — асоба з тонкім адчуваннем гумару. Ад паэткі мы пачулі шмат новага і цікавага пра нашу мову, пра школьнае і творчае жыццё самой Надзеі Мікалаеўны, пазнаёміліся з яе новымі вершамі. Напрыканцы сустрэчы мы задалі госці некалькі пытанняў. Нагул, наша сустрэча з Надзеяй Парчук прайшла цікава і пакінула нам не толькі незабыўныя ўражанні, але і жаданне тварыць самім.

Елізавета КАЗІЦКАЯ,
вучаніца 9"А"класа
вёска Тэльмы Брэсцкага раёна

Выданне адметнае і грунтоўнае

На паліцах кніжных крамаў з'явіўся другі том "Гісторыі беларускай літаратуры XI—XIX стагоддзяў". З гэтай нагоды ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры прайшла вечарына.

"Выданне задумвалася ў 90-я гады мінулага стагоддзя, ва ўмовах ужо суверэннай Беларусі, — адзначыў ва ўступным слове навуковы рэдактар выдання Вячаслаў Чамярыцкі. — У параўнанні з ранейшымі кнігамі па гісторыі літаратуры яна больш грунтоўная, багатая персаналіямі. Калі раней у пэўны перыяд былі толькі Скарына і Будны, то цяпер тут болей як два дзесяткі пісьменнікаў, многія з якіх прадстаўлены асобнымі раздзеламі. Гэтае выданне доўга будзе служыць усім тым, хто цікавіцца літаратурай, хто хоча глыбей яе засвоіць."

Уладзімір Мархель, які таксама з'яўляецца навуковым рэдактарам выдання і аўтарам публікацый, звярнуў увагу на адметнасць эпохі, адлюстраванай у кнізе, а менавіта на падзеі XIX стагоддзя.

Для вядомага літаратуразнаўцы Адама Мальдзіса выданне стала трэцяй "гісторыяй", у працы над якой яму давялося ўдзельнічаць. Навуковец адзначыў, што прынцыповай адметнасцю новага выдання з'яўляецца перыядызацыя.

На думку загадчыка кафедры тэорыі літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта Вячаслава Рагойшы, "выкладчыкі павінны на аснове "Гісторыі беларускай літаратуры XI—XIX стагоддзяў" стварыць вучэбныя дапаможнікі і падручнікі." Да таго ж прафесар выказаў пажаданне ўбачыць у перакладзе на сучасную беларускую мову старабеларускія тэксты, якія цяжка даюцца студэнтам і чытаюцца імі без асаблівай асалоды.

Ян АКУЛІН

Коласа жыццё і песня натхняюць

Зінаіда Камароўская — чалавек у культурным асяродку краіны добра вядомы. З 1987 года яна рупіцца на ніве захавання і прапаганды ўсяго таго, што звязана з імем нашага слыннага песняра Якуба Коласа, узначальваючы музей, які цяпер афіцыйна называецца Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа. Апроч таго, з'яўляецца старшынёй Рады дзяржаўных музеяў краіны. Зінаіда Мікалаеўна была адным з ініцыятараў і аўтараў праекта мастацка-мемарыяльнага комплексу "Шлях Коласа". Дзякуючы яе рупнасці сталі традыцыйнымі такія святы, як "Каласавіны", "Слова пра Коласа", "Песняй вітаю я вас!", "Казкі жыцця", рэгулярна праводзяцца ў музеі "Літаратурныя чацвяргі". Навуковая ж канферэнцыя "Каласавіны" набыла статут Міжнароднай, у выніку яе правядзення было выдадзена звыш 20 зборнікаў даследчыцкіх прац.

Прыемна, што дзейнасць З. Камароўскай у імя нацыянальнага Адраджэння належным чынам ацэнена. Некалькі гадоў таму яна атрымала спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі "Музейная справа", нядаўна ж узнагароджана медалём Францыска Скарыны. Чым не нагода павіншаваць Зінаіду Мікалаеўну з гэтай узнагародай і пацікавіцца яе клопатнымі справамі. Тым больш, што турбот асабліва ставала апошнім часам, бо, як вядома, у сувязі з 125-годдзем з дня нараджэння народных песняроў 2007 год Указам Прэзідэнта быў аб'яўлены годам Янкі Купалы і Якуба Коласа.

— Калі ж быць больш дакладным, — сказала З. Камароўская, — дык сёлетні год для нас быў не толькі юбілеем аднаго з найвыдатнейшых беларусаў свету, што само па сабе, безумоўна, вельмі важна і адказна, а і знакавым яшчэ таму, што споўнілася 150 гадоў з дня нараджэння маці песняра Ганны Міцкевіч, а 40 гадоў таму ў Смольні быў адчынены філіял нашага музея. Дзве апошнія даты таксама не прайшлі незаўважанымі, больш таго — яны былі належным чынам адзначаны. Прынамсі, экспазіцыю ў Смольні абнавілі так, што яна па сутнасці стала новай. Да таго ж Стаўбцоўскі райвыканкам і начальнік аддзела культуры Анатоль Грэкаў вельмі дапамаглі нам у добраўпарадкаванні тэрыторыі, якая прылягае да філіяла.

Што тычыцца непасрэдна юбілейнага года самога Якуба Коласа, дык ён для нас пачаўся яшчэ летась. Прапаганда ўсяго таго, што звязана з жыццём, дзейнасцю і творчасцю Канстанціна Міхайлавіча, ладзілася такім чынам, каб нават тыя, хто знаходзіцца далёка ад Мінска, змаглі судакрануцца з духам Коласа. Дзеля гэтага мы арганізавалі шэраг выязных выстаў у Гайнаўцы на Беласточчыне, у Нясвіжы, Стоўбцах, Гомелі, Віцебску, Маладзечне, Шклове, а таксама ў Латвіі, Літве.

Цесныя сяброўскія стасункі склаліся ў нас з кіеўскімі музеямі, у прыватнасці, з музеем Максіма Рыльскага. Дзякуючы гэтаму пакладзены пачатак цікавай задумцы. На вечарыне "Нашчадкі славутых людзей" у нашым музеі збіраліся прапраўнук Тараса Шаўчэнкі, унук Максіма Рыльскага і сваячка Паўло Тычыны. Зразумела ж, была запрошана таксама радня Коласа на чале з ягоным малодшым сынам Міхасём Канстанцінавічам. У наступным годзе хочам правесці сустрэчу "Нашчадкі Кандрата Крапівы і Якуба Коласа". Магчыма, пройдзе і яшчэ адна — "Нашчадкі Заіра Азгура і Якуба Коласа".

— Памятаецца, які шырокі рэзананс мела сёлетняя "Музейная ноч". Хоць яна праводзілася і ў некаторых іншых аналагічных установах культуры, але, па сведчанні тых, хто збіраўся ля Коласавага дома і ў Коласавым доме, асабліва хораша праходзіла менавіта тут, дзе прысутнічае сам дух народнага песняра.

— "Музейная ноч" у нас прайшла другі раз і, безумоўна, пэўны вопыт дапамог надаць гэтаму мерапрыемству яшчэ большую непаўторнасць. Фінансавую дапамогу ў правядзенні яе аказалі аддзел культуры Стаўбцоўскага райвыканкама, Першамайскі райвыканкам сталіцы. Не абышлося і без падтрымкі збоку Міністэрства культуры. Прысутнічалі прадстаўнікі пасольстваў Японіі, Індыі, Украіны. Хоць афіцыйна час мерапрыемства быў абмежаваны 18—24 гадзінамі, людзі доўга не хацелі разыходзіцца, настолькі спадабалася ім тут.

— Калі ласка, яшчэ колькі слоў пра мерапрыемствы юбілейнага Коласавага года.

— Як і штогод, у рамках фестывалю юных музыкантаў "Сымон-музыка", які мы праводзім сумесна з аддзелам культуры Стаўбцоўскага райвыканкама, прайшло свята "Слова пра Коласа". Напярэдадні ж саміх народзін песняра пры ўдзеле сталічнай "Акадэмкнігі" і Першамайскага райвыканкама правялі свята "Колас і кніга". Пачалося яно на Коласавай сядзібе, а закончылася ў памяшканні музея. Прайшлі прэзентацыі кніг, ладзіўся канцэрт, лепшым чытальнікам уручаліся прызы. Як ніколі, шырокі размах мелі традыцыйныя "Каласавіны". У навукова-практычнай канферэнцыі прынялі ўдзел вучоныя Беларусі, Санкт-Пецярбурга, Украіны, Латвіі.

Фонды музея папоўніліся новымі экспанатамі. Адно з паступленняў звязана з малавядомай старонкай у жыцці Канстанціна Міхайлавіча. Будучы чалавекам шчодрым, спагадлівым, ён ахвотна дапамагаў многім, хто звяртаўся да яго. Аказваецца, ён некалі аплачваў вучобу мастака Лабкоўскага, аб чым паведаміла ягоная дачка і перадала нам у дар квіток паштовага пераводу.

Ладзіліся і іншыя мерапрыемствы. Праводзіліся "Літаратурныя чацвяргі", для дзяцей адбылося чарговае свята "Казкі жыцця". Ахвотна сустракаем мы і каласкоўцаў.

— Штосьці мне не даводзілася чуць пра такіх?

— Пра піянераў, акцябрат, нябось, ведаеце?

— Сёння ж яны не надта ў пашане...

— Таму мы сумесна з СШ № 68 Заводскага раёна г. Мінска праводзім прыём у каласкоўцы. Тыя, хто лепш вучыцца, і становяцца каласкоўцамі. Ім уручаем значкі, сувеніры. А яшчэ яны абавязкова сустракаюцца з Міхасём Канстанцінавічам Міцкевічам. Хачу асабліва падкрэсліць, што Міхась Канстанцінавіч сёння — наш найлепшы дарадца і без яго, бадай, не праходзіць ніводнае мерапрыемства.

Зноў жа разам з аддзелам культуры Стаўбцоўскага райвыканкама мяркуем праводзіць для дзетак традыцыйныя зімовыя сустрэчы ў Коласавай Альбуці. Сёлета адбылося тут адкрыццё мемарыяльнай сядзібы Міхала і Ганны, якую наведалі ажно дваццаць Дзедаў Марозаў са сваімі Снягуркамі.

— Чым парадуеце прыхільнікаў таленту Якуба Коласа, апроч сваіх традыцыйных мерапрыемстваў, у наступным годзе?

— Паколькі Міністэрства культуры ў сувязі з юбілеем песняра выдзеліла нам мэтавыя грошы, за што мы вельмі ўдзячныя, то рыхтуем некалькі выданняў. Не сумняваюся, што знойдзецца шмат жадаючых набыць вялікі насценны перакідны каляндар, разлічаны на два гады: на 2008-ы і 2009-ы. На ягоных старонках будуць змешчаны здымкі песняра і выявы экспазіцыі музея. Пабачыць свет і складзены мною паэтычны зборнік "Песня натхнення", у які ўвойдуць вершы, прысвечаныя Канстанцінам Міхайлавічам ягонай любай жонцы Марыі Дзмітрыеўне і іншым жанчынам. Рыхтуем таксама буклет "Мілы кут маіх дзядоў", што пазнаёміць з Коласавымі мясцінамі, а таксама набор паштовак, змест якіх можна вызначыць так: Якуб Колас і Стаўбцоўшчына.

Распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя на капітальны рамонт будынка музея і рэканструкцыю навакольнай тэрыторыі. Мяркуем, што ў тым месцы, дзе песняром пасаджаны чатыры дубы і бяроза, як сімвал ягонай сям'і (а гэта ён, як вядома, зрабіў пасля таго, як не стала ягонай жонкі, у смутку па ёй і па сыну Юрку, які загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны), устанавіць скульптурную кампазіцыю "Якуб Колас у роздуме". На лепшы варыянт яе яшчэ будзе аб'яўлены конкурс, але на выстаўцы, прысвечанай 125-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа, прыцягнула нашу ўвагу работа Аляксандра Бацвінёнка. Магчыма, менавіта яна і будзе ўвасоблена на гэтым месцы.

— Яшчэ раз з узнагародай вас, шаноўная Зінаіда Мікалаеўна! Новых і новых поспехаў вам!

Гутарыў
Алесь МАРЦІНОВІЧ

Часопісы прапануюць:

«Полымя» № 2

У 1985 годзе ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла кніга Міколы Калінковіча "Палескія дні Аляксандра Блока", яна займела шырокі розгалас, знайшла свайго чытача.

У творчай спадчыне пісьменніка і краязнаўцы застаўся нявыдадзены рукапіс "Ніколі, браткі, не забуду..." — нарыс жыцця і творчасці вядомага заходнебеларускага публіцыста і літаратурнага крытыка Уладзіміра Самойлы, урывак з якога будзе змешчаны ў № 2 часопіса "Полымя".

Чаму выбар даследчыка выпаў на Самойлу? Відаць, адказ — у самім лёсе Уладзіміра Іванавіча. Роля Самойлы ў садзейнічанні дэбюту Янкі Купалы ў друку з вершам "Мужык" у мінскай газеце "Северо-Западный край" (15 мая 1905 года) і выхадзе яго першага зборніка "Жалейка" неацэнная. Усяго на чатыры гады старэйшы за Янку Купалу, ён адзін з першых выказаў спадзяванне на веліч і адметнасць яго таленту. У жніўні 1908 года, услед за выхадам "Жалейкі", адразу ў дзвюх газетах — "Минском курьере" і "Нашай ніве" — з'яўляюцца публікацыі Самойлы пра першую кнігу будучага класіка. Рэцэнзент пісаў з нагоды выхаду "Жалейкі": "На вуліцы маладой Беларусі свята! Сонца жывой сапраўднай паэзіі заглянула ў аконца цёмнай, беднай, але вялікай хаты беларускага народа".

«Маладосць» № 2

У свой час было шмат водгукаў на дзённікавую аповесць-паэму Віктара Шніпа "Першы папяровы снег". У рэдакцыю "Маладосці", дзе друкаваўся твор, і тэлефанавалі, і прысылалі лісты шматлікія чытачы. Мяркуем, што гэткі ж рэзананс выкліча і новая аповесць-паэма вядомага пісьменніка "Лісты і залатое лісце", якая друкуецца ў другім нумары "Маладосці".

Акрамя гэтай аповесці-паэмы Віктара Шніпа ў гэтым жа нумары "Маладосці" чытач знойдзе адметнае апавяданне Андрэя Федарэнкі "У лесе", а таксама нізку вершаў маладых бардаў з уступным словам Алеся Камоцкага.

Друкуецца і працяг краязнаўчага даведніка "Літаратурныя мясціны Беларусі Адама Мальдзіса, Лідзіі Кулажанкі і Святланы Сачанкі. Увазе чытачоў прапануюцца тры раёны Берасцейшчыны: Пінскі, Пружанскі і Столінскі.

«Нёман» № 2

Пад рубрыкай "Запіскі. Успаміны. Дакументы" ў другім нумары часопіса "Нёман" будуць апублікаваны ўспаміны ваеннага пісьменніка Анатоля Сульянава "Васіль Быкаў. Камбат. Пісьменнік. Сябар", дзе ён распавядае пра творчыя сустрэчы і добрыя сяброўскія адносіны з народным пісьменнікам, аўтарам шырокавядомых не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі аповесцей "Мёртвым не баліць","Сотнікаў", "Круглянскі мост" і інш.

Аўтар згадвае таксама пра цёплыя сустрэчы Васіля Быкава з Мікалаем Матукоўскім, Генадзем Бураўкіным, Валянцінам Блакітам, Нілам Гілевічам, былым сакратаром ЦК КПБ Аляксандрам Кузьміным, народнымі пісьменнікамі Андрэем Макаёнкам, Іванам Шамякіным, Іванам Чыгрынавым, аб творчых паездках на Кубу, у Францыю.

У сваіх успамінах Анатоль Сульянаў звяртаецца да таго часу жыцця выдатнага беларускага пісьменніка, калі яны неаднойчы сустракаліся з вайскоўцамі ў воінскіх часцях, прыглядваліся адзін да аднаго, калі нараджалася іх доўгае, бескарыслівае, сапраўднае мужчынскае сяброўства.

«Всемирная литература» № 2

Аматары прыгожага пісьменства, калі падпішуцца на другі нумар часопіса "Всемирная литература", змогуць прачытаць раман амерыканскага пісьменніка Алівера Ла Фаржа "Смяюнчык". Твор атрымаў Пулітцэраўскую прэмію яшчэ ў 1929 г, але да гэтага часу заставаўся невядомым у нас. Гэта трагедыя кахання белай дзяўчыны да індзейскага юнака, напісаная з цудоўным веданнем побыту племені наваха, поўная яскравых этнаграфічных падрабязнасцей і сацыяльна-канфліктных калізій.

Незадоўга да смерці ў 1993 г. вялікі італьянец Федэрыка Феліні падзяліўся з крытыкам і журналістам Рытай Чырыё думкамі пра кіно і творчасць, раскрыў некаторыя сакрэты майстэрства, прызнаўся ў тых ці іншых сакрэтах уласнага жыцця. Гэтыя інтэрв'ю склалі унікальную кнігу. Цяпер можна пазнаёміцца з унутраным светам майстра, даведацца пра многія малавядомыя ўзаемаадносіны славутых італьянскіх акцёраў і рэжысёраў.

У другім нумары часопіса таксама прадстаўлена літаратура Закаўказзя. Ужо ў назвах апавяданняў вядомага грузінскага празаіка Міха Масулашвілі прачытваецца намёк на інтрыгу — "Стары рыбак", "Не прападзе певень", "Глушэча", "Цуда лясное забіць вясною". Армянскую літаратура прадстаўляе востраскужэтная аповесць Гургена Ханджана "Забіць Ратавацеля", азербайджанскую — апавяданні Кяміля Афсараглы "Сляпыя гледачы" і "Спрэчка".

Сярод іншых матэрыялаў нумара — цыкл выдатных натурных замалёвак нашага сучайчынніка Алеся Турановіча, які жыве ў г. Кройцберг (Германія). Ён уражвае кароткай і надзвычай экспрэсіўнай формай выкладання. Сціслыя фразы даюць жывы малюнак сучаснага заходняга горада, адлюстроўваюць лад жыцця, узровень культуры і праблемы ягоных абывацеляў.

Ураджэнцам Барысава не быў, але Барысаўшчыну праславіў

Памешчык Іван Хрысанфавіч Каладзееў (1859 — 1914 гг.) набыў пашану, павагу і прызнанне як нястомны калекцыянер, захоплены бібліяфіл, мецэнат еўрапейскага ўзроўню.

Будучы збіральнік нарадзіўся ў спадчыннай дваранскай сям'і. Бацька, генерал-лейтэнант Хрысанф Іванавіч Каладзееў (1817 — 1876 гг.), у час Крымскай вайны палкоўнікам узначальваў Азоўскі пяхотны полк, удзельнічаў у гераічнай абароне Севастопаля. У 1865 годзе атрымаў прызначэнне часовым ваенным начальнікам Барысаўскага павета Мінскай губерні. Недзе ў першай палове 70-х гадоў XIX стагоддзя імператар Аляксандр II падараваў Каладзееву 7 тыс. дзесяцін зямлі, раскінутых на паўднёвы ўсход ад Барысава, наўкол вёсак Упірэвічы і Краснае.

...Каладзееў малодшы адтрымаў спадчыну бацькі ў 18-гадовым узросце. Вялікія зямельныя ўладанні падштурхнулі юнака да выбару прафесіі агранома. У сярэдзіне 80-х гадоў, бліскуча абараніўшы дыплом вучонага-агранома ў прэстыжнай акадэміі германскага горада Праскаў, Іван Хрысанфавіч вяртаецца ў новабарысаўскі маёнтак, пабудованы бацькам за год да канчыны ў маляўнічым месцы на правым беразе Бярэзіны.

З імем Каладзеева звязана з'яўленне першых ў Новабарысаўскім пасадзе цагляных двухпавярховых будынкаў (драгунскіх казарм) і першай тэлефоннай станцыі, ён не раз выступаў сузаснавальнікам і акцыянерам прадпрыемстваў горада. Пабудаваныя пры ім шкляны завод, дрэваапрацоўчы камбінат, папяровая і запалкавая фабрыкі існуюць у Барысаве і цяпер.

Як і большасць адукаваных людзей свайго часу, Каладзееў актыўна займаўся даследчай і грамадскай дзейнасцю. Зацікавіўшыся праблемай адзінага воднага шляху паміж Балтыйскім і Чорным марамі, удзельнічаў у экспедыцыі па вывучэнні Бярэзінскай воднай сістэмы, выконваў абавязкі пачэснага міравога суддзі пры Барысаўскім павятовым сходзе, з'яўляўся земскім гласным у павятовым камітэце па справах земскай гаспадаркі, членам гарадскога камітэта апекі народнай цвярозасці і інш. Аднак знакамітым ён стаў дзякуючы сабранай ім багацейшай бібліятэцы па падзеях 1812 года.

Упершыню пра "Нова-Барысаўскі збор кніг, рукапісаў, гравюр, планаў і карт памешчыка Мінскай губерні, Івана Хрысанфавіча Каладзеева" гучна загаварылі на мяжы XIX — XX стагоддзя. Але шырокая вядомасць да Каладзеева прыйшла пасля азнаямлення з яго каллекцыяй сяброў пецярбургскага "Таварыства прыхільнікаў ваенных ведаў", удзельнікаў першай (1903) і другой (1904) ваенна-гістарычных паездак па мясцінах баёў на Бярэзіне. Адзін з удзельнікаў паездкі вядомы гісторык Канстанцін Ваенскі надрукаваў у аўтарытэтным часопісе "Военный сборник" "кароткі" пералік збору, дадаўшы, што ў "гэты час бібліятэка І. Каладзеева, як сховішча, прысвечанае выключна адной эпосе, з'яўляецца, несумненна, першым зборам не толькі ў Расіі, але і ў Еўропе". Няцяжка здагадацца, што пасля такой "рэкламы" ў Новабарысаў пачынаецца сапраўднае паломніцтва даследчыкаў. У той збор увайшлі, "не лічыўшы вялікай калекцыі гравюр, карт, планаў, чарцяжоў і малюнкаў, адных кніг на рускай і іншаземных мовах — больш як 5000 назваў, склаўшы ў агульнай колькасці каля 15000 тамоў".

Бібліятэка Каладзеева ўмоўна падзялялася на дзве часткі: літаратурна-мастацкую (меншая) і перыяду напалеонаўскіх войн (значна большая) з рускім і іншаземным аддзеламі. Акрамя "класічных твораў" у рускім аддзеле знаходзілася "амаль усё, што да апошняга часу было выдадзена на рускай мове пра 1812 год". А гэта, "не лічыўшы газет, часопісаў, лісткоў, брашур і газетных артыкулаў", каля двух тысяч найменняў! Замежны збор, ў сваю чаргу, падзяляўся на шэраг раздзелаў: "І аддзел французскі, II аддзел нямецкі, III аддзел польскі, IV аддзел англійскі. Аддзел V: творы, якія датычацца 1812 года, напісаныя на галандскай, шведскай, іспанскай, італьянскай і інш. мовах. Аддзел VI: рукапісы, карты, планы, гравюры, партрэты і г.д.".

На кароткі пералік рарытэтаў кожнага з аддзелаў спатрэбіцца не адна старонка. Прыпынімся на сапраўды рэдкіх і унікальных: падрабязная стэнаграфічная справаздача пасяджэння парыжскага суда ў красавіку 1812 года, "па дзелу аб продажы чыноўнікамі французскага ваеннага міністэрства палкоўніку А. І. Чарнышову мабілізацыйных планаў і іншых сакрэтных звестак аб стане французскай арміі напрыканцы 1811 года". Або трафейная, намаляваная для Напалеона ад рукі карта, па якой імператар ішоў на Маскву. Шыкоўнае выданне з ілюстрацыямі нямецкага мастака Фабера-дю-Фора, які пісаў з натуры пейзажы, сцэны паходнага жыцця і эпізоды боек. У 1903 годзе такое ж выданне, але "не поўнае і без тэксту", ацэньвалася ў 1250 французскіх франкаў — у палову кошту аўтамабіля!

Укладаннем збору займаўся спецыяльна наняты бібліятэкар. Барысаўскі збіральнік "з поўнай гатоўнасцю і рэдкай прыязнасцю прадастаўляў свой збор усім жадаючым займацца па гісторыі 1812 года", як напіша даследчык Васіль Краснянскі, аўтар кнігі "Г. Борисов и Борисовский уезд в Отечественной войне 1812 года" (1914), які не раз карыстаўся паслугамі Каладзеева. Копіі матэрыялаў (эстампы) з яго калекцыі выкарыстоўваліся пры стварэнні ў 1902 годзе экспазіцыі музея на станцыі Барадзіно.

Сам Іван Хрысанфавіч аналізаваў мемуары і ўспаміны ўдзельнікаў кампаніі. Ён знайшоў рэшткі мастоў напалеонаўскай пераправы і на свае сродкі паставіў першыя на Барысаўшчыне помнікі, зробленыя па эскізах карнета 50-га Іркуцкага драгунскага палка, мастака-аматара, сябра Мікалая Зарэцкага. Святочнае адкрыццё двух помнікаў-абеліскаў адбылося 14(26) лістапада 1901 года.

У 1907 годзе Каладзееў увайшоў у лік апекуноў Рускага ваенна-гістарычнага таварыства, меў пачэснае членства ў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, ўваходзіў у склад Асобага камітэта па стварэнні ў Маскве музея 1812 года, які планавалася адкрыць да 1912 г. Ужо тады Іван Хрысанфавіч вырашыў ахвяраваць бібліятэку будучаму музею. Плённая дзейнасць барысаўчаніна не засталася без увагі ў вярхах. Напярэдадні 100-годдзя перамогі ў вайне за заслугі перад Айчынай імператар Мікалай II даруе статскаму саветніку Івану Хрысанфавічу Каладзееву прыдворны чын камергера найвышэйшага двара.

...Між тым з-за фінансавых праблем запланаванае адкрыццё музея не адбылося. Гэта не супыняе высакародных памкненняў Каладзева, і ў 1913 годзе звыш 11 тыс. тамоў са сваёй бібліятэкі мецэнат ахвяруе ў Маскву. 15 (27) мая таго ж года Іван Хрысанфавіч з жонкай прысутнічае на цырымоніі адкрыцця помніка егерам рускай арміі, загінуўшым у лістападзе 1812 года на берагах Бярэзіны. Ці мог ён, ужо цяжкахворы, прапусціць такую выключную падзею, стаўшы адным з фундатараў гранітнага абеліска на Брылеўскім полі?! А на чарзе наступны грандыёзны праект помніка, на гэты раз у Барысаве.

Але праз год пасля ліпеньскі нумар гісторыка-літаратурнага часопіса "Исторический вестник" з глыбокім жалем паведаміў, што "19-га мая ў Навабарысаве, пасля працяглай і цяжкай хваробы памёр адзін з рускіх дзеячаў у Паўднёва-Заходнім краі, камергер Іван Хрысанфавіч Каладзееў, акрамя сваёй грамадскай дзейнасці вядомы ў шырокіх колах, як прыхільнік і выдатны знаўца Айчыннай вайны, уладальнік буйной вялізнай бібліятэкі, прысвечанай 1812 году..."

Праз два з паловай месяцы пачалася Першая сусветная вайна. Спадчыннікаў Каладзеевы не мелі, таму лёс экспанатаў быў прадвырашаны. У 1915 годзе ўдава збіральніка, Вольга Сяргееўна, падаравала Дзяржаўнаму гістарычнаму музею Масквы больш як 3 тыс. рукапісных і выяўленчых матэрыялаў, даведачную літаратуру і асабісты архіў. Пасля рэвалюцыі 17-га года "Бібліятэка імя І. Х. Каладзеева" "разбеглася" па розных зборах, нешта патрапіла і ў Дзяржаўную бібліятэку БССР, куды ў 1926-м прыйшло 8 тыс. кніг. Несумненна, што частка з іх захоўваецца ў "нацыяналцы" да гэтага часу, але кнігі не маюць асабістага экслібрыса, таму пытанне аб іх прыналежнасці спрэчнае. За выключэннем букіністычных рарытэтаў з дарчымі надпісамі. Паводле слоў загадчыцы аддзела выяўленчых матэрыялаў маскоўскага ДГіМа Алены Іткінай, на сённяшні дзень калекцыя Каладзеева запатрабавана, да яе часта звяртаюцца даследчыкі з вялікай пашанай да памяці Івана Хрысанфавіча. Дарэчы — сапраўднага патрыёта беларускага краю.

Аляксандр БАЛЯБІН,
гісторык, супрацоўнік
залы беларусікі
і краязнаўства ЦСПБ
г. Барысава

На здымку: на адкрыцці двух помнікаў-абеліскаў у в. Студзёнка 14 (26) лістапада 1901 года. У цэнтры паміж вайскоўцамі — І. Х. Каладзееў.

Гістарычная майстэрня

Па адной з версій назва горада Капыль паходзіць ад слова "капыла" — драўляная форма, на якую нацягваюць скуру пры вырабе абутку. Горад здаўна славіўся сваёй гарбарнай вытворчасцю. У гарбарні калісьці працаваў і вядомы ўраджэнец Капыля, пісьменнік, грамадскі дзеяч Цішка Гартны. Сёння тут, у будынку былой майстэрні, знаходзіцца краязнаўчы музей, а каля яго ўвахода — адзіны ў Беларусі помнік Цішку Гартнаму. Экспазіцыя музея змяшчае унікальныя археалагічныя знаходкі, кожная з якіх пацвярджае вядомыя ці нават даказвае новыя, раней не адкрытыя факты з гісторыі горада.

Менавіта гэтую майстэрню, дзе яго вачам не хапала сонечнага святла, а лёгкім свежага паветра, так змрочна апісваў у сваіх дзённіках Цішка Гартны. Ён пачаў працаваць тут у 1905 годзе (па іншых звестках — у студзені 1906-га). Недалёка ад гарбарні, літаральна ў трохсот метрах, на вуліцы, якая сёння носіць імя пісьменніка, быў дом, дзе ён нарадзіўся. Цяпер на гэтым месцы іншы будынак, і толькі мемарыяльная дошка нагадвае, што тут калісьці стаяла родная хата Зміцера Жылуновіча.

Памяшканні былой гарбарні былі аддадзены пад краязнаўчы музей у 2000 годзе, пасля капітальнага рамонту. Тады ж устанавілі і помнік, які зрабіў мясцовы скульптар Уладзімір Бандарэнка. "Камень для гэтага магутнага партрэта набылі ўдзячныя землякі за грошы, зароблены на суботніках, — распавяла дырэктар Капыльскага краязнаўчага раённага музея Валянціна Шуракова. — Мы не называем яго помнікам, бо гэта гучала б надта пампезна. Тым больш, не было ніякіх афіцыйных праектаў, зацвярджанняў на саветах. Мы хацелі зрабіць усё як мага хутчэй, баяліся, што справа зацягнецца".

Супрацоўнікі музея вымушаны былі знайсці спосаб, каб стварыць цікавую і добра аформленую экспазіцыю за мінімальныя грошы і ў самы кароткі тэрмін. Задача паўстала няпростая. "Наш музей першы ў рэспубліцы атрымаў грант Прэзідэнта на пабудову экспазіцыі. Нам далі пяць мільёнаў (на той час — прыкладна тры тысячы долараў). Я лічыла сябе самым багатым чалавекам, бо думала, што на гэтыя грошы можна зрабіць усё! Але калі сутыкнулася з працай прафесійных мастакоў, то зразумела, што столькі будзе каштаваць толькі адно пано. На шчасце, мы знайшлі дызайнераў, якія згадзіліся зрабіць афармленне амаль бясплатна. Усю экспазіцыю абсталявалі за восем дзён", — адзначыла В. Шуракова.

Асноўныя экспанаты музея — старажытныя рэчы, знойдзеныя падчас археалагічных раскопак, якія штогод праводзяцца ў Капылі студэнтамі і навукоўцамі. Тут захоўваюцца і адзіныя ў Беларусі знаходкі — напрыклад, пчаліныя соты XI стагоддзя ці хірургічны нож, датаваны XII стагоддзем. Гэтыя унікальныя рэчы маглі б упрыгожыць экспазіцыю многіх асноўных музеяў Беларусі, але капыльчане моцна трымаюць скарбы сваёй зямлі. Па існуючай дамове Нацыянальнай акадэміі навук і Капыльскага райвыканкама ўсе рэчы, знойдзеныя на гэтай тэрыторыі, павінны застацца ў капыльскім музеі. Сёння ў фондзе захоўваецца каля трох тысяч экспанатаў, што даволі шмат для раённага цэнтра.

"Я вельмі ганаруся, што ў гэтай экспазіцыі няма ніводнага муляжа. Усе рэчы знойдзены на нашай зямлі. Мы імкнуліся дэтальна адлюстраваць гісторыю толькі нашых мясцін, а не ўсёй Беларусі ўвогуле," — адзначае дырэктар музея.

Экскурсія па музеі — гэта сапраўды добрая магчымасць для капыльчан у сціслай і навукова абгрунтаванай форме даведацца пра ўсе асноўныя падзеі з мінулага роднага краю. Напрыклад, фрагменты старажытных амфар — доказ таго, што рака Каменка, якая цяпер уяўляе сабой маленькі ручай, што можна лёгка пераісці ўброд, раней была вялікай і шумнай, па ёй хадзілі судны і дастаўлялі сюды віно ды іншыя тавары.

На тэрыторыі горада захавалася вельмі шмат курганоў. Дзякуючы раскопкам даказалі, што Капыль заснаваны не ў 1274 годзе, як дагэтуль лічылася, а як мінімум на 200 гадоў раней. Бо знойдзеныя астанкі сведчаць, што ў тыя часы яшчэ трупы спальвалі, а значыць, пахаванне было зроблена ў часы паганства, да прыняцця хрысціянства. "Пакуль гэта вядома толькі на ўзроўні археалагічных знаходак, але было б добра, калі б звесткі пра ўзрост нашага горада былі не толькі практычна, але і тэарэтычна абгрунтаваныя, замацаваныя ў навуковых працах, даследаваннях, тады мы маглі б ўжо святкаваць тысячагоддзе Капыля", — лічыць В. Шуракова.

Другая зала музея — вандроўка ў мястэчка канца XIX стагоддзя. Па фотаздымках і дакументах супрацоўнікі імкнуліся ў межах пакоя ўзнавіць тагачасную вуліцу. Тут і лаўка гандляра, дзе прадстаўленыя рэчы, якія маглі там прадавацца, і сялянскі базар, і банк, і лаўка для шараговага насельніцтва. Таксама адлюстраваны побыт таго часу. "У гэтай зале мы адыходзім ад прынцыпу, што ўсе экспанаты павінны быць за шклом. Я думаю, што дзяцей трэба далучаць да гэтых ведаў, дазваляючы ім разглядаць рэчы зблізку, кранаць іх", — дадае дырэктар В. Шуракова.

У Капыльскім раённым краязнаўчым музеі гісторыя сапраўды ўспрымаецца як захапляльны кінафільм, жывы аповед. Гэта гаворыць пра багацце гэтай самай гісторыі, яе таямнічасць. Але менавіта эмацыянальнасць, неабыякавасць супрацоўнікаў абуджаюць цікавасць да яе. А ці ведаць сучаснікам гісторыю роднага краю, ці імкнуцца да яго даўніны, тут ужо кожны сам вырашае для сябе, кожны мерае на свой капыл.

Саша ДОРСКАЯ

Эцюды гатычных таямніц Марыі Цітарчук

Наколькі паэзія — няволя, наколькі — ахвяра, наколькі — fatum, настолькі — і свабода. Свабода паэтычнага слова — радка — верша — імгнення... І свабода выбару блізкіх мне паэтычных імёнаў... Зусім нядаўна ў абсягі маёй уласнай паэтычнай прасторы — маёй свабоды — увайшло яшчэ адно імя — Марыя Цітарчук. Летам 2007 года ў Гродзенскай друкарні маладая гарадзенская паэтка выдала зборнік вершаў і апавяданняў "Вераснёўскія мроі".

Марыя Цітарчук выбрала восень, а яшчэ дакладней — верасень як самую паэтычную і любімую сваю пару. Назва кнігі цалкам сябе апраўдвае, таму што ўся яна — мроя, летуценне, музыка і тайна... Марыя ўмее пісаць не толькі на паперы, але і на "жоўтым пялёстку ляснога гарлачыка" і на "каляровым кляновым лісці". У апавяданні "Сіні крышталь, жоўтая квецень" яна прызнаецца: "...я пішу да вас бурштынавым тайнапісам верасня, які падыходзіць да канца. Пялёсткі рана ці позна звянуць, але напісанае застанецца ў сэрцы."

"Бурштынавы тайнапіс верасня" — гэта яе паэтычны і празаічны стыль. "Пялёсткі рана ці позна звянуць, але напісанае застанецца ў сэрцы," — гэта яе літаратурнае крэда. Нягледзячы на сваю маладосць, Марыя мае, як паказвае яе першая кніга, строга акрэсленыя жыццёвыя прынцыпы і сваю творчую адметнасць.

Кніга "Вераснёўскія мроі" складаецца з некалькіх паэтычных раздзелаў і празаічнага "Вераснёўскія мроі", які і даў назву ўсёй кнізе. Адразу скажу, што вызначэнне празаічны — гэта ўмоўнасць: там болей паэзіі, чым прозы. Усе творы раздзела названы апавяданнямі, але гэта хутчэй — эцюды і эсэ, "Я падару табе вясну" можна абазначыць як навелу.

Лірычная гераіня Марыі Цітарчук — маладая рамантычная наша сучасніца (як бы ў піку прагматычнаму нашаму часу) і адначасова — вольналюбівая і гордая ліцвінка. Яе час — Сярэднявечча і Рэнесанс, час росквіту і вяршыні Вялікага княства Літоўскага. Яе стыхія — гісторыя і музыка, воля і прыгажосць. Гэта рэаліі і гэта сімвалы. Таму Марыя піша іх з вялікай літары: Прыгажосць, Шчырая Прыгажосць, Боль, Каханне і г.д. Хоць сама лірычная гераіня ў вершы "Сімвал" сваімі сімваламі называе Месяц і Палын:

Дзе дым стагоддзяў
разальецца —
Адвечны цяжкі напамін,
У танцы Смутку
там саўецца
Мой сімвал —
Месяц і Палын.

Чаму ў такім юным узросце — Месяц і Палын? Думаецца, што Месяц — як вышыня, святло і тайна, Палын — як горыч, як мера глыбіні спасціжэння жыцця. Паэтычны раздзел "Ветразь гісторыі" выяўляе не проста схільнасць аўтара да гэтай музы, але глыбокае пранікненне ў яе схаваныя часам шаты, своеасаблівую палянёнасць яе вялікасцю гісторыяй. "Я назаўсёды паланёна Пячаткаю забытых спраў," — прызнаецца яна ў вершы "Дзве ружы". Гародня дарагая ёй як "калыска шляхцянскіх часоў", менавіта сваёй даўніной. У яе вершах "дзейнічаюць" дзве ракі — Рэйн і Нёман. Яны ў нечым з'яўляюцца вызначальнымі напрамкамі паэзіі М. Цітарчук: Рэйн як летуценне — рамантыка і Нёман як рэалія, часцей за ўсё пад сваёй старажытнай назвай Кронан — гісторыя. Лірычная гераіня адчувае сябе і гарадзенскай князёўнай, і шляхцянкай, якая ідзе з рыцарам "па краю казачным і светлым". Яна — гаспадыня часу, нягледзячы на яго хуткаплыннасць і незваротнасць:

Я расчыню плячыма дзверы,
Як браму ў прыцемак часоў.
Убачу строгі твар Валеры,
Пазнаю позірк Кастусёў.

Туга па мінулым ("Туга"), боль за мінулае ("Меч Гедыміна"), шкадаванне, што мінуў час "Літвы Крывіцкай", — гэта, не раўнуючы, як плач Яраслаўны. Праўда, Яраслаўна плакала з іншай нагоды (хоць яны, гэтыя нагоды, вельмі блізкія па духу) і "в Путивль на забралъ", а лірычная гераіня М. Цітарчук — у Гародні на Замкавай гары... Можа таму з такім даверам і разуменнем успрымаюцца яе радкі: "Карэннем ў родную зямлю ўрасла на Замкавым гарышчы..."

Паэзія Марыі Цітарчук — гэта сплаў рамантыкі і дэкадансу, англійскага спліну і юначай радасці, мары і расчаравання, слова і музыкі... Яе паэзіяй валодаюць тайна і гук, нездарма, як падаецца, любімымі словамі паэткі з'яўляюцца "тайнапіс" і "гукапіс"... І ўсё ж, калі б прыйшлося абазначыць літаратурны напрамак яе творчасці, гэта была б — готыка. Хоць тэрмін хутчэй архітэктурны. "Дыхае капрызнай архідэяй Гатычны лёгкі гукапіс"... Готыка — таму што яе вершы, пачуцці, душа ўзнесены ў вышыню, у чысціню, у Неба, у надзею... У тайну: "Шчасце п'юць, як абсэнт, калі прагнуць карункава выганчанай, містычнай, шчымлівай трагічнай таямніцы готыкі. Готыка — прыгожая, але хрусткая, для недасвечаных цацка. Схавай жа яе асцярожна ў белым рукаве, меланхолік П'еро, і пакажы толькі сваёй Мальвіне як цуд!" ("Шчасце п'юць, як абсэнт"). А гэта ўжо — амаль што літаратурны маніфест.

Любімыя паэты Марыі — Максім Багдановіч і Генрых Гейнэ. Гэта адчуваецца адразу з першых наўгад прачытаных радкоў. І не таму, што ў вершах Марыі нейкае перайманне, але ёсць падабенства ва ўспрыманні і адчуванні свету. У кнізе М. Цітарчук арганічна жывуць багдановічаўскія матывы суму, адзіноты ("Ціхі вечар", "Пустэча", "Пах тугі" і інш.) і матывы Г. Гейнэ — радасці, вясны, абнаўлення ("Вясновая песня", "Вясёлка" і інш.). Добрае веданне нямецкай літаратуры, прынамсі. — нямецкіх рамантыкаў, выклікае ў яе неабходнасць (я бачу ў гэтым менавіта неабходнасць, а не паэтычны капрыз) даць вершам другі загаловак на нямецкай мове.

Многія вершы Марыі вылучаюцца сапраўдным майстэрствам ("Пальновы пярсцёнак", "Цалуйце Мальвіну", "Сустрэча" і інш.). У яе вершах ёсць і вобразнасць, і дакладнасць, і нават нейкая суровасць, строгасць у выбары паэтычных сродкаў:

Зіма ўбор свой апранае,
Здаецца блізкай вышыня...
Хадзі сюды. Нас не пазнае
Алеяў белых цішыня.
("Сустрэча")

Вядома, не ўсё так ухвальна, роўна і гладка (ды і так не бывае!): побач з вершам "Усход", які склаў бы гонар далёка не маладому паэту, прайграе крыху дыдактычны верш "Сучаснасць".

Здзіўляе глыбокае і ранняе спасціжэнне жыцця аўтарам, тонкае разуменне чалавечай душы, якія яскрава выявіліся не толькі ў вершах, а можа, найболей — у празаічным раздзеле кнігі: "Калі ў сэрцы няма спакою, у ім не будзе дабрыні" ("Рабінавае варэнне"), "На празрыстым твары Максіма разліўся ўнутраны свет" ("Я падару табе вясну")... Здзіўляе разуменне аўтарам жыцця як ахвяры ў імя жыцця другога чалавека.

Дух Максімаў, вобраз Максімаў лунаюць у кнізе, а можа, лепш — над кнігай М. Цітарчук. Максім-мастак — таксама хворы на сухоты... Але навела "Я падару табе вясну" — не адзіная паралель. Не адзінае прысвячэнне. Ці — асвячэнне Максіма? Ці нават — асвячэнне Максімам? Менавіта да яго звернута размова-разважанне "Рабінавае варэнне".

..."Ані сяброўства. Ні кахання. У сэрцы горыч прарасце." Шлях паэта заўсёды — адзінота і горыч... Я б сказала Марыі: пераступі на іншы — на звычайны, на зямны, дзе ёсць сяброўства і каханне, дзе поўная адсутнасць сімвалаў Месяц і Палын... Але не скажу. Бо яна — паэтка.

Ала НІКІПОРЧЫК

«Сведчым пра сваю адметнасць»

Так называецца адзін з раздзелаў-акцэнтаў у кнізе Дзмітрыя Гулецкага "Манеты беларускай даўніны", якую сёлета выдавецтва "Беларусь" выпусціла ў свет. Кніга адрасаваная не толькі навукоўцам і аматарам нумізматыкі, але і ўсім, каму цікавыя айчынныя старажытнасці.

Выданне распавядае пра гісторыю грашовага абароту на нашых землях дарасійскага перыяду. Аўтар у кожным з дзесяці раздзелаў акцэнтуе чытацкую ўвагу на тых ці іншых эпохах і адпаведных ім манетах: "ізроях", "рублях", "грашах", "пенязях", "шэлегах", "талерах" і г. д. Якасныя выявы названых наміналаў у мастацка-камп'ютэрнай апрацоўцы ўпрыгожваюць выданне.

У захапляльнай і нязмушанай манеры выкладаць факты Дз. Гулецкі распавядае, што манеты ў нас хадзілі яшчэ з антычных часоў. За доўгія стагоддзі іх шмат перабыло, паходжаннем як з Захаду, так і з Усходу, пакуль нарэшце нашыя продкі не пачалі карыстацца ўласнымі грашыма — так званым, віцебскім "ізроем". Апошнія з'явіліся ў XII ст. у выглядзе пруткоў, а іх назва, верагодна, паходзіць ад стараслав'янскага "изрыть", бо па тэхналогіі вытворчасці грошы адліваліся ў формах, зробленых з зямлі. З фарміраваннем і развіццём старажытнабеларускай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага — у другой палове XIV ст. узнікаюць першыя дробныя манеты з надпісамі на старабеларускай мове. Адначасова набывае папулярнасць другі тып срэбнай грыўні — літоўскі рубель.

Каля 1392 года Вітаўт атрымлівае тытул Вялікага князя і змяняе тып манет. Першыя манеты княжання Вітаўта, якія выразаліся з ліставога серабра — пенязі, насамрэч сталі масавай агульнадзяржаўнай манетай свайго часу. На адным з бакоў манеты князь змяшчае свой асабісты герб — "Калюмны", а на другім — наверша дзіды з крыжам. Наступную вялікую групу вялікакняскіх манет часоў Вітаўта складаюць пенязі, дзе замест дзіды і крыжа выбіваецца знакаміты беларуска-літоўскі вершнік — "Пагоня". Цікава, што ў тыя часы асноўны манетны двор месціўся ў сталіцы княства — Вільні, дзе білі свае манеты Вялікі князь Вітаўт і яго стрыечны брат — будучы кароль Польшчы Ягайла. Дакладна вызначана, што апроч іх свае манеты пускалі ў абарот і іншыя ўдзельныя князі. Гэта Уладзімір і Скіргайла Кіеўскія, Дзмітры Ноўгарад-Северскі, Юрый Святаслававіч Смаленскі, Касцянцін і Тодар Падольскія і іншыя князі.

Напрыканцы XV ст. манеты княства набліжаюцца дызайнам да заходнееўрапейскіх і змяшчаюць лацінскія надпісы. Тым не менш адметная вялікалітоўская грашовая сістэма працягвала сваё існаванне і была скасавана толькі ў часы Сцяпана Батуры, калі адбылася поўная уніфікацыя грашовых сістэм у Рэчы Паспалітай — дзяржаве двух народаў. Так скончылася амаль двухсотгадовая гісторыя выключна нашай уласнай грашовай сістэмы. Праўда, манеты Вялікага княства Літоўскага працягвалі выбірацца з перапынкамі ажно да пачатку XVIII ст., калі апошняя з іх — шастак Аўгуста II — была ўведзена ва ўжытак у 1706 годзе. Але паступовая страта незалежнасці старажытнабеларускай дзяржавы, якая асабліва яскрава выявілася ў канцы XVII ст., калі справаводства на нашых землях было гвалтам пераведзена з беларускай мовы на польскую і страчваўся механізм кіравання дзяржавай, паўплывала на заняпад манетнай справы княства.

І хаця кніга "Манеты беларускай даўніны" заканчваецца на гэтай сумнай ноце і не сягае ў час сённяшні ды заўтрашні, варта не забываць, што ўсе негатыўныя з'явы беларускага мінулага — спусташальныя войны, рознага кшталту пошасці і галадаморы, страта незалежнасці... — дазволілі нам сёння азірнуцца назад і ўбачыць сваю мінуўшчыну ў яе матэрыяльным увасабленні. Невялікі кавалак старадаўняга біцца — срэбная, зрэдку залатая, а найчасцей медная манета нашых прашчураў расказвае нам пра тое, чым калісьці жылі беларусы-крывічы або беларусы-ліцвіны. Грошы знаходзіліся ў абароце, пераходзілі з рук у рукі, сплывалі за мяжу, дзе пераплаўляліся ў чужыя наміналы. Дык як жа апынуліся ў сённяшніх дні ў руках нашых навукоўцаў такія манеты, спытаеце вы. Як ні парадаксальна гэта гучыць, менавіта "дзякуючы" перыядам ліхалецця, калі свае бясцэнныя скарбы небаракі-гаспадары вымушаны былі хаваць падалей ад варожых вачэй, а потым, спяшаючыся, знянацку пакідалі радзіму і пры гэтым не паспявалі паведаміць пра каштоўнасці спадкаемцам, гінулі. Таму ні дзіва, што розныя скарбы, знойдзеныя ад Беласточчыны да Уладзіміршчыны ў сучаснай Расіі, на тэрыторыі нашага Вялікага княства дажылі да цяперашняга часу і працягваюць цвяліць гістарычную памяць сучаснікам, дарыць ім хвіліны радасці адчування повязі з мінулым. Несумненна, нумізматыка адыгрывае не толькі дапаможную і гістарычную, але выхаваўчую і патрыятычную ролю, і ў гэтым яе неаспрэчная важнасць.

Ірына КЛІМКОВІЧ

Вяртанне да каранёў

Сёння мы ўсё больш і больш звяртаемся да сваёй мінуўшчыны, каб зразумець сучаснасць і будучыню, сваю прадвызначанасць у ёй. Нашы продкі пакінулі нам у спадчыну багаты і невычэрпны духоўны скарб: легенды і паданні, балады і песні, чарадзейныя гісторыі і казкі. Як толькі маленькі чалавек пачынае ўсведамляць сябе асобай, ягоная душа патрабуе фантастычнага і чароўнага. Па паводзінах казачных герояў, па іх стаўленні да радзімы і іншых людзей ён вучыцца асэнсоўваць жыццё, знаходзіць яго патаемную логіку.

Сучасным маленькім чытачам і ўсім тым, хто выхоўвае іх, адрасуецца зборнік казак і вершаў "Змяіны Кароль" пісьменніцы Святланы Клімковіч. Кнігу выпусціла выдавецтва "Пачатковая школа", якое апроч іншага выдае і часопіс з такой самай назвай. Менавіта на старонках гэтага часопіса друкаваліся лірычныя вершы і чарадзейныя казкі Святланы Клімковіч у 1998—2000 гадах. На жаль, пісьменніцы ўжо няма на гэтым свеце, а падборка казак і вершаў зроблены яе дачкой — Алесяй. Дарэчы, аўтарка неаднаразова звярталася да дзіцячай аўдыторыі. Яе п'есы для дзяцей "Дар ляснога цара", "Балада пра белую вішню", "Казка пра цара Юрыка і каваля Рымшу", "Вясновая песня" пастаўлены ў лялечных тэатрах краіны, на Беларускім радыё і тэлебачанні. Па лірычных вершах Святланы Клімковіч, якія прадстаўлены ў зборніку, можна меркаваць, як усхвалявана і пяшчотна ўспрымала пісьменніца родную прыроду, якія метафары і сімвалы для апісання яе адметнасцей яна знаходзіла. А яе чарадзейныя казкі, якія арганічна знітаваны з беларускім фальклорам, з народнымі паданнямі і вераваннямі, прасякнуты сапраўднымі духоўнымі каштоўнасцямі. Адна з іх "Лалі-Лаль", напісаная ў 1974 годзе, выйшла ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" асобнай кніжкай. Цяпер яна таксама ўключана ў зборнік.

Шмат якія пісьменнікі свядома звярталіся да вуснай народнай творчасці. Не выключэнне і беларускія пісьменнікі. Варта ўзгадаць Ядвігіна Ш., Уладзіміра Караткевіча, Алеся Якімовіча, Уладзіміра Дубоўку, Максіма Танка, Васіля Вітку і інш., якія натхняліся аўтэнтычнымі народнымі тэкстамі і стваралі свае літаратурныя казкі. Казка — адзін з самых яркіх як фальклорных, так і літаратурных жанраў. Уладзімір Даль называў яе "чароўным расповедам, незвычайнай і нават няздзейсненай аповесцю, сказаннем". Казка вынаходлівая, мудрагелістая, нязвыклая. Яна распавядае пра дзівосныя падзеі, гераічныя подзвігі, адданае каханне. У кожнай фантастычнай гісторыі абавязкова закладзены сур'ёзныя маральныя веды.

Казкі С. Клімковіч гавораць пра вечныя праблемы, што хвалююць чалавека ў кожную эпоху: пра жыццё і смерць, любоў і нянавісць, высакароднасць і крывадушнасць. Літаратурныя казкі Святланы "населены" як звыклымі беларускімі народнымі архетыпамі, так і міфалагічнымі персанажамі. Героі яе казак — яснавяльможныя князі, паны, шляхціцы і простыя сяляне — ставяцца пісьменніцай у незвычайныя абставіны. Яны сутыкаюцца з разнастайнымі міфічнымі істотамі, якім аўтар надае чалавечыя рысы і выкарыстоўвае традыцыйныя народныя вобразы-сімвалы. Гэта небяспечны для злодзеяў, але добры і справядлівы для абяздоленых — Змяіны Кароль, варожая дэманалагічная постаць хваробы ў жаночым абліччы — Балотная Трасца, ператвораныя ў ваўкоў злосныя і зайздросныя жанчыны — панна Альбіна і яе дачка Магда, таксама дэманалагічная істота, але ўжо добрая і наіўная — палявая русалачка і інш. На іх сімвалічных вобразах, вынесеных з глыбінь народнай памяці, маленькі чытач вучыцца адрозніваць сапраўдныя духоўныя каштоўнасці ад падробных і ілжывых.

І хаця ў сваіх казках пісьменніца звяртаецца да старажытных фальклорных сімвалаў, яны вельмі папулярныя і ў цяперашні час, у іх гучыць трывога за нашы душы, яны вучаць нашых дзяцей быць вернымі дабру і папярэджваюць пра небяспеку тых, хто забыўся пра законы маралі, скарыўся падману і злу. У казках С. Клімковіч сцвярджаецца шэраг найвялікшых каштоўнасцяў у свеце — каштоўнасць уласнага дома, свайго роду, што азначае вяртанне да сваіх каранёў. І вяртанне да старажытнага мінулага. Вернасць традыцыйнаму, народнаму. Бацькаўшчыне.

Ірына ЗАНЕЎСКАЯ

Творчая рэпутацыя

У адных — з першых жа публікацый, у іншых — праз доўгую руплівую працу, але з цягам часу большасць пісьменнікаў набываюць пэўную творчую рэпутацыю. З чаго яна складаецца? Тут адыгрываюць ролю і праблемна-тэматычныя абсягі мастацкіх твораў, і стыль, і асаблівасці паэтыкі, і агульныя крэатыўныя здольнасці аўтара, і — вельмі часта — яго асабістыя чалавечыя якасці...
Парадокс у тым, што прызнання, папулярнасці ў чытачоў найчасцей заслугоўваюць тыя творцы, якіх не асабліва клапоціць грамадскае меркаванне і... уласная рэпутацыя.

«Полымя» № 12

Часопіс "Полымя", які мае аб'ектыўную рэпутацыю аўтарытэтнага і запатрабаванага выдання, завяршыў каляндарны год урачыста, адзначыўшы 85-годдзе з часу заснавання.

Снежаньскі нумар адкрываецца публікацыяй матэрыялаў "круглага стала", пасяджэнне якога адбылося ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. На парадак дня вынесена абмеркаванне этапаў творчага станаўлення часопіса і перспектыў яго далейшага развіцця.

Паэтычная творчасць прадстаўлена ў "Полымі" вершамі Тамары Кручэнкі, Навума Гальпяровіча і Рагнеда Малахоўскага.

Рубрыка "У лучнасці братняй" змясціла вершы народнага пісьменніка Удмурціі Вячаслава Ар-Сяргі (пераклад з удмурцкай Віктара Гардзея). Ва ўступе да публікацыі Алесь Карлюкевіч лаканічна ахарактарызаваў рэпутацыю аўтара: "Вячаслаў Ар-Сяргі — адзін з рупліўцаў, якія ўкладваюць свае намаганні ў работу па пашырэнні беларускай літаратурнай прасторы ў Удмурціі. Перакладае вершы нашых сучасных паэтаў для часопіса "Кенеш". Шукае беларусаў у Іжэўску, у роднай сваёй старонцы, каб добрае слова сказаць пра нашых суайчыннікаў у друку. Такі вось ён беларускі пасол у Іжэўску..."

Часопіс надрукаваў тры апавяданні Юры Станкевіча. Творы выклікалі вельмі адрозныя ўражанні. Сюжэт апавядання "Стрыечніца" — распаўсюджаная і банальная гісторыя, якія сёння шматкроць агучваюцца ў тэлевізійных перадачах і ўвасабляюцца ў мастацкіх фільмах. Правінцыйная дзяўчына едзе ў "мегаполіс" рабіць кар'еру. Мары не спраўдзіліся, — яна трапіла ў прытон і зрабілася "маёмасцю" крымінальнікаў. Стрыечны брат спрабуе вызваліць дзяўчыну, сутыкаецца з бандытамі, урэшце, набывае зброю... Усё празрыста і прадказальна. Значна больш арыгінальным падалося апавяданне "Прытча пра жукачарнацёлку", дзе па-свойму актуалізуецца пытанне злачынства і пакарання. А вось апавяданне "Пакупнік сноў" цалкам адпавядае рэпутацыі пісьменніка — майстра пабудовы алегарычных сюжэтаў, па-філасофску шматзначных гісторый-прыпавесцяў. Герой апавядання — шараговы служачы, "загадчык аддзела ў гарадскім архіве" — выпадкова даведваецца пра здольнасць свайго суседа бачыць прарочыя сны. Прыдумаўшы пэўную "легенду" (дзеля абгрунтавання сваёй цікавасці), герой пачынае купляць у знаёмца яго сны, праўда, адно тыя, што прагназуюць грашовыя дывідэнды. Пасля ўважліва іх расшыфроўвае і мэтанакіравана ўзбагачаецца. Аднак, захапіўшыся, па сутнасці — зарваўшыся, страчвае пільнасць і пакідае без увагі сон-папярэджанне...

Нізку празаічных мініяцюр Казіміра Камейшы "Паміж кубкам і вуснамі" складаюць яшчэвыя назіранні аўтара, яго ўспаміны і развагі. Між іншым, адно кароценькае эсэ па-мастацку вычарпальна вытлумачвае і жанравую, і ідэйна-мастацкую сутнасць аўтарскай задумы: "Паміж кубкам і вуснамі" — гэта маё асабістае піццё і пітво, створанае без нейкіх там рэцэптаў, па выпадковай падказцы душы ды самога жыцця. Можа, і не кожнаму яно прыйдзецца да густу. Ну, пэўна ж, не кожнаму. І сам часам зморшчышся ад яго гаркоты. Але кубак наш, пушчанскі, гліняны, зямны". Шмат у роздумах аўтара цікавага і слушнага... Адзін сюжэт прыцягнуў асаблівую ўвагу. Справа ў тым, што паэзія апошніх гадоў усё часцей выклікае ў



памяці гісторыю, чутую мною шмат разоў, але кожны раз аўтарства крылатай фразы прыпісвалася камусьці іншаму. А вось друкаваная крыніца — мініяцюра Казіміра Камейшы — гэта ўжо сапраўднае сведчанне, мастацкі факт: "Арытмія і арыфмія ў паэзіі відаць і неспрактыкаванаму воку. Тут не патрэбна нейкая кардыяграма. Як ні дзіўна, грашаць гэтым часам і старэйшыя паэты. А многія сённяшнія маладыя на рыфму і рытм проста не звяртаюць увагі. Як тут не згадаць Антона Бялевіча, які неяк, слухаючы спрэчкі крытыкі пра белы верш, не вытрымаў: "Белы верш — то белы, але і беламу не пашкодзіць рыфма".

У апавяданні Івана Капыловіча па-свойму актуалізуецца праблема мастака і мастацтва. Асноўныя падзеі адбываюцца ў 90-я гады мінулага стагоддзя. Галоўны герой — пісьменнік, які ў савецкі час карміўся ўласнай творчай працай і пачуваўся даволі камфортна — у новых эканамічных умовах вымушаны шукаць іншых формаў працы. Дзеля заробку ён прымае прапанову "высокапастаўленага" гандляра — дырэктара сталічнага універмага — стварыць "эпічнае палатно" пра гісторыю крамы. Аднак пісьменнік не ўсё зразумеў правільна: "Адам Часлававіч чакаў ад яго, Зубрыцкага, юбілейную кнігу не пра гісторыю універмага і тых, хто яго некалі будаваў, адчыняў у няпросты час, наладжваў работу, а пра самога сябе. Хутка, не паспееш азірнуцца, трэба будзе ісці на пенсію, і юбілейная кніга, мабыць, бачылася яму як нейкая вяршыня, на якой ён, дырэктар, з усіх бакоў асветлены сонцам, удзячнымі людзьмі са шчаслівымі ўсмешкамі, тымі, хто прыходзіць ва універмаг, як у Храм, дзе ёсць усё для душы і для жыцця. Па-рознаму бачылі яны змест кнігі"...

"Я заўсёды іду ад факта..." — такую назву мае інтэрв'ю Міколы Мікуліча з пісьменнікам, доктарам філалагічных навук, прафесарам, акадэмікам НАН Беларусі Уладзімірам Гніламёдавым, які ў снежні 2007 года адзначыў сваё 70-годдзе.

У рубрыцы "Крытыка і літаратуразнаўства" надрукаваны артыкул Алеся Бельскага "Неадлучная ад традыцыі. *Каханне, прырода, Сусвет... Паэзія часопіса "Маладосць" за 2006 год*".

«Маладосць» № 12

Пераважная большасць паэтычных узораў снежаньскай "Маладосці" пазначана змрочнымі настроямі і пакутніцкім пафасам. З надрывам пакутуе лірычны герой Андрэя Сузіня ("Я зноў станаўлюся халодным...", "Я закрыў назаўсёды кавалкі душы..."), гаротна сумуе герой Алеся Замкоўскага ("Мой боль тваім не стане болем..."), меланхалічна скардзіцца на лёс лірычная гераіня Ірыны Бельскай ("Я стамілася. — Ледзьве жывая ўваходжу ў сцюдзёны пакой..."), сумуе, перманентна п'е каву і шмат курыць гераіня Леры Сом ("Вып'ем кавы, адзначым сустрэчу з Варшавай, Вып'ем моўчкі пад дым не маіх цыгарэт..."). Між іншым, у паэтычным мысленні *апошніх* паэтак назіраецца пэўная еднасць. Вось, напрыклад, верш Ірыны Бельскай:

Я і паводзіла сябе па ролі,
І нават вывучыла
ўсе паролі —
Марыла ж толькі аб тым,
Каб душу маю больш
не паролі.

Лера Сом, аўтар з большым жыццёвым досведам, філасафічна заўважае:

Сэрца свабодна і запаролена,
Доступ да цела абмежаваны.
Я пагарджаю пэўнымі ролямі
Дзеля гадзіннай нірваны.

Часопіс працягвае друкаваць "Дзённікавыя нататкі" Уладзіміра Дамашэвіча.

Заключныя раздзелы аповесці Валерыя Гапеева "Ведзьміна тоня" (пачатак у папярэднім нумары) больш дынамічныя, напоўненыя падзеямі і прыгодамі. Аднак ніякага дысанансу паміж дзвюма публікацыямі не ўзнікае. Наадварот, агульная канцэпцыя твора бачыцца цалкам лагічнай, натуральнай. На пачатку аўтар засяродзіў увагу на асабістым жыцці юных герояў, познаёміў чытачоў з асаблівасцямі іх лёсаў, характараў, умовамі жыцця і выхавання. Пісьменнік дэталёва і рэалістычна асвятліў няпросты шлях падлеткаў да ўзаемаразумення і сяброўства, прадэманстраваў унутраныя стымулы, якія кіравалі кожным з персанажаў, эвалюцыю іх маральнага сталення. Праўдзіва, па-мастацку дасканала аўтару ўдалося асвятліць ключавую падзею сюжэта — вандроўку на востраў, расследаванне падзей часоў Вялікай Айчыннай вайны — гібелі групы партызан. Увогуле ў творы ўвасоблена мноства яркіх эпізодаў — гэта і само будаўніцтва плыта, і пошук партызанскай зямлянкі, і рыбацкая ўдача хлопцаў... Асабліва важна, што ў сюжэце нязмушана, без дыдактызму, але вельмі наглядна і пераканаўча выяўляецца думка пра кошт сяброўства, духоўнага высакародства, дэманструецца этыка ўзаемаадносінаў паміж людзьмі, дзе дамінуюць спагада, разуменне, дабрата. Упэўнена, што аповесць Валерыя Гапеева — твор з захапляльным сюжэтам, здольны выхоўваць, узбагачаць маральна і інтэлектуальна, напісаны добрай літаратурнай мовай — цалкам прыдатная для школьнай праграмы, з ахвотай будзе чытацца сучаснымі падлеткамі.

У апавяданні Таццяны Гарэлікавай "Хутка яснела неба" ўвасоблена супрацьлеглая гісторыя... Герой твора — адзінокі падлетак, якога ўзяла на выхаванне цётка: "Тату ён зусім не помніць, а мама... Яму так хацелася пабачыць яе... Але мама хворая. Калі яе вылечаць? Цётачка Надзя кажа, што гэтая хвароба — алкагалізм, яна дужа цяжка лечыцца". Душэўны дыскамфорт, грэблівыя адносіны аднакласнікаў, адчуванне спецыфічнай варожасці свету і ўласнай безабароннасці цяжкім гнётам кладуцца на свядомасць дзіцяці, штурхаюць на неабдуманы крок...

Драматургія прадстаўлена ў "Маладосці" трагедыяй "Арэст і Касандра" Георгія Марчука (працяг, пачатак у № 11).

У публікацыі "Адкрыты ўрок, або Знесеныя ветрам" Марыя Верціхоўская аналізуе аповесць-эсэ "Два ўрокі" Навума Цыпіса і аповесць "Воплаўская госця" Івана Карэнды.

У артыкуле Яўтена Гарадніцкага "Шлях вучонага і пісьменніка" размова ідзе пра навуковыя і творчыя дасягненні Уладзіміра Гніламёдава.

Ігар Запрудскі ў артыкуле "Сапраўды" разважае пра стан сучаснай беларускай літаратурнай крытыкі. "Чаму цяпер быць крытыкам асабліва невыгодна, непрэстыжна і нават... небяспечна?" — такім пытаннем задаецца аўтар і прапануе на гэты конт свае цікавыя меркаванні.

"Маладосць" працягвае друкаванне краязнаўчага даведніка Лідзіі Кулажанкі, Адама Мальдзіса і Святланы Сачанкі "Літаратурныя мясціны Беларусі".

Публікацыі "Гістарычныя дыялогі" Алеся Карлюкевіча і Уладзіміра Ліхадзедава папярэднічае ўступная прадмова, у якой падкрэслена сутнасць гаворкі і яе перспектыўная мэта: "...Падштурхоўвае да гэтай размовы зразумелае жаданне ведаць, хто мы такія, адкуль родам, наколькі глыбокая наша гістарычная памяць. <...> Вельмі спадзяёмся, што нашы гістарычныя дыялогі, падказаныя дарожнымі развагамі, стануць для многіх першаштуршком да ўласных вышукаў. Разбудзяць гістарычную памяць, дапамогуць выспець сапраўднаму гонару за краіну".

"Нёман" № 12

"Нёман" адкрываецца публікацыяй "Время Союза" — гутаркай галоўнага рэдактара часопіса Ніны Чайкі з намеснікам Дзяржаўнага сакратара, членам Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы Васілём Хролам.

Паэтычныя старонкі выдання прадстаўлены вершамі Івана Карэнды (пераклад з беларускай Барыса Рабухіна), Яўгенія Сакалова, Мікалая Зіноўева, Марыны Струкавай, Паўла Сіманава і Алены Міхаленкі.

Герой аповесці Аркадзя Пінчука "Княжна Мария" — пісьменнік, якому знаёмы кінарэжысёр прапануе напісаць сцэнарый па адным з яго твораў і паставіць мастацкі фільм. Пісьменнік, безумоўна, пагадзіўся, хаця ў яго "не было никакого киношного опыта". Выконваць галоўную ролю ў фільме выбрана актрыса, у якую пісьменнік закахаўся з першага погляду. Нягледзячы, што абодва персанажы маюць сем'і, дзяцей, пачуццё паглынае іх. Сюжэт аповесці складаецца пераважна з эпізодаў, дзе мяжуюцца любоўныя перыпетыі і праца над сцэнарыем... Аднак сацыяльна-палітычныя змены ў краіне перакрэслілі ўсе планы герояў — "фильм о княжне Марии приказал долго жить". І ўсё ж такі пачуцці да актрысы ў душы пісьменніка захаваліся... У фінале твора персанаж прызнаецца: "Я всегда нёс в своём сердце благодарность Марии за то, что она была в моей жизни, за то, что сама устояла и удержала меня от разрушительных последствий бракоразводных потрясений". ...Шчыра кажучы, мараль герояў, як і іх рэпутацыя, выглядаюць даволі сумніўна...

Ва ўрыўку "Железный остров" з аўтабіяграфічнага рамана Івана Сабілы "Открытый ринг" адлюстраваны падзеі пераважна часоў Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар з цеплынёй згадвае блізкіх і дарагіх яго сэрцу людзей, захапляецца іх мужнасцю, сілай духу, вытрымкай і гераізмам.

Тэматыка абодвух апавяданняў Барыса Крывялевіча непасрэдна датычыцца адносін мужчыны і жанчыны. Прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва ў гэтых творах выклікаюць несумненную сімпатыю і глыбокую павагу. Хаця навелістычныя сюжэты твораў узнаўляюць вельмі адрозныя жыццёвыя сітуацыі, і ў адным, і ў другім выпадку галоўныя героі дэманструюць духоўнае высакародства і здольнасць да сапраўднага супераджывання.

У апавяданнях Маргарыты Прохар "Увидеть море..." і "Тонкая линия" асобныя жыццёвыя выпадкі ўзбуйняюцца да філасофскіх высноў. У першым творы ідэйны сэнс заключаны ў тэзе "Счастье надо уметь создать вокруг себя", у другім аўтар падштурхоўвае да асэнсавання адказнасці за свае ўчынкі, за блізкіх, за "тых, каго прыручылі".

У апавяданнях Ганны Лео "Лётчик высшего пилотажа" і "О чём тут говорить" у іранічным ключы разглядаюцца вобразы сучаснікаў — гультаяватых інертных абывацеляў, партрэты якіх выглядаюць даволі характэрнымі і тыповымі.

Да 125-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа прымеркаваны артыкулы Уладзіміра Агіевіча "В каждой строке — читай — жизнь" і Мікалая Жыгоцкага "Дрыгва" и дед Талаш".

У рубрыцы "Литературная критика" змешчаны публікацыі Ядвігі Волкавай "В океане любви...", дзе разглядаецца паэзія Уладзіміра Караткевіча, і рэцэнзія Васіля Ткачова на кнігу Барыса Кавалерчыка "Игра мыслей". Што тычыцца палемічнага артыкула Пятра Ткачэнкі "Незримая амброзия", то да "літаратурнай крытыкі" ён мае вельмі адноснае дачыненне. Аўтар, хутчэй, крытыкуе ўсё сучаснае грамадства, выказвае абурэнне сітуацыяй "морального кризиса". Асноўнае пытанне, на якое аўтар шукае адказ, фармулюецца наступным чынам: "Но как и почему могло случиться, что литература в России, традиционно являющаяся формой народного самосознания, а вместе с ней и всякая интеллектуально-мыслительная жизнь оказались закрытыми с такой быстротой, как может закрываться только бакалейная лавка?"

Рубрыка "Время. Жизнь. Литература" прапануе матэрыял Васіля Жураўлёва "Молодость голоса пушкинской и национальной литературной традиции".

У артыкуле "Колючие розы судьбы" Алесь Карлюкевіч расказвае пра жыццёвы і творчы лёс сціплага рупліўца на ніве айчыннай літаратуры паэта-сатырыка Захара Біралы.

Лада АЛЕЙНІК

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

З думай пра новую вясну

Першы верш Міколы Чарняўскага ўбачыў свет у газеце "Піянер Беларусі", калі аўтару, школьніку з Гомельшчыны, споўнілася пятнаццаць гадоў. З таго часу шмат пражыта і перажыта, вынашана і ўзважана сэрцам, напісана і выдадзена асобнымі кніжкамі. Паэт чатыры разы станавіўся лаўрэатам рэспубліканскіх конкурсаў на лепшы твор для дзяцей і юнацтва. Ушанаваны званнем лаўрэата Літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра і прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.
Дзіцячая літаратура, гумар і сатыра, лірыка — вось той творчы палетак, дзе плённа працуе Мікола Чарняўскі. З-пад яго пяра выйшла больш трыццаці кніжак, прыхільна сустрэтых чытачамі, юнымі і дарослымі.
Мікола Чарняўскі сабраў вершы для новай кніжкі. Гэты плён — як дажынкі на творчым палетку. Здавалася б, можна і ўздыхнуць спакойна, але паэт думае пра новую вясну, пра новы ўраджай: пад "музыку дажджынак душа не хоча спачываць. Шапоча дождж — зачын дажынак, што будзем потым святкаваць".

Мікола МАЛЯЎКА

Прызба

Штовосень,
Парой лістападнай,
Ля хаты ў пагодны дзянёк
Мой бацька ўвіхаўся з лапатай,
Узвёўшы пад прызбу плятнёк.
Падрубы саломай сухою
Абкладваў, зямлёй засыпаў,
Каб гніль не ўзяла, і зімою —
У хату мароз не дапяў.
Бо ён, той нячысцік-прайдоха,
Ні дня не даваў прадыхнуць:
Пішчом лез,
Каб хоць праз падлогу
Нас, босых,
За ногі куснуць!
І прызбу яшчэ бацька ўзводзіў
Не горай за вал крапасны, —
Каб мог пасядзець пры нагодзе,
Каб вытрымала да вясны.
На прызбу, я помню, пад вечар
Збіраліся ў нас мужыкі.
Ім прызба —
Вясковае веча —
Развязвала ўсім языкі.
Дыміла цыгаркамі густа,
Аж млосна хмурынкам было:
Здаралася, дожджыкам шустрым
Слязіліся, быццам назло.
Што душы вярэдзіла, грызла,
З аглядкай, ды лезла з грудзей, —
Не чула начальства,
А прызба —
Іх чула, ад плуга людзей.
Ні крэслаў табе, ні трыбуны,
Рэгламент адзін —
Дацямна.
У грудзі не білі, бы ў бубны,
Спакойна ішла гамана.
Хто ўспыхваў — гарачых не ў меру
Студзілі жанок галасы:
— Ты прыйдзеш дахаты вячэраць
Ці будзеш гамонкаю сыт?..
Цярпліва, без лішніх капрызаў,
Як спікер той, сходкі вяла:
Журылася прызба,
Смяялася прызба,
А ў святы —
І спеўнай была...
Змяняюцца людзі і ўлада,
Ад вёскі — былога няшмат.
Стаяць на падмурках
Па вёсцы ўсёй хаты,
Ды пуста, бязлюдна ля хат...

P. S.
Жыву, як і ўсе,
Пры абноўленым "ізме",
А ўспомню пра бацьку —
Здаецца, сяджу з ім на прызбе
І слухаю сэрцам
Таемна-маўклівую споведзь,
А дым ад цыгаркі ягонай —
Як з небам
Журботная повязь.

* * *

Між Часам тым
І Часам гэтым
Пралёг у памяці прагал.
Як між зімою
І між летам,
Дзе вольна травам і снягам.

Стаю на ўскрайку,
Лезе одум,
Як лейцы,
Тузаючы лёс:
"Адкуль прыйшоў,
Адкуль ты родам?
Што з Часу ў Час
Ты перанёс?"

Як адкажу я
На узмежжы
Часоў,
Не крывячы душой?
Як Час былы мне
Не заснежыць,
А гэты —
Не заслаць імжой?

Спяшацца трэба,
Бо на роздум
Няма ўжо часу:
Час — як міг...
Скажу:
Я ўдзячны
Ім, абодвум, —
Жыву з Радзімаю,
З людзьмі.

* * *

Жыву, як жыў, —
І дзякуй Богу.
Сабе і людзям
Не ілгу.
Радку пракладваю дарогу
Праз сэрцабой,
Праз не магу.
Дзень пражыву —
Руку трымаю
На сэрцы я
Усё часцей:
Яно — апошні скарб,
Што маю
У цёплай схованцы
Грудзей.

Сярэбраная кладачка

Пад зоркамі,
Пад поўняю
Святла сцяжынка роўная,
Святла сцяжынка роўная,
Дзівоснага святла,
Як кладачка чароўная,
Як кладачка чароўная,
Сярэбраная кладачка
Над рэчкай пралягла.

А зорачкі смяяліся,
А зорачкі купаліся,
А зорачкі купаліся
У хвалях трапяткіх.
І ўсе сцяжынкі росныя,
І ўся краса дзівосная
Сюды здалёк спяшалася,
Каб паглядзець на іх.

Пад зоркамі,
Пад поўняю
Стаялі мы да поўначы,
Стаялі, дум не тоячы,
Пад чарамі святла,
Бо кладачка чароўная,
Бо кладачка чароўная,
Сярэбраная кладачка —
Між намі пралягла.

* * *

Відаць, ён выбіўся
З нябесся,
Каб мовіць лёсу:
"Не ўстрывож..."
Не сплю я,
Слухаю як песню:
Шапоча дождж,
Шапоча дождж...

Пад гэту музыку дажджынак
Душа не хоча спачываць.
Шапоча дождж—
Зачын дажынак,
Што будзем потым святкаваць?
Ды ўсё ж душу
Цярэбіць верад:
"Што нёс, нічога не растрос?"...
У ноч я трапіў,
Ды не ў нерат:
Шапоча дождж —
Вястун нябёс...

І старасць — у радасць

(Усмешка)

Круціўся колісь
колам,
А дзеўкі беглі ўслед.
Быў не Міколам —
Колем,
Цяпер жа —
Лысы дзед.

Хоць абдымай з набегу
І дзевак,
І кабет,
Цяпер жа —
Варты смеху:
Як пень той
Лысы дзед.

Ды радасць ёсць
У гэтым :
Не злазяць дома з рук,
Завуць пяшчотна дзедам
І ўнучачка,
І ўнук.

Надзея ШУК

Tocеatus*

*Si vis amari, atā.***

Як першы сполах навальніцы,
Тваё прызнанне. Памаўчым.
У гэтай зорнае начы
Я так баюся памыліцца —
Не дай, Бог, заўтра павініцца
У словах, сказаных наспех.
Дый ці даруюць нам той грэх
Арол, Алькор і Мілавіца,
Што сочаць сёння з вышыні
За намі мудрымі вачыма?
Ты ж ведаеш, што немагчыма
Пражыць усе суладна дні...
А што як здрада? Ці папрок?
А што, калі і не кахалі,
А словы проста так кідалі,
Каб падмануць нясмелы змрок?
А што, калі мы ўсё забудзем?
І гэта ноч, як быццам здзек,
І пачуцця кароткі век?..
Як мы глядзець у вочы будзем
Адно адному... і вясне,
І гэтым зорам, што над намі —
Ім толькі знанымі шляхамі
У гэту ноч вялі мяне
З табой на позняе спатканне
І словы першыя кахання
Шапталі вуснамі?.. А ўранні
Ўсё тое будзе, як у сне?..
Мы вязні гэтае начы.
Ты не пытайся, ці кахаю —
Я не хачу выгнання з раю
Тваіх абдымкаў. Памаўчым...

---

*(лац.) Памаўчым.

**(лац.) Калі хочаш быць каханым, кахай.

* * *

Няўжо навокал сэрцы-камяні?!
Як розумам прызнаць,
спасцігнуць тое?
Ва ўлонні мацеркі — мільённае малое
Безабароннае крычыць "Абарані!"

"Абарані!" — я чую роспач веку
У полі, у натоўпе, у зямлі...
"Пакуль з зямнога твару не змялі,
Абарані! — крычыць ён чалавеку —
Абараніся! Ад сябе абарані!"

* * *

Зноў рэжа памяць цішыня,
Баліць настылае маўчанне,
І поўня — сумная жняя —
Сярпуе зоры да світання.

Не межыць сон даўно павек
(Хоць не знайсці таму прычыны),
І ноч даўжэйшая за век,
І заўтра быццам немагчыма...

Табе мяне не зразумець.
Ізноў самоцяцца каштаны.
І несупынна льецца медзь
На рукі стылыя паркана...

* * *

У гэту ноч ты мог бы стаць
Рабом, выгнаннікам і богам...
Мне невыносна не кахаць
Цябе, няхай сабе, зямнога,
І я не здольная караць
(Нянавісць для цябе — замнога),
Хоць ты і не жадаеш стаць
Маім рабом... і нават богам!..

* * *

Так бывае: самотны настрой
Перамешаны з нотамі смеху.
П'ю вясны светла-сіні напой
І гукаю забытае рэха.

Ты адкінь свой зімовы спакой,
Рэшткі стомы, нуды і адчаю!
Красавіцкая ноч над ракой
Салаўямі спявае "Кахаю!"

Дык ці трэба на лёс варажыць
І баяцца халодных світанняў?
Рэха сцежкаю ў ноч пабяжыць,
А над светам — вясна і каханне!..

* * *

Згасла ноч.
Навальніца.
Не спіцца...
Захлынаецца боль
У душы...
Памаўчым.
Сёння добра
Маўчыцца...
Навальнічная ноч,
Як ваўчыца,
У грымотнай палюе
Цішы...

Фота Кастуся Дробава

Вецер з Чорнага яра

Раіса БАРАВІКОВА

Старонкі з аповесці

Рэдакцыя часопіса "Полымя" мяркуе ў першым паўгоддзі 2008 года надрукаваць аповесць Раісы Баравіковай "Вецер з Чорнага яра", у якой распавядаецца пра трагедыю сям'і Васіля Канстанцінавіча Бузяка.

Магчыма, элемент містыкі, але трагічныя падзеі звязваюцца з золатам і праклёнам... Адбываюцца яны ў часавай прасторы — 1937, 1984, 1993 і 2002 гады.

Чытачам "ЛіМа" прапануюцца старонкі з аповесці.

Бура — вельмі моцны вецер, які небяспечны вялікімі разбурэннямі і чалавечымі ахвярамі. Калі вецер перавышае трыццаць метраў у секунду, — гэта ўжо ўраган: на сушы, на моры, у акіяне.

Ураганы маюць самыя розныя назвы — Іван, Жана, Катрына... І разбуральная сіла ў іх розная, адпаведная сіле ветру. Апошнія бываюць паўднёвыя, паўночныя, заходнія і ўсходнія. Мой вецер — вецер з Чорнага яра.

Ад аўтара

ПОЗНЯЯ ВОСЕНЬ 1937. ЛЁС ЗАВЯЗАЎСЯ

Невялікая вёсачка Ліпкі быццам утапілася ў цемры позняга лістападаўскага вечара. Моцнага снегу яшчэ не было, а той, што паспеў пацерушыць, дадаў раздарожжа, што не высыхала пасля працяглых восеньскіх дажджоў. Косцік Бузяк — дваццацішасцігадовы, хударлявы, але немалога росту мужчына, падняўшы каўнер, бы не са свайго пляча караткаватай ватоўкі, ішоў шпаркім крокам, трымаючыся платоў, каб можна было ўхапіцца за штыкеціну, калі раптам паслізнецца на гразкай сцежцы. Ён ужо бачыў невыразны, прысадзісты пад намоклым саламяным дахам абрыс сваёй хаты, што была перадапошняй у даволі доўгім ланцугу хат, якія мала чым адрозніваліся адна ад адной. Ва ўсялякім выпадку, у гэтай вільготнай цемрадзі, з якой нечакана вынырнула і спынілася перад ім жаночая постаць, захутаная ў тоўстую суконную хустку.

— Косцік, ты-ы? Пазнала толькі цяпер, па шапцы.

— Я... Я, цётка Хадора. Цьфу ты, напалохала!

— Бач, палахлівы які! А я — ад вас.... Пэўна ж, сам здагадаўся, чаго газніца ў вокнах свеціцца! Разрадзілася твая Валя, а цябе ногі дзесьці носяць. Сын у цябе, Косцік! Бацькам ты ўжо стаў. Малога памылі, а Валя яшчэ нячыстая. Я адыходзіла, вада закіпала, яе мыць пачнуць. Тады ўжо малога да цыцкі прыкладзе. Сэрца ў грудзях ірвецца, га-а?

— Праўду сказала, забілася сэрца, — але ўсмешка, якою ён хацеў выказаць радасць, не атрымалася шырокай. Вочы свяціліся трывогай, у іх гарэў нядобры агонь, як у чалавека пасля ліхаманкавай гарачкі. — Значыцца, сын. Сына мы з Валяю і чакалі.

— Ну ідзі ўжо, не перамінайся з нагі на нагу, — цётка Хадора ямчэй нацягнула на лоб хустку. — Вецер ніяк не сцішыцца, і ты ж, во-о, у якой ватоўчы лёгкай, а ў бацькі ж твайго, помню, добрая світка была. Вось яно, як жыццё складваецца. Раненька пакінуў гэты свет бацечка твой, унука не дачакаўся.

— У нас там, у хаце, многа жанчын? — бы спахапіўся Косцік, раптам успомніўшы ў думках пра нешта сваё, што гняло ці, наадварот, радавала.

— Ды адкуль тыя жанчыны? Чаго ім быць цяпер у вас? Я, во-о, была, ды Каця Антонава яшчэ засталася. Пупа яна вязала. Ёй на хутар ісці, дык, можа, у вас і заначуе.

— То я пайду ўжо, — заспяшаўся Косцік.

— Глядзі ў лужыну не ўлезь каля плота вашага. Вады многа за дзень нагнала.

Але цётка Хадора гэта ўжо сказала наўздагон Косціку і адказу ад яго не пачула. Толькі ў бліжэйшым двары скавытнуў сабака, быццам нехта адагнаў яго ад сябе нагою. Вёска гэтым познім часам яшчэ не ўся спала. "Чуў нехта, пра што мы тут з Косцікам гаманілі, — падумала Хадора, — Заўтра ўжо ўсе будуць ведаць, што Валя хлопца нарадзіла. Сёй-той і ў адведкі збярэцца". Яна таксама старалася не ісці па слізкай, размытай вадою сцежцы, збочвала да платоў. А Косцік ледзь не подбегам ужо набліжаўся да сваёй хаты. Спыніўся каля лужыны, сагнуўся і адною рукою, трымаючы другую за пазухай, пачаў мыць высокія гумовыя боты. Потым пастаяў нейкае імгненне, прыслухаўся, быццам не даваў веры дрымоце, у якую ўпадала вёска, і пайшоў да брамкі...

Калі падыходзіў ужо да сенцаў, пабачыў маці. Яна выцягвала з дзвярэй вялікі цэбар.

— Чаго ж ты стаў як укапаны, бярыся за вушка, — адазвалася да яго. — Ваду пад яблыню трэба выліць, каб тут... у двары ніхто не таптаўся па ёй. Парадзіху ж мылі. Валя хлопчыка нарадзіла.

— Ведаю, Хадору сустрэў, — падумаў і загаварыў пра іншае: — З мястэчка сёння ажно ўпяцёх прыязджалі...

— Ага-а, казалі людзі... Цябе з упаўнаважаным бачылі... З кацапам... Ямчэй бярыся, цэбар цяжкі. Ну, панеслі... — і яна ўзялася за другое вушка.

Парожні цэбар Косцік ужо нёс сам, але ў сенцы яго не ўнёс. Паставіў каля дзвярэй, нахіліўся да маці і сказаў ціха:

— Давай, за вугал хаты зойдзем. Толькі Валі пакуль нічога не кажы.

— Чаго не казаць Валі?

— Вось пра што не казаць, — ён хутка выцягнуў з-за пазухі невялікі вузельчык, але цяжкаваты, ёмісты. — Бяры... Гэта трэба схаваць, толькі не ў хаце, — яго дыханне стала гарачым. — У клець занясі... пад транты якія...

— Што ж тут, у гэтай анучы такое, што трэба хаваць?

— Гро-ошы, ма-а! Золата... Чырвонцы, яшчэ царскія!

— Адкуль яны ў цябе? Кажы, адкуль?!

Яе рукі раптам сталі непаслухмянымі, вузельчык выпаў з іх, і Косцік паспеў падхапіць яго. І тут жа зашаптаў з жаданнем хутчэй выказацца. Дыханне зрабілася частым, але словы не блыталіся.

— У Каранеўскіх забраў... Забраў, і ўсё! Гэта ж да іх з мястэчка прыязджалі па золата гэтае... Хтосьці давёў, што Сцяпанаў дзед калісьці бровар меў і грыбаварню, і кузня свая ў іх была. Але не шукалі, не трэслі, акуратна ўсё! Відаць, баяліся пасля таго выпадку, калі Цялешку да палонкі цягнулі і потым нехта з іх застрэліўся... Не вытрымаў... Мяккае сэрца ў чалавека было...

Яго перапаўняла хваляванне і, здавалася, ён вось-вось задыхнецца ад гэтага свайго гарачага шэпту.

— Каранеўскі на сваім стаяў, як і Цялешка тады: нічога няма і няма! А я позірк перахапіў... Сцяпан Вандзе вачамі паказаў на ўслончык. І яна села на яго. Тут я пра ўсё і здагадаўся. Успомніў, як даўно, яшчэ з бацькам па барану да іх хадзілі... А Каранеўскі той услончык якраз рабіў... І ножкі выдзёўбваў... Я тады яшчэ здзівіўся... А тут адразу цюкнула: у тых ножках ёсць нешта! І не памыліўся. Калі ўпаўнаважаныя ад'ехалі, я вярнуўся... На-а... На-а... Бяры! — і ён сціснуў сваімі рукамі матчыны рукі, быццам забаяўся, што вузельчык зноў выпадзе з іх.

— Гы-ы-ы-ы... Гы-ы-ы-ы... — вырвалася з матчыных грудзей і яна закашлялася, папярхнулася гэтым сваім глухім нечаканым плачам. — Божачкі, што ж гэта на цябе такое найшло, сыночак! — выціснула з сябе. — Галеча нашая, куды ж цябе завяла, зацягнула? Дух у мяне заняло... Пайду... Зараз жа пайду да Каранеўскіх... Назад людзям добро іхняе занясу. Занясу, павінюся... Гы-ы-ы-ы... Што ты нарабіў?! Я газы пляшку ўчора ў Ванды пазычыла... Як жа буду ёй аддаваць? Як парожак іхні пераступлю? Павінюся... Пайду!

І яна адпіхнула яго ад сябе, наважваючыся ісці. Ён выхапіў вузельчык з яе рук і міжволі заступіў дарогу. У голасе пачулася злосць:

— Хочаш, каб гэтыя... з мястэчка... забралі? А яны вытраслі б, як толькі трэсці пачалі б! На Каранеўскіх паперы ўжо ўсе гатовыя... Яны яшчэ таго не ведаюць, а недзе там... ужо ўсё вырашылі. Высяляць іх адсюль будуць. Праз які тыдзень прыедуць і павязуць... У Сібір ці яшчэ куды! А мо і заўтра нават? Сюды яны ўжо не вернуцца. Хто пра што дазнаецца, ма-а? Каму яны паскардзяцца? Каму што раскажуць?! Ад уладаў золата хавалі? Хай толькі пікнуць... Іх жа адразу таго... Сцяпан гэта разумее. Ён толькі збялеў, калі я ўслончык аб падлогу бразнуў... Анэля старая за ватоўку чаплялася, руку мне падрапала...

— Божа... Божа... — маці абхапіла яго шыю рукамі. — Злітуйся... Хіба ты з чужога разжывешся, сынок?

— Разжывуся! — Косцік разняў яе рукі і зашаптаў: — Сын у мяне... Васіль! Васілём назавём... Сёння лёс яго завязаўся і золата гэтае будзе лёсу ў падмогу. Знойдзем, як ва ўжытак пусціць! — і ўздрыгнуў, пачуўшы, што расчыніліся дзверы ў сенцах.

— Нюра-а! Ню-юра-а! — данёсся незнаёмы яму жаночы голас. — Дзе ты там?

— Гэта Каця Антонава, — шапнула маці і адазвалася гучна: — Не крычы, я тут! Косцік прыйшоў, дык яшчэ па адзін цэбар у хлеў паслала. Заўтра мо ўжо пялюшкі будзем мыць. Зачыняй дзверы, холаду у сенцы напусціш. Мы зараз ідзем! — і маці прыхінулася да звільгатнелай сцяны, быццам адчула, як падгінаюцца ногі... Быццам пабачыла перад сабою абрыў, куды Косцік уцягнуў сябе і яе ўцягвае... Адзін толькі зрух і паляціць...

— Ну-то, пойдзем ужо, — сказаў Косцік.

— Зараз пойдзем... Не... Чакай... Ванда, што, калі ты...

— Ванда? Ды яна... Ну... Ванда дачок у другі пакой вывела, калі я з ножак золата пачаў вытрасаць. Яны заенчылі...

І маці здалося, што яна страчвае апору... Апусцілася на каленкі, чапляючыся за сцяну, заганяючы ў пальцы стрэмкі.

— Гы-ы-ы-ы... Людзей абабраў! Ты... Ты...

Словы не знаходзіліся, каб сказаць яму, хто ён. І плечы яе затрэсліся ў плачы.

Ванда Каранеўская таксама плакала... Яна ляжала ў байкавай кофце і ў камізэльцы з аўчыны на мяжы свайго бульбянога палетка, за якім пачынаўся глыбокі роў, прозваны Чорным ярам. Глыбока ўнізе вілася рачулка Чарняўка, якая ніколі не высыхала, але ў любым месцы яе можна было перайсці, а то і проста пераскочыць. Ды людзі рэдка спускаліся да яе. Да рова прыходзілі, каб наламаць вербалозніку, з якога плялі кашы, лапці... Ванда не ведала, чаму яна апынулася тут, ля самай стромы. Помніць, што загаласіла толькі тады, калі Косцік, запіхваючы анучу, у якую згроб чырвонцы, за пазуху, выбег з хаты. Яна кінулася да свайго Сцяпана. Хапала яго за рукі, лашчыла іх у сваіх руках і вымаўляла адно: "Сцёпачка... Сцёпачка... Чаму ты яго не забіў? Чаму не забіў?! Трэба было забіць! Швайкаю закалоць, як свінню колем! У цябе ж ручкі такія дужыя, сілы ў іх многа... А то сякерка, вунь, пад лаваю... А можна ж было і віламі запароць! Ці ж ты не адужаў бы яго?!"

Старая Анэля — Сцяпанава маці, якая дагэтуль моўчкі сядзела ля стала, перажагнала сябе і разважыла па-свойму:

— Трэба было да пчол у вулей пакласці грошы... Помню, дзед твой, Сцёпка, там іх хаваў...

— Сціхніце! Абедзве сціхніце! — закрычаў Сцяпан. —Ага-а, у вулей?! Дык жа і яго забраць могуць разам з пчоламі! Пчол яны пабаяцца... За кожны вулей падаткі плачу, і за курыцу кожную, і за яблыню... Вунь колькі іх навысякаў, каб меней плаціць! А паспрабуй не заплаці... Гм-м, пчолы некага спыняць? Напалохаюць?!

— О-о, як раскрычаўся! А я ж проста так сказала, дзеда твайго ўспомніла. Па гэтых грашах найболей у яго душа баліць на тым свеце.

— Забіць яго трэба было, забіць! — і яснасці не было ў вачах Ванды. Памутнелым позіркам глядзела на Сцяпана, не выпускаючы яго рукі са сваёй. — У роў зацягнулі б! У Чарняўку ўціснулі б! Закапалі б у яе дно!

Сцяпан падняўся з лавы, на якой сядзеў ля акна:

— Э-э, у Чарняўку яна ўціснула б!.. Да магілы падвяла б і мяне, і сябе! Іх, — кіўнуў на дзверы ў другі пакой, — На каго пакінула б?! Надзя, як з двара прыйшла, дык ніхто і не пакарміў! Пра дачок падумай!.. І... І мяне не чапайце, дайце да сябе прыйсці!

— Прыходзь да сябе, Сцёпачка, прыходзь, — закрычала Ванда, — А я ў свет пабягу... Куды ногі панясуць! Не будзе ўжо жыцця ў хатачцы гэтай! Сёння грошы басяк забраў, а заўтра кароўку з хлява выведзе...

Яна кінулася да дзвярэй, як ашалелая. Не патрапляючы адразу, нацягнула на ногі буркі, пашытыя са старога шыняля, і выбегла з хаты...

Абмінула свіран, дабегла да хлява, потым да веснічак у высокім шчытным штыкетніку. Адкінула зашчапку і выбегла на палетак, дзе адразу ж вецер сарваў хустку з яе галавы, і яна заматлялася на шыі. Буркі вязлі, набіралі вільгаці, яна ледзь выцягвала іх з гразкай глебы і бегла не ведаючы: куды і навошта? Гэты палетак у хвіліны вялікай роспачы ўжо неаднойчы вабіў, прыцягваў яе, быццам мог вывесці да суцяшэння, да яснасці ў думках і душэўнага спакою. Вандзе раптам згадалася, як даўно, яшчэ да іхняга вяселля, вырашылі яны са Сцяпанам паехаць у мястэчка. Тады ў Сцяпанавых бацькоў яшчэ быў свой конік, якога яны доўга не здавалі ў калгас. Яна, Ванда, намерылася накупляць тканіны на падарункі сваім будучым сваякам. І накупляла. А калі вярнуліся ў Ліпкі, Сцяпан запрасіў яе да сябе ў хату. І Анэля радасна сустрэла іх, адразу пасадзіла да стала, наліла поўную міску мёду, нарэзала белага хлеба, а потым вазьмі і скажы: "А мы ж, Вандачка, яшчэ да тваіх бацькоў сватоў не пасылалі, а ты ўжо падарункі нам усім накупляла!.."

І тады Ванда таксама выбегла з хаты, і пабегла сюды, на гэты палетак, дзе тым летам расло высокае жыта... Сцяпан даганяў яе і дагнаў, калі яна ўжо выбегла на мяжу і, знясіленая, задыханая, упала ў густую траву, у высокія рамонкі... Сцяпан апусціўся побач і цалаваў яе, і шаптаў: "Табе ў нас будзе добра... Ты дарэмна ўскочыла і пабегла... Маці гэтак няўмела пажартавала, яна даўно ўпанаравіла цябе... І бацька мой таксама ўпанаравіў... Цябе прымуць, як маладую гаспадыню, і ты ўсім будзеш распараджацца ў нас гэтаксама, як маці..." Яна слухала, лёгенька адбівалася ад яго пацалункаў і чула, як блізка ў Чорным яры бушуе, гудзе вецер... Вецер! Яна і цяпер пачула яго, бо ўжо стаяла на той мяжы. І як калісьці, павалілася, упала, распласталася...

— А-а-а-а... А-а-а-а... — паспрабаваў рассунуць густую цемрадзь яе стогн, але не разляцеўся рэхам, перайшоў у надрыўны плач. А побач у яры шумеў, свістаў, шугаў вецер. І яна пасунулася па слізкім месіве зямлі і пажухлай, пасохлай травы на самы край. — О-о-о, ветрыку!.. Ці чуеш ты мяне? Ці пазнаў?! Ты ж абвейваў мяне на гэтым палетку, калі я тут лецейка ў лецейка шчыравала, потам умывалася... Ты патыхаў халадком, калі садзілася перадыхнуць пад куст вербалозу і сваім лёгенькім павевам лашчыў мяне... — яна глыбока ўздыхнула, колькі змагла набрала халоднага паветра ў грудзі і выдыхнула са словамі: — Пакарай басяка! Адпомсці! І яму, і дзецям ягоным калісьці, пакажы сваю сілу!.. Усяму роду ягонаму! Не ведай ніякай літасці! Раздушы, раструшчы, каб у нас забранае на бяду ішло, бокам вылазіла...

Ванда наструнілася і ўздрыгнула, азірнулася... Ззаду ля яе са світкай у руках стаяла старая Анэля.

— Уставай, Вандачка! Падымайся, родненькая! — заламантавала яна. — На сырой зямельцы ляжыш! Вядома, што бокам вылезе... А зараз супакойся... Душачку сваю не разжалобвай... Я па тваіх слядочках ішла... Во-о і світка, і хустка цёплая ў рукаве. Я ўжо баялася, каб ты ў роў гэты не ўкінулася. Знявечылася б уся! Падымайся... Дзень страшны быў, дзеці без цябе ў ложак не кладуцца... Паслухайся, не ляжы, здубянееш!

І Ванда паднялася. Азяблымі рукамі, растапыранымі пальцамі, якія не слухаліся яе, узяла світку, выцягнула з рукава хустку... Усю яе біла дрыготка.

— Бедная... Бедная...— трэсла галавою Анэля. — Ты ж скалела дарэшты... Хутчэй, Вандачка, хутчэй світку нацягвай... О-о, як вецер яе за краечкі рве!

— Угу-у, угу-у, бачу, што рве, — высільвала з сябе Ванда, нацягваючы на плечы світку. — Моцна рве, знак такі падае... Ён пачуў, пачуў мае словы, ён усё зразумеў... І зараз, во-о, хоча сказаць мне пра гэта...

Арт-пацеркі

Далёка за межамі Беларусі вядомы Брэст сваімі "Студзеньскімі музычнымі вечарамі". Сёлета гэты міжнародны фестываль — юбілейны, зладкаваны ўжо 20-ты раз. Дзякуючы энтузіязму Ліліі Батыравай, старшыні Брэсцкага абласнога аддзялення Беларускага саюза музычных дзеячаў і абласнога музычнага таварыства, "Студзеньскія музычныя вечары" зноў сабралі цікавых гасцей. У горад над Бугам накіраваліся прадстаўнікі каля паўтара дзесятка краін: музычныя калектывы і салісты з Аўстрыі, Венгрыі, Нідэрландаў, Італіі, Кітая, Партугаліі, Расіі... У ліку выканаўцаў і заўсёдныя ўдзельнікі брэсцкага фестывалю — стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі.

Да 40-годдзя з часу адкрыцця першай экспазіцыі Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі прымеркаваная выстаўка, якая адкрылася тут 9 студзеня. "З крыніц адвечнай прыгажосці" — пад такой назвай экспануецца адна з найцікавейшых калекцый: дзякуючы ёй можна прасачыць развіццё старадаўніх традыцый апрацоўкі золата і срэбра, пачынаючы ад I-II стагоддзяў нашай эры і да сённяшняга дня. Разнастайныя археалагічныя знаходкі з каштоўных металаў нібы распавядаюць гісторыю ювелірнай справы на землях беларускіх: у калекцыі

музея ёсць такія рарытэты, як залаты бранзалет XII ст. з раскопак Мінскага замчышча, залатыя пацеркі таго ж часу з раскопак, праведзеных у Навагрудку. Багата прадстаўлены прадметы рэлігійнага культу, абразы, літургічны посуд XVI — XIX стст. У экспазіцыі ёсць знаходка, вакол якой вяліся размовы і навукоўцаў, і аматараў даўніны. Гэта помнік тарэўцікі першай траціны XVI ст. — парадны пояс, які быў знойдзены блізу вёскі Літва на Маладзечаншчыне і да нядаўняга часу знаходзіўся ў прыватнага ўладальніка. Мяркуецца, што пояс, выраблены ў Крымскім ханстве, быў падораны ханам Хаджы-Гірэем Літоўскаму князю. Наведнікаў выстаўкі зацікавяць і грашова-рэчавыя скарбы, і помнікі нумізматыкі, і ўзоры памятных залатых ды срэбных манет, якія ў нашы дні выпускае Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь.

50-годдзе мастака Валерыя Шкарубы Нацыянальны мастацкі музей Беларусі адзначыў яго персанальнай выстаўкай. У экспазіцыю ўвайшло каля паўсотні твораў — пераважна гэта краявіды Беларусі. З першага позірку на яго палотны знаўцы жанру адчуваюць, што В. Шкаруба не проста піша пейзажы, а нібыта стварае бясконцую серыю партрэтаў роднай прыроды — адухоўленых, таямнічых. Настолькі самадастатковых у сваёй змястоўнасці, што мастаку зусім не трэба дадаваць у кампазіцыю выяву чалавека, як гэта часам робіцца дзеля "псіхалагізацыі" карціны.

С. ВЕТКА

Фота Віктара Кавалёва

Натхнёная музыкай

Да 100-годдзя з дня нараджэння Ларысы Аляксеевай

Толькі 8 гадоў на небасхіле беларускага опернага мастацтва ззяла яркая зорка Ларысы Аляксеевай. Але за гэты час спявачка паспела зрабіць значны ўнёсак у гісторыю станаўлення музычнай культуры Беларусі. Прадстаўнікі старэйшага пакалення прыхільнікаў мастацтва і цяпер з асаблівай цеплынёй успамінаюць Ларысу Філалогаўну, яе цудоўны голас.

Ларыса Аляксеева родам з Украіны. З 1926 па 1930 гг. жыла ў Якуціі, была замужам за героем грамадзянскай вайны І. Аляксеевым, які памёр ва ўзросце 27 гадоў. Ларыса Філалогаўна працавала ў Якуціі выхавацелем дзіцячага дома. Дзякуючы яе ініцыятыве там былі арганізаваныя харавы і драматычны гурткі. Сама яна пачала выступаць у канцэртах ды іграць у спектаклях рускага народнага тэатра — з марай атрымаць музычную адукацыю і прысвяціць сваё жыццё мастацтву. Мара ажыццявілася ў 1930 годзе, калі Ларыса Аляксеева паступіла ў Музычны тэхнікум імя Гнесіных у Маскве і паспяхова скончыла яго ў 1936-м.

У 1937 — 1941 і 1944 — 1946 гадах Л.Аляксеева працавала салісткай Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Вялікая музыкальнасць, прыгожы па тэмбры голас адразу ж прыцягнулі да сябе ўвагу слухача. Адметнай падзеяй на беларускай опернай сцэне быў дэбют спявачкі ў партыі Марфы ("Царская нявеста" М. Рымскага-Корсакава). Бездакорная музычная культура і сапраўдны артыстызм Л. Аляксеевай паспрыялі стварэнню кранальнага вобраза, дазволілі ёй данесці харастро гэтай партыі да сэрца слухача. У 1939 годзе яна выканала ролю Панначкі ў оперы А. Багатырова "У пушчах Палесся". Паспяхова ўдзельнічала Л.Аляксеева ў Дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

У гады Вялікай Айчыннай яна выступала на сцэне Вялікага тэатра ў Маскве, Ленінградскім імя Кірава (у Пермі) і Свярдлоўскім тэатрах оперы і балета; з канцэртнымі брыгадамі прайшла па дарогах вайны, спявала беларускія народныя песні; актыўна ўдзельнічала ў перадачах радыёстанцыі "Савецкая Беларусь" (г.Масква). У 1944 г. атрымала званне народнай артысткі БССР.

Пасля вызвалення Мінска Ларыса Філалогаўна яшчэ тры гады працавала на сцэне беларускага опернага. Гэта быў час творчага росквіту спявачкі. Яна віртуозна валодала сваім пяшчотным лірыка-каларатурным сапрана, з аднолькавым поспехам выступала і ў італьянскай, і ў рускай опернай класіцы, і ў ролях беларускіх гераінь. У першым, яшчэ пад раяль, выкананні оперы Я. Цікоцкага "Алеся" (Мінск, 1944) Л.Аляксеева стварыла вобраз Марфачкі. Захапляла публіку яе Разіна ў "Севільскім цырульніку" Д. Расіні, асабліва ў славутай каваціне. Спявала яна Джыльду, Віялету ("Рыгалета" і "Травіята" Д.Вердзі), Мікаэлу ("Кармэн" Ж.Бізэ), Джульету ("Рамэо і Джульета" Ш.Гуно). У операх Вердзі перадавала яркія і моцныя перажыванні гераінь ды меладыйнае багацце іх партый. Дарэчы, калі ў дні вайны Ларыса Аляксеева спявала партыю Віялеты ў Ленінградскім тэатры оперы і балета імя С. Кірава, крытыка адзначала: "Упершыню на сцэне тэатра імя Кірава ў партыі Віялеты выступіла Л.Аляксеева. Радасна было слухаць гэтую спявачку, якая валодае выключна прыемным голасам, мяккага, надзвычай пяшчотнага тэмбру. Добрая школа, музыкальнасць, дакладнасць выканання даюць ёй магчымасць лёгка, без напружання перадаць вакальна і сцэнічна складаную ролю Віялеты".

Нягледзячы на пераважанне ў рэпертуары спявачкі італьянскіх і французскіх опернх партый, якімі яна валодала дасканала, Л.Аляксеева праявіла сябе як выхаванка рускай вакальнай школы і традыцыі рускага каларатурнага спявання. Самай значнай партыяй, якую выканала спявачка на беларускай опернай сцэне, была партыя Марфы ў оперы М. Рымскага-Корсакава "Царская нявеста". Спяванне артысткі вызначалася псіхалагічнай глыбінёй і цёплай чалавечнасцю, характаром шчырага жаночага сэрца. Надзвычай блізкім душэўнаму свету і думкам выканаўцы стаў вобраз казачна-рэальнай Снягурачкі ў аднайменнай оперы М. Рымскага-Корсакава. Ларыса Філалогаўна як натхнёны мастак раскрыла ў Снягурачцы ўласную паэтычную тэму, якую і пранесла праз усе свае оперныя вобразы.

Канцэртны рэпертуар Л.Аляксеевай быў вельмі багаты. Яна выконвала беларускія, рускія, украінскія, чэшскія, польскія народныя песні. У гэтым жанры ёй аднолькава былі блізкія лірыка і гумар. Артыстка спявала жартоўныя "Грушу" і "Бульбу", гумарыстычныя "Падушачку" і "Польку-Янку". У свае канцэртныя праграмы ўключала таксама песні і рамансы А. Багатырова, П.Падкавырава, Р. Пукста, іншых беларускіх кампазітараў. Камернае канцэртнае выканальніцтва, як і опернае, было часцінкай яе паэтычнай душы.

У зеніце поспеху Л. Аляксеева мусіла пакінуць мінскую сцэну — так распарадзіўся лёс. Яна жыла і працавала ў Маскве (з 1946 па 1948 гады — салістка Вялікага тэатра, з 1950 па 1954 — салістка Маскоўскай філармоніі). Але не парывала сувязь з беларускім оперным і сябрамі-мінчанамі. Ва ўзросце васьмідзесяці гадоў Ларыса Філалогаўна прысутнічала на святкаванні паўвекавога юбілею Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР і была сярод самых шаноўных гасцей.

Памерла Л.Аляксеева ў Маскве на 91-м годзе жыцця. Веліч і прывабнасць таленту спявачкі дазваляюць гаварыць пра яе як пра адну з самых яркіх з'яў у беларускім оперным мастацтве свайго часу.

Наталля САКАЛОЎСКАЯ,
вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва

Клас Качарскай

"Пішу гэтыя радкі, апярэджваючы адметны канцэрт-сустрэчу... Сёння будуць іграць творчыя аднадумцы, паяднаныя асобай педагога-музыканта. Гэта канцэрт-прынашэнне ўлюбёнаму настаўніку за яе акрыленасць музыкай, нястомнае імкненне весці ў свет цудоўнай прафесіі фартэпіяннага выканальніцтва кожнага, каму пашчасціла адкрыць чарадзейныя дзверы ў яе клас...".

Адкуль цытата? Са звычайнай філармнічнай праграмкі. Яна змяшчае шчырае слова заслужанага дзеяча мастацтваў краіны, прафесара кафедры фартэпіяна Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Валянціны Рахленкі, якое сталася для публікі ўводзінамі ў атмасферу творчага вечара, прысвечанага юбілею прафесара Зоі Качарскай. Аўтар тых цёплых радкоў адзначае трыадзіны талент сваёй малодшай калегі — талент чалавека, музыканта, педагога. Разважае пра канцэрты яе класа, якія з'яўляюцца вельмі цікавымі і значнымі падзеямі ў мастацтве. З гонарам прыгадвае, што ў час свайго загадвання кафедрай спецыяльнага фартэпіяна падтрымала глыбокую любоў З.Качарскай да педагагічнай працы, яе ўменне стварыць у класе такую атмасферу, што спрыяе максімальнаму раскрыццю творчай індывідуальнасці вучня, яе здольнасць цаніць і весці малады талент да ўсё больш высокіх выканальніцкіх дасягненняў. І дадае: "Можна з упэўненасцю сказаць, што яна ўстала ў адзін шэраг з тымі, хто стварыў фартэпіянную школу Беларусі." Дарэчы, у 1990-я гады і самой З.Качарскай давялося ўзначальваць кафедру спецыяльнага фартэпіяна...

Падчас яе юбілейнага вечара, што праходзіў у Беларускай дзяржаўнай філармоніі, у Малой зале імя Р. Шырмы, міжволі падумалася: як па-рознаму можа гучаць адзін і той жа раяль! Замілавана і непасрэдна — у Моцартавай Санаце рэ мажор для двух фартэпіяна, у дуэце Аксаны Стахіевіч ды Віталя Стахіевіча. З класічна дасканалай чысцінёй — у Ронда До мажор Бетховена, "па-інтэлігенцку", з далікатнай усмешкай на ціхім сыходзе апошніх фраз, інтэрпрэтаванае Аляксандрам Музыкантавым. Капрызліва-рамантычна — у Трох п'есах-фантазіях Брамса, прадстаўленых Марынай Русаковай. Дзівакавата і з дасціпнай "прэтэнзіяй" — у "Серэнадзе in A" Стравінскага, якую выканаў Сяргей Вайніцкі. А яшчэ адчуваўся ў тэмбры раяля імпрэсіяністычны каларыт, раскрыты Наталляй Паповай праз "Эстампы" Дэбюсі: "Пагады", "Вечар у Трох Гранадзе", "Сады пад дажджом"... І драматызм Шапэнавага аповеду ў Фа мінорнай баладзе, прачутай і перажытай Віталем Стахіевічам. І экзатычны тэмперамент інтанацый "Скарбо" Равеля з рэпертуару Эльміры Сейфулаевай. І звонкая святлынь "аркестравай" фактуры Вальса Ля-бемоль мажор Напалеона Орды ў рэдакцыі З. Качарскай і ў выкананні Ганны Храпко ды Таццяны Чыгорскай: здавалася, што ў танцавальных сугуччах зліліся галасы салонаў XIX стагоддзя, і поліфанія стагоддзя мінулага, такога нядаўняга, і няпэўны павеў сённяшняга дня...

Апафеозам канцэрта, зладкаванага вучнямі З. Качарскай (выпускнікамі акадэміі, аспірантамі, цяперашнімі студэнтамі), сталася прэм'ера. Сапраўдны сюрпрыз: два раялі (адзін "у вобразе" класічнага інструмента, другі — джазавага) — Алена Вашкевіч, Аляксандр Музыкантаў, кантрабас — Андрэй Барнаў ды ўдарныя — Сяргей Буранаў. Для такога ансамбля напісана Саната №2 французскага джазавага піяніста і кампазітара К.Балена (р. 1930). Слоў не хопіць, каб перадаць, які асляпляльна эфектны нумар стварылі, віртуозна, артыстычна і з гумарам увасобілі нашы музыканты!

Непаўторнасць піяністычнага мастацтва вучняў — пераканальнае адлюстраванне багатай і складанай творчай натуры натхнёнага Настаўніка. Зоя Качарская мае сапраўдны дар нябёсаў: яна ўмее запальваць зоркі, ёй гэта наканавана. (Хаця ў свой час у таленавітай выпускніцы Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, з досведам стажыровак у маскоўскіх прафесароў, паспяхова складвалася і сольная кар'ера, запісваліся праграмы на радыё, на БТ). Сузор'е класа Качарскай ззяе далёка за межамі Беларусі. Яе вучні працуюць у Італіі, Францыі, Іспаніі, Чэхіі, Расіі... Многія — лаўрэаты міжнародных конкурсаў. Гадзінамі можа распавядаць пра іх. Успамінаць. Як Саша Музыкантаў сваё першае радыёінтэрв'ю ў якасці пераможцы міжнароднага конкурсу пачаў з падзякі бабулі за тое, што некалі вадзіла яго, малога, у Асіповіцкую музычную школу: бацькі былі занятыя на працы. Як Віталік Стахіевіч, што разам з жонкай наведваецца ў Мінск з Нідэрландаў, паказвае свае вершы і музычна-крытычныя артыкулы, напісаныя па-беларуску. Як Наташа Папова марыла ўдасканальваць сваё майстэрства ў Нарвегіі і з першай жа спробы выйграла конкурс на месца канцэртмайстра тамтэйшай Вышэйшай музычнай школы, а прэтэндавала на яго 14 чалавек... "Яны ўсе цудоўныя. І розныя. Да кожнага характару — асаблівы падыход. Мне проста шанцуе на вучняў".

Канцэрт, які з натхненнем вяла Іна Зубрыч, быў арганізаваны пры ўдзеле некамерцыйнага прадзюсерскага цэнтра "Класіка" Беларускага саюза музычных дзеячаў і прайшоў з аншлагам.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Фота аўтара

Святлынь старонкі роднай

(Працяг. Пачатак на стар. 1)

Творчыя апаненты Віктара Барабанцава крытыкуюць яго за традыцыяналізм, за "сац-артавую" манеру пісьма, нават... за празмерную пладавітасць у працы. І пры гэтым забываюцца на вядомую мудрую параду: мастака можна судзіць толькі паводле творчых законаў, прыдуманых ім самім. Зрэшты, калі мастацкая з'ява ўспрымаецца неадназначна і выклікае спрэчкі, значыць — гэта жывое мастацтва, здатнае "зачапіць" усіх неабыякавых, настроіць на палемічны лад.

Так, мастацтва Віктара Барабанцава — жывое і сумленнае. Шчырае, самавітае і некрыклівае. Арганічна ўкаранёнае ў беларускі менталітэт з яго даверлівай простасцю, наіўна-казачнай філасофіяй, глыбіннай талерантнасцю і адвечнай таямніцай. Моцна ўгрунтаванае ў традыцыі акадэмічнага жывапісу.

Вобразны змест яго палотнаў празрысты, светлы і рэалістычны, форма "размовы з гледачом" выразная і даходлівая. А маляўнічае суладдзе лепшых работ нібыта працінаюць чыстыя промні той адухоўленасці, што чалавеку зямному (і далёка не кожнаму з творцаў) даецца звыш. Мабыць, таму, апынуўшыся ў шчыльным асяроддзі жывапісу В.Барабанцава, міжволі заўважаеш, наколькі выразнымі, жывымі выглядаюць на яго палотнах самыя старажытныя і вечныя "матэрыі": неба, вада ды аблокі, што злучаюць неба і ваду. Кранальная прасветленасць у гэтых напоўненых сонцам аблоках, у азёрным прасцягу, які адлюстроўвае спакой нябёсаў ("Возера Вішнева")...

Са шчырым замілаваннем піша мастак і ўлюбёныя куткі беларускай прыроды, і краявіды з архітэктурнымі помнікамі. Нярэдка ўлучае ў пейзажнае асяроддзе дынамічныя жанравыя сцэнкі народных святаў, выявы вядомых людзей: "Сустрэча ў Баярах", "Свята ў Міры", "Заслаўе. Каляды", "Святочны дзень", "На зямлі бацькоў.(Партрэт Яраслава Пархуты)".

Дарэчы, пра партрэты. У манументальных жывапісных фрэсках і мазаічных работах Віктара Барабанцава ўвасоблены гістарычныя постаці Кірылы Тураўскага, Еўфрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, Сымона Буднага, іншых беларускіх асветнікаў, выдатных дзеячаў айчыннай культуры, песняроў роднай зямлі. Юбілейную выстаўку мастака ўпрыгожвае трыпціх "На радзіме. Максім Багдановіч", які здалёк прываблівае знаёмым рамантычным абліччам: задуменны паэт, атулены вясновай квеценню; абапал цэнтральнага палатна — панарамныя краявіды "Мелодыя траў" ды "Гукі палёў". Аглядаючы экспазіцыю, нават без падказак-подпісаў пазнаеш партрэты вядомых літаратараў, дзеячаў тэатра, музыкантаў, мастакоў. Леанід Шчамялёў, Гаўрыла Вашчанка, Уладзімір Карызна, Андрэй Мдзівані, Аўгуст Мілаванаў, Аляксей Дудараў, Нінэль Шчасная, Ніл Гілевіч, Мікалай Кірычэнка, Людміла Рублеўская... Не фатаграфічнае падабенства, а нейкія няўлоўна характэрныя штрыхі робяць іх твары пазнавальнымі для гледача.

Між іншым, віншуючы свайго малодшага калегу і вучня з юбілеем і з вернісажам, народны мастак Беларусі Гаўрыла Вашчанка прылюдна падкрэсліў: "Вельмі рэдка цяпер з'яўляецца на выстаўках такі жанр, як партрэт. Віктар Барабанцаў запоўніў гэты жанравы прагал і зрабіў партрэтную галерэю знаных беларусаў".

З вялікай сімпатыяй да творчасці юбіляра выказаўся падчас урачыстага адкрыцця выстаўкі драматург Аляксей Дудараў: "У нас не такая вялікая краіна, не так багата ў ёй людзей. Але чамусьці мы можам больш распавесці пра замежжа, чым пра родны кут. А ў работах Віктара Барабанцава — амаль уся Беларусь, з яе краявідамі і асобамі. І я маю гонар быць прадстаўлены тут выявай. Гэта не фотаздымак, а жывапісны твор, праз яго ўспрымаеш сябе іншым — у позірку мастака, які мае талент бачыць больш за тое, што чалавек сам пра сябе ведае".

Безумоўна, у пэўным сэнсе выстаўка "Спадчына" паказала і аблічча самога В.Барабанцава (ды і аўтапартрэт у каларытным беларускім брылі на ёй прадстаўлены). А істотны штрых да творчага партрэта мастака дадала Галія Фатыхава, якая працавала над яго альбомам, выдадзеным у 2004 годзе. Яна прыгадала, з якім шчырым душэўным болем успрыняў Віктар Барабанцаў чарнобыльскую трагедыю. Першы з нашых мастакоў наведваўся ў зону, ствараў уражлівы мастацкі аповед у карцінах пра пакінутую зямлю, атручанае жыццё, знявечаны лёс беларускіх вёсак, пацярпелых ад "мірнага" атама...

Процістаіць гэтай, можна сказаць, адзінай змрочнай, чорнай тэме ў жывапісе В.Барабанцава, лаўрэата прэміі "За духоўнае адраджэнне" (2000 год) самая ўзнёслая старонка яго творчасці: манументальныя работы на хрысціянскую тэматыку, якімі аздоблены праваслаўныя храмы Беларусі.

Віншуючы юбіляра, госці вернісажа распавядалі пра яго педагагічную і грамадскую дзейнасць, прыгадвалі ўзнагароды, пералічвалі персанальныя і калектыўныя выстаўкі, у якіх удзельнічалі работы Віктара Барабанцава, называлі многія краіны, дзе знаходзяцца палотны беларускага майстра. І — зычылі гэтаму надзвычай светламу чалавеку здзіўляць гледачоў высокім духоўным святлом сваіх новых палотнаў.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: творы В. Барабанцава; юбіляр (у цэнтры) з мастакамі Г. Вашчанкам і С. Цімохавым; выступае Г. Фатыхава.

Фота Віктара Кавалёва

Помніцца...

Споўнілася сто гадоў з дня нараджэння выдатнага беларускага скульптара, народнага мастака СССР Заіра Азгура

Ён пакінуў на зямлі прыгожы след. Колькі самых розных людзей увасобілася ў па-мастацку дасканалых скульптурных выявах, колькі выразных помнікаў з'явілася, дзякуючы майстэрству Заіра Азгура! Колькі унікальных дэталізаваных эпізодаў гісторыі айчыннай культуры, трапных назіранняў засталося на старонках яго ўспамінаў — прынамсі, мемуараў "Тое, што помніцца...", якія складаюцца з пяці захапляльных кніг. Кнігі таксама — помнікі. Азгур успамінаў, напамінаў. Сёння ўспамінаем і мы...

Лімаўцы ўспрымалі яго як старэйшага, надзвычай дасведчанага і мудрага сучасніка, дзівіліся на яго эрудыцыю, жывы, дапытлівы і дасціпны розум, аптымістычны светапогляд, зычлівасць, энергічнасць і працаздольнасць, таварыскасць і простасць у стасунках. Заір Ісакавіч заходзіў у рэдакцыю часта. Заўсёды элегантны: цёмны касцюм, артыстычны бант пад каўнерыкам кашулі, нязменны берэт, з-пад якога рамантычна выбіваліся доўгія серабрыста-белыя пасмы. Ён прысаджваўся, скрыжаваўшы дужыя працавітыя рукі на драўляным дзяржанні моцнага падарожнага кійка, распытваў, распавядаў... Пасля такога візіту ў "ЛіМе", бывала, з'яўлялася публікацыя З.Азгура на актуальную надзённую тэму або згадкі з колішняга мастацкага жыцця Беларусі. Да яго публіцыстычных выступленняў у друку прыслухоўваліся: народны мастак, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, узначальваў Беларускі рэспубліканскі фонд міру, абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Яго ўспамінамі зачытваліся: з мастакоўскай назіральнасцю Заір Ісакавіч адлюстроўваў дух часу, распавядаў пра вядомых людзей.

Перакананы рэаліст у творчасці, выхаваны на антычных, акадэмічных ідэалах, ён выдатна валодаў прафесіяй: прайшоў школу легендарнага Віцебскага мастацкага тэхнікума, вучыўся ў Ленінградскім вышэйшым мастацкім інстытуце, у Кіеве. Неверагодны творчы тэмперамент засцерагаў майстра ад прастояў і крызісаў: нават калі было яму за 80, Азгур спраўна, пераадольваючы немач, наведваўся ў майстэрню, бо ўжо самі рукі не маглі жыць без працы.

Пра станковыя скульптуры і помнікі, створаныя З. Азгурам (яго творы паўставалі, дарэчы, і ў розных гарадах былога СССР), падрабязна расказваюць энцыклапедыі. Палітычныя дзеячы Арджанікідзе і Фрунзе, палкаводзец Багратіён, пісьменнікі Змітрок Бядуля і Кандрат Крапіва, спявачка Ларыса Александроўская і акцёр Уладзімір Дзядзюшка, лідэр нацыянальна-вызваленчага руху Кастусь Каліноўскі (помнік устаноўлены ў мястэчку Свіслач, на Гарадзеншчыне), партызан Васіль Талаш (расказвалі жартам, што дзед Талаш нібыта прасіў скульптара: "Заірка, зрабі мяне, як Карла Маркса, з шабляй, на белым кані!")... Вельмі, вельмі розныя асобы. Але ў кожным разе — жывыя і характарныя партрэты.

Скульптару, якому давяралі самыя адказныя дзяржаўныя заказы, давялося перажыць і драматычныя моманты, калі яго "афіцыйныя", але прытым высокамастацкія работы рабіліся ахвярамі радыкальных палітычных перамен. У пачатку 60-х быў узарваны манументальны помнік Сталіну на Цэнтральнай плошчы Мінска, праз 30 гадоў — зніклі новыя скульптурныя партрэты Маркса і Леніна, што зусім нядоўга прастаялі на пастаментах ля параднага ўваходу ў будынак ЦК КПБ. Працуючы над бюстам Пятру Машэраву (устаноўлены ў Віцебску), майстар балюча перажываў умяшальніцтва "цэнзараў", якія патрабавалі "прыбраць" неад'емную і псіхалагічна значную частку помніка — выразна вылепленыя рукі.

Гранітны бюст Рабіндраната Тагора, партрэт Алены Аладавай, ансамбль на плошчы Якуба Коласа — ужо класіка. Летась, калі адзначаўся юбілей Купалы і Коласа, мы прыгадвалі першую кнігу Заіра Азгура "Тое, што помніцца...". З цягам часу ўспаміны і назіранні чалавека, якому давялося прайсці вялікі жыццёвы шлях (пражыў 97 гадоў!), сустракацца ці супрацоўнічаць з многімі цікавымі асобамі, набываюць асаблівую каштоўнасць. І ў год, калі адзначаўся юбілей карыфеяў беларускай літаратуры, цікава было перачытаць згадкі пра Янку Купалу і Якуба Коласа, з якімі З. Азгура звязвала доўгае сяброўства.

Помніцца, як адкрылася яго акадэмічная майстэрня (цяпер — Мемарыяльны музей З. Азгура). Пабываўшы там, падзяліліся ўражаннямі з чытачамі "ЛіМа": пра дзіўнае пачуванне сябе сярод постацяў, фігур, статуэтак, бронзавых і гіпсавых твараў; пра ўражлівыя партрэты кампазітара Яўгена Глебава, пісьменніка Алеся Адамовіча, старажытнага філосафа Ягуды Галеві; пра жывапісныя партрэты бацькоў скульптара (З. Азгур нарадзіўся ў сям'і балагола — рамізніка, на Сенненшчыне).

Заір Ісакавіч прачытваў кожны нумар нашага тыднёвіка і заўсёды меў што сказаць пра "ЛіМ". Ён доўгія гады ўваходзіў у склад рэдкалегіі. І помніцца такі штрых. На пачатку 1990-х у перадбудовачны час калектыў тыднёвіка вырашыў адмяніць стары дэвіз, пад якім выходзілі ўсе газеты ў СССР, — "Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!". Аднак патрабавалася адпаведнае рашэнне рэдакцыйнай калегіі. Яе пасяджэнне прайшло з удзелам супрацоўнікаў "ЛіМа", і тады менавіта голас З. Азгура, яго аўтарытэт істотна паўплывалі на агульнае рашэнне: недарэчны для "ЛіМа" дэвіз быў зняты. А на яго месцы з'явіўся Купалаў радок: "Людзьмі звацца!".

З днём нараджэння З. Азгура звычайна віншавалі 2 студзеня. Паводле новага летазлічэння гэты дзень прыпадае на 15-га. І сёлета менавіта 15 студзеня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася выстаўка, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Майстра. Прадстаўлена каля 200 экспанатаў, у тым ліку яго кнігі, альбомы, выданні, дзе ён выступаў як рэдактар, аўтар прадмоў і нават ілюстратар, каталогі выставак, фатаграфіі. Назвай выстаўкі сталі словы З. Азгура: "Я веру ў творчы пачатак Сусвету...".

С. Б.

Рэфлексія спасціжэння Радзімы

На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Слова было Богам. // Яно было на пачатку ў Бога: // усё праз Яго пачалося, і без Яго нішто не пачалося з таго, што пачало быць. // У Ім было жыццё, і жыццё было святлом людзей. // І святло ў цемры свеціць, і цемра не агарнула яго... // Было Святло сапраўднае, Якое прасвятляе кожнага чалавека, што прыходзіць у свет. // У свеце было, і свет праз Яго пачаў быць, і свет Яго не пазнаў; // прыйшоў да сваіх, і свае Яго не прынялі; // а тым, якія прынялі Яго, веруючым у імя Яго-нае, даў уладу быць дзецьмі Божымі, // якія не ад крыві, ні ад хацення плоці, ні ад хацення мужа, а ад Бога нарадзіліся. // І Слова стала плоццю, і ўсялілася ў нас, поўнае мілаты і праўды; і мы бачылі славу Ягоную, славу, як Адзінароднага ад Айца. // Ян сведчыць пра Яго і, усклікаючы, кажа: // Гэта быў Той, пра Якога я сказаў, што Той, Хто ідзе за мною, // апярэдзіў мяне, бо быў раней за мяне...

Паводле Яна. Святое Дабравесце

На пачатку было Слова

На пачатку было слова. І слова было ў Бога. І слова было — БЕЛАРУСЬ.

Не, гэта не святатацтва і не блюзнерства. Гэта праўда. Звыклая, святая. Як свет, адвечная праўда.

Бо і сапраўды на пачатку ўсяго нашага, беларускага, было слова *Беларусь*.

І словам тады была Беларусь. У ім, у слове гэтым, бруіла і пульсавала жыццё. Быў сэнс для жыцця, і было жыццё многіх і многіх людзей і пакаленняў, якія намагаліся ўвасобіць слова ў справу. І слова тое станавілася жыццядайным промнем, нязгасным знічам у змроку, поклічнай паходняй на шляху з цемрадзі да святла.

І было яно сапраўдным і праўдзівым святлом, якое сваёй усяіснай пранікальнасцю прасвятляе, ажыўляе і ператварае кожнага, хто да яго датыкаецца альбо з ім судакранаецца, хто імкнецца да яго, прагне яго, як здарожаны і знябожаны вандроўнік прыпадае да ратавальнай крынічкі, глытком асвяжальнай вады аднаўляе свае сілы — каб далей ужо без святла гэтага не жыць.

І слова тое станавілася плоццю, увасаблялася, учалавечвалася ў душы людзей. Душа ж людская — несмяротная. Значыць, і слова святое *Беларусь* насычалася несмяротнасцю.

Але на самым пачатку пачаткаў слова гэтае апераджала людзей і справы, і памкненні іхнія, бо было раней за іх, раней за плоць і свядомасць іхнюю. І як Дух насіўся над бясплоднай пустыняй, так і слова, набрынялае існасцю, ускрыленае надзеяй, насілася над светам, пакуль не знайшло прыстанішча свайго, пакуль ад Бога не нарадзілася і не апусцілася на зямлю белакрылай птушкай — і абжыло яе, і духам сваім ажывіла, і адметнасцю сваёй пазначыла.

Калі ж набыло жывую плоць — сталася Бацькаўшчынай, Айчынай, калыскай, краем і загонам родным, зямлёю тутэйшай, ператварыла яе ў палетак засеяны, і дагнала тое, што апярэджвала людзей і дзеі іхнія, і пераўвасобіла безыменнасць ягоную ў рэальнасць і дадзенасць з найменнем зразумелым, непаўторным, дарагім і адзіным на ўвесь свет — Беларусь.

І там, дзе шчырасцю сваёй парушыўся пра справу беларускую і адзін, і другі, і трэці, справа святая паўстала.

Праўду, праўду кажу табе — так было на пачатку. Як сведчыць Біблія: "Дух дыхае, дзе хоча, і голас ягоны чуеш, а не ведаеш, адкуль прыходзіць і куды сыходзіць: так бывае з кожным, народжаным ад Духа".

Так было і са словам родным *Беларусь*.

Калі ж завалодала яно тымі, хто паверыў у яго, хто прыхінаўся да яго, як да найпершага жыццёвага апірышча, сталася тады слова сутнасцю і рэальнасцю іхняй, гісторыяй і днём сённяшнім, надзеяй і будучыняй.

А хто паверыў у яго, той здабыў жыццё вечнае, як вечнасцю надзелена зямля беларуская, дадзеная нам Богам.

І пачалі людзі будаваць дом свой — беларускі дом, запаўняць прагал у бязмежнасці космасу. На той зямлі пад валошкавым небам, якую Бог дараваў ім і якую блаславіў. І рос, узвышаўся дамок у калысцы сусвету нароўні з усімі, хто побач і вакол жыў.

І ўсё новыя прыхільнікі слова таго станавіліся беларусамі, набывалі і засвойвалі адметнасць сваю, мацавалі веру ў яго збаўчую сілу, каб духам сваім і дзеямі захаваць дабрадзейнасць зямлі беларускай, якая гаючымі крыніцамі з-пад сэрца Зямлі жывілася, а тыя ж, хто прытуляўся да духу святога беларускага і насычаўся ім, шукалі прытулку душы не таму, што бачылі цуды на гэтай зямлі і квапіліся на багацці і даброты яе, а таму, што карцела засеяць яе зернем, каб есці хлеб зямліцы гэтай маглі новыя спавядальнікі і шанавальнікі слова беларускага. Каб спагадалі "не пра ежу прахлую, а пра ежу, што застаецца на жыццё вечнае". Гэткую спажыву давала толькі тое адзінае і сапраўды святое слова з назовам нязгасным — Беларусь.

Гэта і ёсць хлеб жыцця, бо сказаў Ісус: "Я ёсць хлеб жыцця; хто прыходзіць да Мяне, не будзе галодны, і хто верыць у Мяне, не спрагнецца ніколі".

Дык ідзіце ж да хлеба нашага штодзённа святога, і насычайцеся ім, і карміце дзяцей сваіх, і сейце зерне новае для хлеба таго, імя якому — Беларусь. І ўзвышайце працай сваёй, і гартуйце духам нязломным, і асвятляйце святлом непагасным з вышыняў. Каб усе ўбачылі святло і паверылі ў незнішчальную і давечную існасць ягоную, і не баяліся, што адгоніць яно прэч — як малаверных, альбо няверных, альбо сумніўных, альбо зусім аслеплых. І для такіх дух беларускі пануе над зямлёй, засеянай зернем ягоным, каб праз хлеб наш надзённы, "той хлеб, што сышоў з нябёсаў", далучыцца да плоці, да праўды і існасці святой і светлай, увасобленай у несмяротным і простым слове — Беларусь.

І калі наважыцца хто блюзнерыць са слова гэтага, зневажаць нявер'ем, выракацца і насміхацца з дадзенага Богам, не стане ў таго ні сілы, ні духу, ні моцы, ні розуму, не будзе яму ні спагады, ні даравання, акрамя граху і забыцця ўсеагульнага. Бо моц сапраўдная не адно намерамі высокімі створана, не ў словах хваласпеўных хаваецца, а працай стваральнай і нястомнай выпеставана. Не сажнеш там, дзе не пасеяў.

Сейце ж і збірайце столькі хлеба духаноснага, каб дужымі быць і шчодрымі, а не слабымі і хцівымі, каб у веры ўмацавацца, а не знябожыцца ў нявер'і, каб стаць відушчымі, а не сляпымі.

Бо навучацца і спазнаюць ісціну ўсе, хто пазбегне маркоты і няшчырасці, прагнасці і агрэсіўнасці, хто слова, якое было на пачатку, пачуе і панясе яго ў душы сваёй. А хто прыйдзе да яго — стане відушчым і знойдзе апірышча нязломнае ў жыцці. І перастане быць рабом, бо сын у доме сваім застаецца жыць вечна.

Бог абараняў і абараняе тварэнне сваё, па слове Ягоным спраўджанае, — святую і несмяротную Беларусь. З Божае ласкі лунае над нашымі палеткамі і нівамі, барамі і лясамі, рэкамі і азёрамі дух апякункі нашай і заступніцы святой Еўфрасінні Полацкай. Насуперак ліхадзейным ветравеям і спапяляльным вогнепалам шмат стагоддзяў вартуе ён спакой і суладдзе на нашай зямельцы, не дае нам зняверыцца і апусціць рукі.

І ўскрыленыя Божай любасцю, абнадзееныя Ягонай спагадлівасцю дзесяткі, сотні, тысячы беларусаў, з'яднаных адзіным памкненнем, згуртаваных адзінай верай у несмяротнасць Айчыны нашай, выходзілі бараніць дзень заўтрашні. Дзеля нас і да нас звернуты справы іхнія, каб не забылі цябе, Краю родны, каб не сталі чужынцамі на сваёй зямлі, каб не адракліся, не аддалі ў палон.

І нікому-нікому не зацьміць духоўную моц, не адпрэчыць святасць гэтай зямлі. Бо той, хто глынуў вольналюбнага духу святога, хто мае зрок і слых, хто не страціў памяць і чуйнасць, не заблудзіцца, не збочыць, не спалохаецца.

Святы і просты абавязак: берагчы і шанаваць тое слова, што было на пачатку. Шанаваць, ашчаджаць, берагчы і як найвялікшы скарб перадаваць спадчыннікам нашым — каб не звялося яно, беларускае слова, не расцерушылася і не звеялася ветрам у бязмоўнае прадонне сусвету.

Хіба ж не пра тое дбаў наш Мацей Бурачок, калі з усёй шчырасцю маліў-заклінаў: "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!", бо "шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, каторую мову займе, а потым і зусім замёрлі". Пачуйма — і памацнеем, падужэем, акрэпнем і духам, і верай.

Веру ў адзіную, Богам пасланую, святую і непаўторную краіну нашую — Беларусь.

У Айчыну і Бацькаўшчыну народа майго, маіх продкаў і маіх нашчадкаў — веру.

У Радзіму несмяротную многіх і многіх былых і маючых быць пакаленняў, што воляй сваёй і няўтомнай працай, узносячы хвалу Богу, зямлю беларускую стваралі і ствараюць, — веру.

У народ яе, з працы рук сваіх узбагачаны і талентам непаўторным асветлены, цягавітасцю і нязломнасцю пазначаны, непакорай і непадатнасцю ні ворагам, ні злому лёсу ахрышчаны, — веру!

І святло, і палымянасць слова таго — ад пушчанскіх Знічаў з язычніцкіх капішчаў, ад купальскіх кастроў і валошкавых раніцах заранак, ад прасветленай працы нашых першахрысціян, што ахвярнасцю сваёй мацавалі дух, гартавалі волю. Зыркай светласцю запальвае тое слова ратавальныя і ачышчальныя агеньчыкі грамнічных свечак у храмах нашых спрадвечных, што продкамі на зямліцы нашай дабраслаўнай пастаўлены, каб помніць і шанаваць святое Слова Божае і слова ўздымнае — *Беларусь*.

Поклічны ж водбліск тых радаводных агнёў гаючым цяпельцам свеціцца сёння ў спражаных заваёўным полымем прыхадняў замках і палацах, цэрквах і кляштарах, якія паўставалі скрозь на ветравеях гісторыі як гняздоўі беларускай і хрысціянскай славы, што з-за сценаў іхніх ускрыліла на вышыні. І адтуль пазірае на абярэжную свечку Камянецкай вежы, і перагукваецца з ёю, і знітавана з сэрцам кожнага, як галаснікамі гучнымі знітавана з небам непаўторнасць нашая — Барысаглебская цэркаўка на магутнай далоні бацькі Нёмана.

Шчодрым, умалотным, трывалым аказалася даўняе радаводнае сяйво. Ні маразы, ні сонцапёкі, ні бязводдзе, ні залевы, ні нядбальства і абыякавасць не вынішчылі, не высушылі, не звялі на нішто тыя пасевы, не заглушылі пустазеллем і пустаслоўем тое чаканае і жаданае, мілоснае і непаўторнае, тое простае і высокае Слова, якое было на пачатку.

І каласіцца яно сёння, і красуе, і пульсуе жыццём — гэтае Богам нам дадзенае і Богам для нас захаванае слова *Беларусь*, з якога пайшлі і запачаткаваліся мы. З якім жывём і жыцьмем.

Праз вякі, праз вятры, праз нягоды гучыць яно — то ціхім шэптам, то гучным рэхам, то мальбой, то пакаяннем, то заклікам.

Хай бачаць светлазорыя нябёсы, хай гонкім асвяжальным ветрыкам шуміць над зямлёй, хай кажуць народы сусвету давеку: "Беларусь жыве!".

Хай кожны паяднаны са словам святым Беларусь следам за прарокам нашай свабоды і нязводнасці беларускай Янкам Купалам, нязмушана паўтарае, шэпча і выдыхае:

Я буду маліцца і сэрцам,
і думамі,
Распетаю буду маліцца
душой,
Каб чорныя долі
з мяцеліцаў шумамі
Ўжо больш не шалелі
над роднай зямлёй.

Анатоль БУТЭВІЧ

***На здымку:** Свята-Петрапаўлаўская царква ў г. Бярозе Брэсцкай вобласці, другая палова XIX стагоддзя.*

Фота Кастуся Дробава

Віншуем!

Жыццё на ўздыме

Праз усё сваё жыццё мы пранеслі глыбокую павагу і любоў да надзвычай неардынарнай асобы ў нашай беларускай культурнай прасторы, да вельмі цікавага і эмацыянальнага чалавека, да прыгожай жанчыны — Маргарыты Барысаўны Яфімавай.

Усё пачыналася там, у сямідзесятых, з юнацкіх нашых гадоў, якія былі ў жыцці самымі радаснымі, вясёлымі, бесклапотнымі. Ніколі нельга забыць наша першае знаёмства з Маргарытай Барысаўнай, тыя незабыўныя вучэбныя заняткі па выразным чытанні і светлыя, чыстыя радкі Ніла Гілевіча:

Цуд тварыўся — я праспаў:
Снег дасвеццем перапаў
Рана-рана.

І ляжыць ён па дварах,
На парканах, на дравах —
Чысты-чысты.

Для гасцей абрус у нас
Сцелюць гэтакі якраз
Белы-белы...

Маргарыта Барысаўна ўмела не толькі навучыць нас выразнаму чытанню вершаў, мастацкіх тэкстаў, але яшчэ і прывіць любоў да роднага слова. Тую любоў, якой яна жыла і жыве ў нашым чароўным свеце, бо нават і ў штодзённым, будзённым жыцці Маргарыта Барысаўна заставалася заўсёды бадзёрай, радаснай, ветлівай.

Асабліва помняцца гады, месяцы і дні, праведзеныя ў філфакаўскім тэатры-студыі "Летуценнік", заснавальнікам, кіраўніком і рэжысёрам якой з'яўлялася Маргарыта Яфімава. "Паўлінка" Янкі Купалы, "Збянтэжаны Саўка" Л. Родзевіча "Лявоніха на арбіце" А. Макаёнка, шматлікія літаратурна-музычныя кампазіцыі — гэтыя і іншыя пастаноўкі тэатра заўсёды радавалі і захапляюць тагачаснага гледача. Усе ўдзельнікі тэатра-студыі ў сваёй далейшай настаўніцкай прафесіі годна працягвалі і працягваюць лепшыя творчыя традыцыі, закладзеныя Маргарытай Барысаўнай.

А яшчэ Маргарыта Яфімава застаецца адзіным і асноўным удумлівым даследчыкам жыцця і творчасці сусветна вядомага беларускага дзіцячага пісьменніка Янкі Маўра. Яе кніга "Цэлы свет — дзецям" з'яўляецца настольнай у кожнага настаўніка беларускай літаратуры.

І калі мы чытаем на ўроках з вучнямі апавяданні вядомага пісьменніка, то найперш прыгадваюцца характарыстыкі, дадзеныя героям Маргарытай Яфімавай. А калі вывучаем у сёмым класе аповесць Я. Маўра "Палескія рабінзоны", то заўсёды ўспамінаецца тэрмін "рабінзанада", які з лёгкай рукі Маргарыты Барысаўны быў уведзены ў беларускае літаратуразнаўства.

Настольнай настаўніцкай кнігай стаў выдадзены Маргарытай Яфімавай дапаможнік "Літаратурныя вечары ў школе", выпушчаны выдавецтвам "Народная асвета". Калі шырока адзначалася 125-годдзе народных песняроў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа, літаратурна-музычныя кампазіцыі, складзеныя Маргарытай Барысаўнай, узнёсла і эмацыянальна гучалі на нашых школьных літаратурных святах.

У гэтыя дні мы паважліва схіляем калені перад Маргарытай Барысаўнай: хай паздаровіць Вас Божа на многія і доўгія гады, хай працягвае тварыцца цуд чысціні і дабрыні Вашага вялікага высакароднага сэрца.

Уладзімір ЛАЙКОЎ,
Любоў ЛАЙКОВА,
настаўнікі, выпускнікі філфака БДУ 1975 года

Інтэрактыўная спадчына

У 1891 годзе жыхары Стакгольма дзівіліся з музеязнаўцы Артура Хізэліуса. Набыўшы маёнтак Скансен на востраве Юргордэн, заможны навуковец перш-наперш перанёс у свае новыя ўладанні... цэлы дом — вельмі цікавы ў этнаграфічным плане будынак з мястэчка Мур. Так быў закладзены пачатак першаму ў свеце этнаграфічнаму музею пад адкрытым небам, а ўсе аналагічныя музеі з тых часоў завуцца скансенамі.

У Беларусі іх зараз некалькі. Жыхары мінскага мікрараёна Уручча, да прыкладу, прыгадаюць Музей валуноў. Але ж самым вядомым у нашай краіне быў і застаецца Музей народнай архітэктуры і побыту, што размясціўся ля вёскі Строчыца ў чатырох кіламетрах на паўднёвы ўсход ад сталіцы.

Першы скансен на тэрыторыі Беларусі — яшчэ і найвялікшы па плошчы музей краіны (каля 220 га). Больш як 100 работнікаў (тэхнічнага персаналу, навуковых супрацоўнікаў) прымаюць дзесяткі тысяч турыстаў штогод. У экспазіцыі — сам побыт беларускага сялянства XVII — XX стагоддзяў: прадметы паўсядзённага жыцця, прылады працы, адзенне, мэбля ды архітэктурныя збудаванні — абозні, адрыны, свіраны, хаткі і — абавязкова — цэрквы.

Тэхналогія "дастаўкі" магутных экспанатаў складаная. Гэта ў серыялах на тэлеканале Discovery можна пабачыць, як у Вялікабрытаніі цэлыя дамы ў некранутым выглядзе перавозяць з аднаго месца ў другое. У Беларусі ж будынак спачатку абмяраюць, ствараюць яго падрабязныя чарцяжы, занатоўваючы ўсе вонкавыя і ўнутраныя асаблівасці, а потым — разбіраюць па бярвеннях. На месцы брыгада будаўнікоў і спецыялістаў-архітэктараў месяцамі працуе над тым, каб будынак быў ўзноўлены дакладна.

— Справа не ў тым, што няма магчымасцей для транспарціроўкі цэлага будынка без яго разборкі. Проста невядома, што складаней — папрацаваць некалькі месяцаў над узнаўленнем альбо наймаць цяжкую тэхніку, пракладваць шлях для высачэзнага і шырачэзнага будынка — часам па вузенькіх раённых гасцінцах, разбіраючы масты і пуцеправоды, — кажуць супрацоўнікі музея.

Тэрыторыя комплексу падзелена на шэсць умоўных частак, кожная з якіх адпавядае пэўнаму этнаграфічнаму рэгіёну Беларусі. Кожны рэгіён прадстаўлены сапраўднай вёскай — з адмысловым рэльефам, вуліцамі, тузінам хатак і іншымі забудовамі, царквой. Пакуль стала працуюць тры "паселішчы" — Цэнтральная Беларусь, Падняпроўе ды Паазер'е.

Уваходзім у "Цэнтральную Беларусь", якая прадстаўлена ў асноўным будынкамі з розных куткоў Міншчыны. Для гэтага рэгіёна характэрна лінейная забудова паселішчаў, а таксама яскрава выражаны грамадска-культурны цэнтр. Галоўны помнік тут — Пакроўская царква XVIII ст., якая прывезена з в. Логвінавічы Клецкага раёна. Яшчэ адзін унікальны помнік гэтай часткі — капліца з в. Каралеўцы Вілейскага раёна — зараз на стадыі рэстаўрацыі.

Секцыя "Падняпроўе" размешчана на адносна роўным плато — якраз такі ландшафт болей за ўсё ўласцівы гэтаму рэгіёну. Збудаванні сюды звезеныя з мясцін паабапал нашай найбуйнейшай усходняй рэчкі — з Магілёўскай, а таксама з некаторых раёнаў Віцебскай і Гомельскай абласцей. Са старажытных часоў падняпроўцы займаліся не толькі земляробствам ды жывёлагадоўляй, але таксама ткацтвам, рамізніцтвам, ганчарствам, разьбярствам, пчалярствам... Гэты факт, прынамсі, знайшоў тут сваё адлюстраванне ў спецыялізаваных экспазіцыях — "Дубровенская кераміка" і "Чавускі строй".

Рыбацкія, і не толькі, паселішчы Паазер'я сталі "донарамі" для адпаведнай строчыцкай экспазіцыі. Гэта рэгіён — бясспрэчна, адзін з самых маляўнічых у Беларусі. Частка яго адпаведніка ў музеі прымыкае да ракі Пціч. У яе поплаве зараз аднаўляецца цэлы хутар з в. Цімошкава Міёрскага раёна. На стадыі завяршэння — царква XVIII ст. са званіцай з в. Вялец Глыбоцкага раёна — тыповы ўзор культавага дойлідства рэгіёна з двухсхільным дахам з крычолкам.

У кожнай хаце кожнага рэгіёна інтэр'ер прадуманы да дробязей — пачынаючы ад прадметаў побыту, якія ўласцівыя менавіта для гэтай часткі Беларусі, заканчваючы чырвоным кутом, у якім змешчаны праваслаўныя альбо каталіцкія іконы. У кожнай хаце — стол, набор страў, якія ілюструюць тое ці іншае рэлігійнае свята беларусаў — Куццю, Дзяды, Каляды і інш. "Ежа з пластыка" выглядае дужа апетытна.

Экскурсіі — агульныя і тэматычныя — толькі невялікая частка паслуг музея. Тут не адстаюць ад сусветных тэндэнцый — прапануюць гараджанам справіць у рэканструяваных беларускіх вёсках абрадавыя святы, вяселлі і нават... карпаратыўныя вечарыны.

Адзначаюць тут святы, звязаныя з этнаграфічнай і міфалагічнай спадчынай беларускага народа. Падчас іх наведвальнікаў сустракаюць разнастайныя міфічныя істоты — Лесавік, Дамавік... Акрамя паганскіх па паходжанні святаў, адзначаюць і выключна хрысціянскія, якія заўсёды шанаваліся нашымі продкамі — прынамсі, шырока святкуюць Спасы.

Важная рыса музея "адкрытага" тыпу — інтэрактыўнасць. У Строчыцы наведвальнікі маюць магчымасць пакатацца на санях, пахадзіць на хадулях, панасіць ваду ў вёдрах на каромысле.

Апошнім часам, праўда, у дзвярных праёмах на ўваходзе ў пакоі ў некаторых будынках з'явіліся шыбы. Паводле музейшчыкаў, доступ у шэраг пакояў абмежаваны для таго, каб сялянскі інтэр'ер лепей захаваўся, аднак частка той інтэрактыўнасці пры гэтым, пагадзіцеся, губляецца.

Пра экспанаты тут кожны экскурсавод можа расказваць гадзінамі — і не толькі пра тое, адкуль і калі той ці іншы будынак прывезены. У кожнай пабудовы тут — адмысловая гісторыя, якая дайшла да нас з глыбіняў стагоддзяў.

"Паводле легенды, у гэтым доме калісьці жыў чараўнік, — распавядае экскурсавод. — Але, калі з'язджаў адсюль, намаляваў крывёю на розных кутах хаты крыжы. Пасля гэтага тут ніхто не мог доўга жыць, у доме здараліся няшчасці... А як "пераязджала" тая хата да нас у музей, то будаўнікі, якія яе разбіралі, сапраўды знайшлі крыжападобныя выявы ў некалькіх кутах".

Знайсці шмат цікавага ў скансене зможа кожны. У зімовы перыяд, з кастрычніка па красавік, каса музея працуе з 10.00 да 15.00, экспазіцыя — да 16.00.

Мікола МІРОНЧЫК
Фота аўтара

Падарожжа праз Юхнавічы да Пінска

Правінцыйнае эсэ

Самыя нечаканыя і памятныя знаёмствы адбываюцца ў цягніку. Куплены білет зводзіць людзей розных узростаў, характараў, светапоглядаў на непрацяглы дарожны час. І гэта схіляе да шчырасці. Па-першае, узнікае патрэба забавіць нудныя гадзіны паездкі ў гаворцы. Аднак найбольш прывабны матыў адкрытасці і жадання ачысціць душу, бадай, — адчуванне таго, што гэтага чалавека ты ўжо ніколі не сустрэнеш.

Так заўсёды наладжваюцца стасункі ў сотах купэйнага ці плацкартнага вагона. А вось у электрычцы ці "дызелі" — свае спакусы. Там цікавей проста назіраць, не ўмешваючыся ў працэс кругазвароту людскіх планет.

Тамбур дызель-цягніка Брэст —Жыткавічы з кідкімі чырвонымі надпісамі па кутках "Не курыць!" вітае едкім тытунёвым духам. Праўда, нейкі ананімны жартаўнік умудрыўся на адным з "лозунгаў" сцерці часціцу "не". Але ж... Кажуць, бывае — міліцыянеры або кандуктары вылоўліваюць парушальнікаў, штрафы ўнушальныя накладаюць. Ды ці спыняе гэта курылышчыкаў? Вунь да супрацьлеглых аўтаматычных дзвярэй прытуліўся шэратвары, у кепцы з "пупам", але ў цэлым дагледжаны мужычок. Ён зладзеявата хавае ў жмені за спінай струменьчык дыму. Затым кідае хуценькі позірк на вагонны праход і ў акенца насупраць, праз якое бачны калідор суседняга вагона. Людзей у форме не відаць — тады смачна зацягваецца смярдзючай прымінай. А за хісткім пераходам, у суседнім тамбуры збілася купка студэнтак-пэтэвушніц, і плыве па іх коле недакурак з доўгім аранжавым фільтрам.

...Парожных месцаў не так і багата, хоць вагон нельга назваць перапоўненым. У праходзе з'яўляецца дзядзька з важкаю торбай на плячы. Ён моўчкі раскладае ў інтэрвале праз некалькі лавак узоры паліграфічнага дызайну, накшталт "Отдохни!". Следам заплывае яшчэ больш аб'ёмістая валізка: "Марожанае, чыпсы, піва..." Кульгае няголены, брыдкаваты тып. Адной рукой трымаецца за парэнчы, а другой кідае прама на калені пасажыраў цыдулкі: "Падайце глуханямому інваліду на харчы..." Гэта іх час, іх зона... Мы яшчэ не даехалі да станцыі Юхнавічы.

Між тым увагу прыцягвае яйкападобная галава пасажыра, патыліцу якога добра відаць праз лаўку наперадзе. (Ох, і гарэза ўсё-ткі наша прырода, калі здольна так эксперыментаваць з чалавечым целам.) Ён ажыўлена жэстыкулюе ў кампаніі дзвюх пажылых жанчын і пялегаванага, сівавалосага мужчыны. Размаўляюць не па-нашаму. З абрыўкаў фраз чуюцца нямецкія словы. Значыць, замежны госць. Бач, з якой цікаўнасцю круціць галавою то ўлева, то ўправа, калі за вокнамі праплываюць дахі пабудоў чарговага населенага пункта, ці вытыркнецца на нейкі момант з-за шатаў паркавых дрэў стэла абеліска. Магчыма, праходзіў калісьці гэтымі мясцінамі ў складзе войскаў вермахта? Калі па ўзросце — усё можа быць.

А збоку цераз праход закапрызіў малы, чатырох-пяцігадовы хлопчык. Варакузе надакучыла сядзець на адным месцы, рвецца пабегаць па калідорчыку. Маці не пускае — баіцца, каб выпадкова не расквасіў носік. У іх спрэчку ўмешваецца мажная, на ўсю лаўку кабеціна. "Хочаш цукерку на цалы дзень?" — працягвае яна непаседу ледзянец. О, якім мёдам наплывае на сэрца гэты мілагучны палескі говар, характэрны для Лунінеччыны ці Століншчыны! А гэты вышываны фартух на падоле цёткі!..

Усё. Прыехалі. Апошні канвульсіўны штуршок — рэха вагонных стыкаў на фінішы тармазнога шляху. Станцыя Юхнавічы.

Вагон аглушае галосны лямант, лязганне дзвярэй. Нават праз шыбіны рэжуць слых абрыўкі лаянкі. У Юхнавічах ідзе пасадка. Пакуль жа — кароткая "гістарычная" даведка.

Вёска гэтая ў Іванаўскім раёне лічыцца цыганскай. Нямала вандроўнага люду тут засвоіла аседлы лад жыцця. І ўсё ж традыцыі захоўваюць, на сваю спрадвечную "прафесію" не забыліся.

Тым часам цягнік пачынае рухацца, а з тамбура ў салон крыху раслейшыя заштурхоўваюць пару мурзатых малых. Прычым малыя — не тое слова. Ад гаршка — паўвяршка. У іх лепятанні ледзь угадваецца сэнс:

— Людзі доблыя, мы вам песню заспяваема...

І без "антракту":

— Над городом тишина,
По небу плывет луна.
Не спит и сидит одна
Только мама...

Затым малыя клыпаюць па хісткім праходзе, маленькія ручкі цягнуцца да пасажыраў:

— Дзядзя, дай грошыкаў... Дай, дай...

Нямецкаму госцю тлумачаць сюжэт спектакля, і яго твар расплываецца ў самазадаволенай, блішчастай усмешцы. Ён выцягвае з таўсматага партманета беларускую купюрыну.

Па калідоры мільгаюць доўгія квяцістыя спаднічкі, шурпатыя хлапечыя джынсікі. Праз паўгадзіны кампанія вяртаецца назад. "Важакі" трымаюць у прыгаршчах пукі скамечаных пяці-дзесяці-тасячарублёвых купюр. Набліжаецца Пінск, месца высадкі і "рабочых" рэйса.

Дзіву даешся, як міруцца з такім дэсантам вартавыя правапарадку ды вагоннае начальства. Крый Божа трапіцца да іх звычайнаму "зайцу". Усё зробяць, а свайго дамогуцца: аштрафуюць, высадзяць. А тут... Наўрад ці абцяжарваюць сябе юныя "гаўрошы" клопатамі пра нейкія там білеты.

Дарэчы, і майстэрства іх штодня шліфуецца. Калі яшчэ з год таму на тамбурных канцэртных пляцоўках папулярнымі былі "шлягеры гэтага лета", то цяпер нехта падвучыў малалетніх выканаўцаў карыстацца ў сваім рэпертуары слязлівымі і нават біблейскімі матывамі. Вось і паспрабуй "пакласці камень у працягнутую руку", калі ў памочнікі бярэцца сам пан Бог.

На прывакзальнай плошчы ля прыпынку гарадскога аўтобуса зноў сустракаю знаёмы гурт. Яны паспелі ўжо атаварыцца пакетамі цукерак ды пернікаў, пластыкавымі бляшанкамі з "фантай" ды "колай". Над кампаніяй — дым ад араматызаваных цыгарэт.

І раптам крыху воддаль ад тусоўшчыкаў заўважаю маленькага цыганчука, якога прыкмеціў яшчэ ў цягніку па адной простай прычыне: ніяк не мог даўмецца, як гэтае хлапчанё перакульваецца праз хісткія пласціны пераходаў паміж вагонамі. Чалавечак прысеў на кукішкі і рассыпае мініяцюрнай жменькай па асфальце зярняты сланечніку. Іх падбіраюць нахабныя галубы. Як толькі птушка набліжаецца — ён спрабуе ўхапіць яе за пёрысты хвост. І так шчыра, заразліва смяецца!..

Дык яны ж дзеці, звычайныя дзеці! Якім хочацца пагуляць, якім самы час закручваць у пялюшкі ляльку ці вуркатаць па жоўтым пясочку цацачным грузавічком.

...А мяне зноў кліча дарога. У прывакзальным буфеце станцыі Брэст—Заходні намагаюся выпіць кубачак кавы. Раптам адчуваю, як нехта настойліва тузае за штаніну. Азіраюся і трапляю ў гіпнатычную павуць цёмных, нібы вугольчыкі, вачанят:

— Дзядзька, дай грошай!

Не, мая залаціначка, лепш я куплю табе шакаладку.

Валерый КУХАРЧУК,
член Саюза пісьменнікаў Беларусі
Фота Кастуся Дробава

Старажытныя мудрацы казалі: "Паміж светам, які стварыў Бог, і чалавекам, якога стварыў Бог, стаіць мова". Менавіта мова дазваляе чалавеку асэнсаваць навакольны свет, выявіць у ім пэўныя заканамернасці, аналізаваць, рабіць высновы. Мова, і гэта таксама вядома даўно, фарміруе самога чалавека і чалавечую супольнасць. Калі мы гаворым пра нацыянальны менталітэт, то маем на ўвазе менавіта адметныя погляды на свет і грамадства пэўнай групы людзей. А погляды на свет і кантакты паміж людзьмі фарміруюцца, зразумела, з дапамогай моў — адной ці некалькіх.

адтэкст і кантэкст

№ 47 23 лістапа

Калі пачынаюць гаварыць пра літаратуру Беларусі ўвогуле, часам згадваюць пра тое, што акрамя ўласна беларускай літаратуры (літаратуры на беларускай мове) мае месца яшчэ адна — быццам і беларуская, але ж на рускай мове. Назваць яе "беларускай" — нібыта і некарэктна, таму што без істотных удакладненняў тут не абысціся; назваць "рускай" — таксама нацяжка, бо яна спецыфічна руская, беларуска-руская. Што рабіць з беларускай літаратурай, якая адначасова з'яўляецца рускай (рускамоўнай)?

Руская літаратура Беларусі

Мова фарміруе нашу супольнасць

Сёння беларускае, і не толькі беларускае, грамадства сутыкаецца з моўнай праблемай, бо большасць краін Еўропы з'яўляюцца шматнацыянальнымі і шматмоўнымі. Нам важна вызначыць месца нацыянальных моў і месца моў для міжнацыянальных зносін у кантэксце сучаснага грамадства. Здавалася б, усё і так зразумела, але на практыцы ўвесь час адбываецца блытаніна.

Скажам, школьныя праграмы пачатку XXI стагоддзя па беларускай мове і літаратуры сапраўды выклікаюць незадаволенасць, ды і праграмы ВНУ таксама. У іх слаба адчуваецца сучаснасць, недастаткова прадстаўлены творы сённяшніх аўтараў і творы пра цяперашняе жыццё. Мала таксама апавяданняў і аповесцей пра школьнікаў, падлеткаў, між тым, на старонках "Маладосці" рэгулярна з'яўляюцца цікавыя творы, але яны не атрымліваюць адпаведнага водгуку, той ацэнкі, якую заслугоўваюць. (Пералічваць іх тут не варта, бо такі пералік толькі адцягне нашу ўвагу ад асноўнай тэмы.)

Іншае пытанне, якое асабліва востра стаіць сёння, — узбагачэнне літаратуры Беларусі за кошт твораў небеларускамоўных, а ў першую чаргу — рускамоўных пісьменнікаў. (Далей мы будзем выкарыстоўваць абагульненую назву "рускамоўная беларуская літаратура", вызначыўшы яе, такім чынам, па выключна моўнай прыкмеце. Тэматыка артыкула дазваляе гэта зрабіць, а аўтару хацелася б разглядаць рускамоўную літаратуру ў першую чаргу, як літаратуру, якая належыць Беларусі. Падрабязна пытанне аб рускай і рускамоўнай літаратуры ў Беларусі было разгледжана ў артыкуле А.Андрэева ў № 47 "ЛіМа" за 23 лістапада 2007 года.)

Для таго, каб быць цікавай, літаратура павінна быць разнастайнай, шматаблічнай, мець як мага больш накірункаў і жанраў (як адзначалася ў папярэдніх артыкулах — мы іх маем!). Беларуская літаратура знаходзіцца на высокім узроўні і мае добрыя перспектывы, бо на яе працуюць моцныя традыцыі. У першую чаргу — традыцыя класікаў беларускай літаратуры, але айчыннае прыгожае пісьменства ніколі не было закансерваваным, яно з часоў Кірылы Тураўскага і Міколы Гусоўскага — арганічная частка сусветнага літаратурнага працэсу.

Дарэчы, узгадаўшы Міколу Гусоўскага, варта перайсці да асноўнай тэмы гэтага артыкула. Гістарычна склалася так, што на тэрыторыі Беларусі літаратура ствараецца не толькі на беларускай мове. Гэта, як агульнавядома, звязана з тым, што Беларусь стала радзімай для прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей і канфесій, і ўсе яны ўзбагацілі нашу культуру.

Польскамоўная літаратура на Беларусі даследуецца даўно. Дзякуючы многім навукоўцам мы больш ці менш (зразумела, праца наперадзе вялікая і ў гэтым накірунку) уяўляем месца і ролю польскамоўных пісьменнікаў у развіцці прыгожага пісьменства на Беларусі. І Ян Баршчэўскі, і Ігнат Дамейка, і Уладзіслаў Сыракомля і, безумоўна, Адам Міцкевіч, уведзены ў наш культурны кругагляд.

Тут жа варта адзначыць і паглыбленне літаратурных узаемасувязей паміж украінскай і беларускай літаратурамі. Цудоўны пераклад "Новай зямлі" Якуба Коласа, выкананы В. Стралко, у многім стаў вынікам глыбокага разумення арганічнай, глыбіннай сувязі культур, — сувязі, з захаваннем нацыянальнай адметнасці кожнай культуры. Тут жа нельга не ўзгадаць і вельмі важнае для вырашэння згаданай праблемы выданне — падручнік Усевалада Рагойшы, Таццяны Каржыцкай і Паўла Навойчыка па ўкраінскай літаратуры. Нагадаем, тэксты ў ім падаюцца на мове арыгінала, а ўсе каментарыі і крытычныя матэрыялы — на беларускай мове. Немагчыма ўпісаць беларускую культуру ў сусветны кантэкст, мінаючы культурны кантэкст яе суседзяў. І падручнік яскрава дэманструе, як гэта павінна рабіцца практычна. Калі беларуская мова і сама школа беларускага літаратуразнаўства робіцца інструментам для вывучэння літаратур на іншых мовах ці адцягненага аналізу літаратурнага працэсу як дынамічнай сістэмы, яна актуалізуецца, статус яе павышаецца.

На гэтым фоне нераспрацаванасць тэмы рускамоўнай літаратуры на Беларусі выглядае асабліва відавочнай. З-за гэтага і праграмы падаюцца абмежаванымі, ды і агульнае ўяўленне наша аб літаратуры сваёй краіны робіцца няпоўным. Мы часта кажам, што культура Беларусі надзвычай багатая, але на практыцы аказваецца, што адны яе багацці нам патрэбны, а ад іншых можна, не шкадуючы, адмахнуцца.

Так, праграмы вельмі далёкія ад ідэалу, гэта бясспрэчна. Але ці варта іх пераліцоўваць? Праграмы трэба ўзбуйняць, пашыраць, уключаць у іх новыя сучасныя творы, павялічваючы колькасць гадзін на вывучэнне беларускай літаратуры. Вывучэнне яе павінна пакідаць у школьнікаў і студэнтаў адчуванне, што культура — гэта жывы працэс, яна не перапыняецца час ад часу, не канчаецца 90-мі гадамі XX стагоддзя, не абмяжоўваецца па нацыянальнай ці моўнай прыкмеце.

Калі ж мы пачнём выкідаць з праграм адны творы, каб на іх месца паставіць іншыя, то вельмі хутка дабяромся да Купалы і Багдановіча. Увесь час з'яўляюцца мастацкія тэксты, і, магчыма, нас хутка чакае перыяд, калі не толькі ўзнікнуць новыя творы, але будуць ацэнены і тыя, што ўжо існуюць. І што тады рабіць?

Вывучэнне беларускай літаратуры пакідае жадаць лепшага, што ўжо казаць пра рускамоўную літаратуру Беларусі, бо падручнікаў у дадзенай галіне мы дачакаемся не хутка, улічваючы недастатковае фінансаванне Інстытута літаратуры і — адсюль — адсутнасць у ім базы для стварэння названых падручнікаў.

Складанне праграм — шматузроўневы працэс. Асабліве месца ў ім займае фундаментальная навука. Падручнікі пішуцца на аснове манаграфій, у сваю чаргу напісаных навукоўцамі Нацыянальнай акадэміі навук. Тут роля акадэміі — першасная. Ці ёсць у сённяшнім Інстытуце літаратуры сектар, які б займаўся рускамоўнай, польскамоўнай, украінскай, яўрэйскай ці татарскай літаратурамі на Беларусі? Ці распрацоўваюцца гэтыя тэмы, ці рыхтуюцца манаграфіі? Нешта, зразумела, робіцца, але хутчэй па ўласнай ініцыятыве. Канечне, недахоп фінансавання... Наогул, ёсць меркаванне, што і беларускую мову і ўсю літаратуру Беларусі можна вывучаць намаганнямі аднаго навуковага інстытута, ды яшчэ пасля скарачэння кадраў... Якая тут можа ісці гаворка пра ўзбуйненне?

Складанне праграм — шматузроўневы працэс. Асабліве месца ў ім займае фундаментальная навука. Падручнікі пішуцца на аснове манаграфій, у сваю чаргу напісаных навукоўцамі Нацыянальнай акадэміі навук. Тут роля акадэміі — першасная. Ці ёсць у сённяшнім Інстытуце літаратуры сектар, які б займаўся рускамоўнай, польскамоўнай, украінскай, яўрэйскай ці татарскай літаратурамі на Беларусі? Ці распрацоўваюцца гэтыя тэмы, ці рыхтуюцца манаграфіі? Нешта, зразумела, робіцца, але хутчэй па ўласнай ініцыятыве.

І яшчэ — дзе ўзяць спецыялістаў, з якіх можна сфарміраваць той самы сектар па вывучэнні небеларускамоўных літаратур на Беларусі? На гэта пытанне няма чым запярэчыць. Сапраўды, аўтар дадзенага артыкула скончыў беларускарускае аддзяленне філфака БДУ. Цяпер такога аддзялення ўвогуле не існуе, але ў той час, калі яно было, на ім таксама паэзія і проза, напісаныя на рускай мове беларускімі пісьменнікамі, не вывучаліся.

Дарэчы, на філфаку сёння таксама стаіць пытанне аб скарачэнні кадраў. Але варта задумацца, ці ёсць ў нас "лішнія" філолагі? На кожным "круглым стале", у кожным выступленні на адкрыццях навуковых канферэнцый гучыць спіс тэм, якія павінны быць распрацаваны, пералік кірункаў дзейнасці, на якія варта звярнуць пільную ўвагу. Мы ўвесь час чуем, што гуманітарныя навукі — самая рухомая галіна. Яны павінны імгненна рэагаваць на запатрабаванні грамадства, бо менавіта гуманітарыі фарміруюць нашы перспектывы, задаюць напрамкі будучага развіцця. Але як літаратуразнаўства, культуралогія могуць імгненна рэагаваць, калі філолагаў і культуролагаў мала, іх проста не хапае на тое, каб ахапіць усе праблемы?

Да таго ж і падрыхтоўка філолагаў не разглядаецца як надзвычай важная для дзяржавы галіна. Дарэчы, колькасць гадзін на фізіку і матэматыку ў школах і ВНУ павялічваецца рэгулярна. Гэта дзіўна, бо глабальныя адкрыцці, якія мяняюць фундаментальныя ўяўленні і, адпаведна, уплываюць на школьныя праграмы, робяцца недзе разы два за стагоддзе.

Безумоўна, дрэнна, што многія прадстаўнікі дакладных і прыродазнаўчых навук не выкарыстоўваюць беларускую мову як інструмент свайго інтэлектуальнага пошуку. Дарэчы, усё неабходнае для таго, каб яе выкарыстоўваць, ёсць. І беларускамоўныя падручнікі, і дапаможнікі, і энцыклапедыі. Напрыклад, яшчэ ў 2001 годзе выдавецтва "Тэхналогія" (Мінск) выдала "Матэматычную энцыклапедыю", дзе, апроч спецыяльных звестак, асобным раздзелам пададзена інфармацыя аб беларускіх матэматыках. І многія навукоўцы — тыя ж матэматыкі — вельмі добра валодаюць беларускай мовай. Але неяк не прыжылося...

Яшчэ горш, што беларускую мову недастаткова выкарыстоўваюць гуманітарыі, не толькі юрысты і эканамісты, а нават гісторыкі. Дарэчы, як можна казаць пра справаводства на беларускай мове, калі юрысты і эканамісты яе не ведаюць? На адпаведных факультэтах значна паменшылася колькасць гадзін на выкладанне прадмета "Беларуская мова: прафесійная лексіка". Не хацелася б, каб эканамісты, а тым больш — юрысты, практыкаваліся на нас, апелюючы мовай, якой ім яшчэ толькі належыць авалодаць. І ўвядзенне беларускамоўнага справаводства агульную моўную карціну не палепшыць, бо многія грамадзяне проста вывучаць дзесятак слоў: "адпачынак", "падаткі", "заява", "налічэнні", і на гэтым іх уласная "беларусізацыя" хутчэй за ўсё скончыцца.

Але што казаць, калі філолагі аналізуюць на беларускай мове ў асноўным саму беларускую мову і літаратуру. У апошні час абараняецца шмат дысертацый, у якіх закранаецца творчасць замежных аўтараў, сучасных, цікавых, але самі работы пішуцца па-руску.

Можа, таму і гібее беларуская мова, што яна зрабілася інструментам для аналізу самой сябе? У кожнай працы, напісанай па-беларуску, мы чамусьці павінны цытаваць менавіта беларускіх аўтараў, на беларускія аўтарытэты спасылацца. Пісаць па-беларуску аб тым, што не тычыцца непасрэдна Беларусі, а, скажам, характэрна для многіх культур, літаратур свету неяк не прынята. У многіх дысертацыях прыцягванне беларускага матэрыялу нярэдка робіцца абсалютна штучным і часам выглядае як адпіска. А між тым, нібыта "мёртвая" латынь не збіраецца гінуць. І якраз таму, што яна — інструмент для аналізу не толькі сябе самой...

Але роля адукацыі і навукі ў павышэнні статуса беларускай мовы ўсім зразумелая. У гэтай галіне ўсё ж многае робіцца. Аднак беларускія СМІ, асабліва тэлебачанне, штодня дэманструюць грэблівае стаўленне да беларускай мовы, якой знаходзіцца месца толькі ў спецыялізаваных перадачах. Дарэчы, перадачах, якія глядзяць людзі і без таго зацікаўленыя беларускай мовай, літаратурай, гісторыяй і культурай.

Зноў вернемся да старажытнага выслоўя, прыведзенага ў пачатку артыкула. Справа ў тым, што карціна свету — гэта не нешта раз і назаўсёды зададзенае, сфарміраванае ў калыскі і нязменнае. Яна ўзбагачаецца кожны дзень, дапаўняецца, часам — мяняецца.

Калі беларуская літаратура не павінна быць абавязкова і выключна беларускамоўнай, бо такой яна ніколі і не была, то беларускае тэлебачанне якраз павінна гучаць па-беларуску, а ў нас — усё наадварот.

Мы кажам, што жыццё — у руху. Адпаведна, каб мова заставалася жывой, яна павінна цыркуляваць у самым рухомым слаі інфармацыі. Літаратура ж замацоўвае прынцыпы, напрацаваныя чалавецтвам за тысячагоддзі і не падлягаючыя зменам або падлягаючыя зменам вельмі паступова. Наогул, друкаванае слова дазваляе вывучыць мову, але толькі слова пачутае дапаможа размаўляць на ёй.

Самая жывая інфармацыйная плынь на сённяшні дзень зыходзіць з надзвычай рухомай сістэмы эканамічных, палітычных, культурных і іншых грамадскіх адносін. Асвятляюць іх "Навіны", выступленні палітычных, культурных аглядальнікаў. Немалую ролю адыгрываюць перадачы пра моду, кіно, спорт, музыку, рознага кшталту ток-шоу.

Згодна з нашым заканадаўствам, запрошаныя госці розных праграм маюць права гаварыць па-руску ці па-беларуску на свой выбар, але журналістам і вядучым на беларускім тэлебачанні варта было б ўсё ж размаўляць на мове нацыянальнай большасці насельніцтва Беларусі.

Ёсць нямала тэм, якія на беларускім тэлебачанні ніколі не агучваліся па-беларуску. Асабліва гэта тычыцца праграм палітычнай і эканамічнай тэматыкі, спартыўных перадач, конкурсаў і ток-шоу. Калі людзі звыклі да абмеркавання сур'ёзных альбо проста цікавых пытанняў па-руску, беларуская мова непазбежна сама сабой адсунецца, пераселіцца ў "літаратурна-фальклорную рэзервацыю". Менавіта тое сёння і адбываецца, як бы жорстка гэта не гучала.

Марыя ШАМЯКІНА

«Ты помніш, Алёша...»



З цікавасцю прачытаў у "ЛіМе" за 7.07.2006 года публікацыю гісторыка, падпалкоўніка запасу Міхася Рыськова "Незнаёмы Шамякін: Эпізод з франтавой біяграфіі народнага пісьменніка Беларусі", дзе расказваецца, што сваю творчую біяграфію Іван Пятровіч Шамякін пачаў у газеце "Часовой Севера" як паэт у 1940 — 1942 гадах. І да гэтага ў нейкай ступені быў спрычынены Канстанцін Сіманаў. Нагадаю, аб чым ішла размова.

У лістападзе 1941 года на крайні правы фланг савецка-германскага фронту, у Мурманск, прыбыў спецыяльны карэспандэнт "Красной звезды" Сіманаў. У паездках па войсках яго суправаджаў карэспандэнт "Часового Севера" Г. Ладысеў, беларус, ураджэнец Віцебшчыны. Ладысеў сведчыць, што на Поўначы Сіманаў напісаў знакамітыя вершы "Женщине из-под Вичуга" і "Жди меня". Хацелася б прадоўжыць тэму. Справа ў тым, што Канстанцін Сіманаў напісаў на Поўначы яшчэ адзін шырокавядомы верш "Ты помнишь, Алеша, дороги Смоленщины..." Але аб усім па парадку.

У час працы над ваенным раздзелам кнігі "Талачын" (Мінск: Беларусь, 1983) я перачытваў вершы К. Сіманава гадоў Вялікай Айчыннай вайны і затрымаўся на радку: "Ты помнишь, Алёша, изба под Борисовом..." Як краязнавец я ведаў, што падчас баявых дзеянняў у гады Вялікай Айчыннай у Талачыне былі камандуючы танкавай арміяй П. Ротмістраў, генерал арміі І. Чарняхоўскі, камандзір 2-га гвардзейскага танкавага корпуса генерал А. Бурдэнка, пісьменнікі І. Эрэнбург, Эль Рэгістан, А. Суркоў, К. Сіманаў. Каму з нас не вядомы гэтыя шчырыя радкі зварота паэта да свайго старэйшага франтавога калегі Аляксея Суркова:

Ты помнишь, Алеша,
дороги Смоленщины,
Как шли бесконечные злые дожди,
Как крынки несли нам
усталые женщины,
Прижав, как детей,
от дождя их к груди...
Ты помнишь, Алеша,
изба под Борисовом,
По мертвому плачущий девичий крик,
Седая старуха в салопчике плисовом,
Весь в белом, как на смерть одетый,
старик.
Ну что им сказать,
чем утешить могли мы их?
Но горе поняв своим бабьим чутьем,
Ты помнишь, старуха сказала:
— Родимые,
Покуда идите, мы вас подождем...
"Мы вас подождем!" —
говорили нам пажити.
"Мы вас подождем!" — говорили леса.
Ты знаешь, Алеша,
ночами мне кажется,
Что следом за мной их идут голоса.

Прачытаўшы верш, задумаўся: дзе, у якім населеным пункце пад Барысавам магло гэта быць? Дзе пачуў Канстанцін Міхайлавіч "по мертвому плачущий девичий крик", дзе бачыў "седую старуху в салопчике плисовом"? Дарогу да Барысава ведаю добра, стаў перабіраць у памяці населеныя пункты. Адно было зразумела: гэта вёска ля самай дарогі, паэт забег сюды праездам. Варыянтаў набралася некалькі.

Звярнуўся да дзённікавых запісаў К. Сіманава ў двухтомніку "Разные дни войны". У прадмове аўтар адзначае: "... когда пишешь о таком тяжком деле, как война, фантазировать, и брать факты с потолка как-то не тянет. Наоборот, всюду, где это позволяет твой собственный опыт, стараешься держаться поближе к тому, что видел на войне своими глазами". Прачытанае настройвала на тое, што ў вершы выкарыстаны факты, з якімі сапраўды сутыкнуўся ваенкар газеты заходняга фронту "Красноармейская правда" Канстанцін Сіманаў. Яе рэдакцыя, дзе працавалі Сіманаў, Суркоў і іншыя літаратары, у першыя дні вайны знаходзілася ў Магілёве. Выконваючы заданне рэдакцыі, дабіраючыся да Барысава і назад, паэт мог праязджаць праз Талачын.

У першым томе кнігі "Разные дни войны" Канстанцін Міхайлавіч расказвае, як яны з Сурковым на зваротным шляху з-пад Барысава, праехаўшы замініраваны мост праз раку Бобр, "устав и окончательно пропылившись, заехали в какую-то деревеньку возле дороги и заглянули в избу. Изба была оклеена старыми газетами, на стенах висели какие-то рамочки и цветные вырезки из журналов. В правом боку была божница, а на широкой лавке сидел старик, одетый в белую рубаху и белые порты, — с седой бородой и кирпичной морщинистой шеей.

Бабка, маленькая старушка с быстрыми движениями, усадила нас рядом со стариком на лавку и стала поить молоком. Сначала вытащила одну крынку, потом другую. Зашла соседка. Бабка спросила:

— А Дунька всё голосит?

— Голосит, — сказала соседка.

— У ней парня убили, — объяснила нам старуха.

Потом вдруг открылась дверь в сени, и мы услышали, как близко, должно быть в соседнем дворе, пронзительно кричит женщина. Бабка, сев рядом с нами на лавку, спокойно следила, как мы жадно пьем молоко.

— Все у нас на войне, — сказала она. — Все сыны на войне, и внуки на войне. А сюда скоро немец придет, а?

— Не знаем, — сказали мы, хотя чувствовали, что скоро.

— Должно скоро, — сказала бабка. — Уж стада все прогнали. Молочко последнее пьем. Корову-то с колхозным стадом отдали, пусть гонят, Даст Бог, когда и обратно пригонят. Народу мало в деревне, все уходят.

— А вы? — спросил один из нас.

— А мы куда ж пойдем? Мы тут будем. И немцы придут, тут будем, и наши вспять придут, тут будем. Дождемся со стариком, коли живы будем".

Прачытаўшы гэта, я падумаў: расказанае мае прамыя адносіны да твора "Ты помнишь, Алеша..." Вырашыў напісаць Канстанціну Міхайлавічу, каб ён удакладніў месца, дзе адбываліся апісаныя ў вершы падзеі. Нягледзячы на вялікую занятасць (Сіманаў у той час узначальваў Саюз пісьменнікаў СССР, вёў адну з перадач на тэлебачанні, працаваў над сваімі чарговымі творамі), паэт даволі аператыўна прыслаў падрабязны адказ:

"Уважаемый Анатолий Антонович!

Получил Ваше письмо, в котором Вы хотите уточнить историю моего стихотворения "Ты помнишь, Алеша, дороги Смоленщины..."

Я заглянул в первый том своей книги "Разные дни войны", а потом в подлинник того дневника, а точнее, тех дневниковых записей, которые я вел весной сорок второго года, вспоминая события сорок первого и сверяясь со своими фронтовыми блокнотами. Вот что выясняется. В книге "Разные дни войны" дневниковые записи даны с некоторыми купюрами и небольшой стилистической правкой там, где это казалось мне необходимым. <...>

На странице 128 своего дневника, записанного где-то весной сорок второго года, я нашел следующие строчки: "Ехали мы мимо лесных деревень, где на улицах было много народу и бабы провожали на войну парней. В одной из деревенек мы выпили молока и пожевали сухарей". <...> Дальше текст дневниковой записи совпадает с текстом книги. Перечитав эту старую запись, думаю, возможно, Вы и правы в своем предположении, что деревенька, в которую мы заехали, была где-то под Толочином. Борисов появился в стихотворении, потому что самое главное в этой поездке был для нас Борисов, и мы о нем вспоминали, как о поездке под Борисов. А заехали в деревеньку, "устав и пропылившись окончательно" мы, очевидно, уже по дороге к Смоленску, как о том и говорится. А Толочин лежит как раз на этой дороге между Борисовом и Оршей.

Вполне возможно, что все так оно и было в жизни, что довольно далеко отъехали от Борисова и от реки Бобр... Как называлась деревенька, нигде не записано... А дороги Смоленщины появились в этом стихотворении потому, что много мы поколесили по этим дорогам, так же, как и по дорогам Могилевщины и вообще по дорогам Белоруссии. Стихотворение писалось позже, уже где-то в ноябре сорок первого года на Крайнем Севере во время перехода морем из Кандалакши в Архангельск. Это было уже после Смоленского сражения, после окружения, падения Могилева, и в памяти то время у меня связывалось с дорогами Смоленщины и Могилевщины. Так именно это и упоминалось в стихах в соответствии с чувствами, которые тогда мною владели.

Буду рад, если мой ответ в какой-то мере удовлетворит Вас.

8.1.79. Уважающий Вас Константин Симонов".

Да слова, гэтае пісьмо Сіманава ўпершыню было апублікавана ў шостым выпуску штогодніка Саюза пісьменнікаў СССР "Шаги", а затым у яго кнізе "Письма о войне, 1943 — 1979". Наколькі ж яскрава характарызуе яно Сіманава, сведчыць аб яго высокай унутранай культуры, абавязковасці, увазе да аўтараў, незалежна ад таго, хто яны! Чалавек выключна заняты, калі на ўліку кожная хвіліна, знаходзіць час, каб звярнуцца да франтавых блакнотаў, падзей паўвекавой даўнасці, адшукаць, удакладніць дэталі стварэння аднаго са сваіх твораў...

Такім чынам, у сваім лісце Сіманаў не адмаўляў, што хата, у якую яны зайшлі, магла быць у адной з вёсак пад Талачыном.

Далей усё складвалася быццам бы само па сабе. Гартаў неяк старую падшыўку "Литературной газеты", і маю ўвагу прыцягнуў запіс сяброўскай гутаркі ў рэдакцыі паэта Аляксея Суркова і праслаўленага героя Вялікай Айчыннай вайны генерала Паўла Батава. Публікацыя называлася "Бойцы вспоминают..." У гэтай гутарцы былы камандзір роты Батаў, у якой служыў А. Суркоў, звяртаючыся да паэта, заўважыў: "С Симоновым, видно, ты подружился... У меня на памяти — «Ты помнишь, Алеша, дороги Смоленщины...»".

І Суркоў расказаў: "Попали мы в город Толочин. Здесь, под Толочином, в деревне все и происходило, о чем написано в этом стихотворении. Не под Борисовом, а под Толочином. Старуха и дед действительно были, а "бесконечных злых дождей", признаться, не было. Стояло знойное лето, дико, невыносимо знойное. И все же в поэзии это вполне правомерно, ибо не противоречит справедливости истинной, большой, а не календарной..."

Значыць, усё, аб чым гаворыцца ў вершы, адбывалася ў адной з вёсак пад Талачыном. Але ў якой іменна — пытанне доўга заставалася адкрытым.

І ўсё ж настойлівыя пошукі далі свой плён. Нядаўна ўдалося ўстанавіць тое, што адсутнічала ў запісных кніжках і памяці франтавых карэспандэнтаў. Без усякага сумнення, "изба под Борисовом" была ў вёсцы Трасцянка Слаўнаўскага сельскага савета Талачынскага раёна. На пачатку вайны ад фашысцкай кулі тут загінуў 19-гадовы юнак Іваноў Андрэй Мікалаевіч. Ён, пахаваны на вясковых могілках, у спісе ахвяр вайны. На старонцы 365 кнігі "Память. Талачынскі раён" значыцца: "Іваноў Андрэй Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1922 годзе, загінуў 6 ліпеня 1941 года". Дапамаглі і сведчанні Анатоля Плескачова з вёскі Трасцянка, майго аднакашніка па Аршанскім чыгуначным тэхнікуме. Ён прыпомніў, што ў пачатку вайны ў вёсцы сапраўды загінуў хлопец, маці якога звалі Дунька. І хата іхняя была крайняя, ля самай аўтамагістралі Масква — Мінск... Значыць, з суседняга двара К. Сіманаў і яго баявыя таварышы чулі жудасны крык Андрэевай маці Івановай Еўдакіі. Значыць, менавіта Трасцянка — вёска, якая крывёю і жыццём свайго аднавяскоўца ўпісана ў гісторыю знакамітага верша К. Сіманава.

Анатоль ШНЭЙДАР
Талачын

Шчыры беларусіст

З Аўстрыі прыйшла сумная вестка: 31.12.2007 беларуская культура страціла аднаго з актыўных і шчырых сваіх прыхільнікаў — перакладчыка і папулярызатара, вядомага аўстрыйскага славіста Фердынанда Нойрайтэра. Шлях яго да нашага прыгожага пісьменства быў працяглым і нялёгкім.

Нарадзіўся ён 15 чэрвеня 1928 г. у Рызе, у 1937 г. пераехаў у Нямеччыну, дзе скончыў народную школу і класічную гімназію, ва універсітэце ЗША вывучаў англійскую мову. У 60-я гг. у яго ўзнікае павышаная цікавасць да гісторыі славянскіх народаў, у тым ліку беларускага. Тады і распачаў ён у Зальцбургскім народным універсітэце чытанне курса лекцый "Найменш вядомыя народы Еўропы".

У чэрвені 1990 г. Ф. Нойрайтэр разам з іншымі замежнымі славістамі прыязджае ў Беларусь для арганізацыі пры БДУ школы беларускай мовы для замежных слухачоў. Тады і адбылося знаёмства яго з Беларуссю, а беларускай грамадскасці з ім...

Гэтая сустрэча паспрыяла ўстанаўленню ўзаемазацікаўленых адносін між намі. Распачалося актыўнае ліставанне: мы не раз сустракаліся з ім і ў Беларусі, і ў Аўстрыі. Ён высылае мне складзеную ім і ў ягоным жа перакладзе Анталогію беларускай літаратуры (Мюнхен, 1983), а затым і перакладзеныя ім беларускія кнігі і свае публікацыі пра Беларусь, усхвалявана апавядае пра працяглае і цікавае супрацоўніцтва з Юрай Попкай і яго Інстытутам Беларусаведы ў Ляймене, якое распачалося ў 1985 г. Ён перакладае на нямецкую мову яго раман пад псеўданімам Ю. Жывіцы "Сьвеціць у тумане" (1985), прадмову Я. Белавежскага да нямецка-беларускага выдання "Слова пра паход Ігаравы" (1987) і зборнік артыкулаў пад рэд. Ю. Попкі "Вытокі беларускай нацыі і культуры" (1988). Ён інфармуе мяне пра свае планы, пра пераклады беларускіх паэтаў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча.

Найбольш поўная перакладчыцкая спадчына Ф. Нойрайтэра пазначана 2002 г., калі больш як 20 старонак яго перакладаў былі змешчаны ў часопісе "Год беларускі" (2002), што выдаецца Сакратам Яновічам у Крынках. Затым яны надрукаваны ў Інтэрнеце пад рубрыкай "Камунікат. Беларуская інтэрнетная бібліятэка", у № 2 і № 3 па тры старонкі — усяго больш як 20 перакладаў вершаў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, М. Танка, П. Броўкі.

У 90-я гг. ён яшчэ больш актыўна далучаецца да беларускай праблематыкі, піша артыкул "Янка Купала — паэт з Беларусі", у Зальцбургскай народнай газеце публікуе артыкул "Беларусь — папялушка Еўропы", дзе, спасылаючыся на гістарычнае развіццё нашай Бацькаўшчыны, робіць спробу паказаць, чаму Беларусь так мала вядомая ў Еўропе ды выказвае надзею, што насталі спрыяльныя часы і, нарэшце, яна стане каралевай.

Нойрайтэр, рыхтуючыся да лекцый пра Беларусь і яе культуру, сабраў багатую бібліятэку старых беларускай кніг і эміграцкай літаратуры. Мне пашанцавала атрымаць ад яго камплект "Бацькаўшчыны", які з цягам часу я перадаў у Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Гэта адзіны поўны камплект гэтага выдання ў Беларусі.

Нойрайтэр прыняў актыўны ўдзел у Першым міжнародным кангрэсе беларусістаў, дзе выступіў з дакладам "Мой шлях да Беларусі". У наступным годзе падобная сустрэча адбылася ў Зальцбургу — на Міжнародным сімпозіуме "Адраджэнне і праблемы беларусістыкі на сучасным этапе".

Для знаёмства беларускай грамадскасці з дзейнасцю Ф. Нойрайтэра на ніве беларускай культуры аўтарам гэтых радкоў зроблена некалькі публікацый: "Ці стане каралевай папялушка? Роздум пра беларуска-аўстрыйскія культурныя сувязі" (газета "Голас Радзімы"); "Золушка Европы? Белорусская культура в Австрии и Швейцарии" (часопіс "Нёман") і інш.

Сёння са шкадаваннем мы адзначаем, што не стала гэтага руплівага працаўніка на ніве беларускай культуры ў Аўстрыі.

Уладзімір САКАЛОЎСКІ

Новы год — новы крок?

Самы першы сёлетні вернісаж Беларускага саюза мастакоў — нібы прыгожы дасціпны экспромт, якім таленавітыя творцы павіншавалі гледачоў з усімі зімовымі святамі. Павіншавалі, падарыўшы навагодні настрой і надзею на яскравы працяг выставачнага сезона ў сталічным Палацы мастацтва.

Ладкавалі гэтую выстаўку і сапраўды экспромтам: праекта пад назваю "Калядны фэст" не было ў планах творчай суполкі, ідэя наладзіць свята для шырокага кола людзей належыць новаму кіраўніцтву саюза, абранаму на нядаўнім з'ездзе беларускіх мастакоў. Хутка і з фантазіяй скампанаваць калядны падарунак для гледачоў узяліся прадстаўнікі некалькіх творчых падраздзяленняў БСМ: дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, графікі, скульптуры, суполкі "Пагоня". Прысутная на вернісажы вядомая габеленшчыца Ларыса Густава (яна ўзначальвае секцыю тэкстылю), падкрэсліўшы, што навалецце пачынаецца прыемнай, вясёлай і радаснай выстаўкай, выказала пажаданне, каб гэткая ж светлая і маляўнічая, святочная экспазіцыя радавала гледача на пачатку кожнага наступнага года. Іншыя арганізатары і ўдзельнікі праекта гаварылі пра невыпадковасць самой яго назвы, якая дае прастору для свежых ідэй, творчых вынаходніцтваў. Бо "Калядны фэст" мае на ўвазе ўвасабленне разнастайных імпрэз, перформансаў, да якіх можна далучаць, напрыклад, музыкаў, артыстаў з батлейкай: каб на працягу першага зімовага месяца выстаўка па-сапраўднаму жыла, каб людзі прыходзілі сюды сем'ямі, а залу каб упрыгожвала фантазійная авангардная ёлка.

Новае кіраўніцтва саюза пачынае год з увасаблення новых ідэй і з надзеямі на ажыццяўленне новых планаў? Пэўна, так. Вось што казаў падчас вернісажу першы намеснік старшыні БСМ Рыгор Сітніца:

— Бог даў беларусам магчымасць святкаваць двойчы і яго Нараджэнне, і Новы год. У гэтым вялікая прывілея нашай нацыі. І мы выкарысталі гэты цудоўны зімовы час, каб зрабіць сапраўднае свята для людзей. Абяцаем, што за тыя бліжэйшыя гады, на якія прыйшло працаваць новае кіраўніцтва саюза, будзе шмат сюрпрызаў для гледача. Ужо, напрыклад, падпісана дамова аб супрацоўніцтве БСМ з Міністэрствам культуры Беларусі, ёсць план супольных праектаў. Так, сёлета краіна адзначае 200-годдзе з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, і ў цэнтры Мінска будзе адкрыты помнік нашаму класіку — неўзабаве пройдзе конкурс на яго лепшы праект. У 2010-м свет адзначыць 600-годдзе Грунвальдскай бітвы, і ўжо сёння трэба рыхтаваць выстаўку да гэтай даты, з удзелам замежных мастакоў. А наогул творчасць — гэта ўрачысты і вясёлы занятак. І трэба імкнуцца да таго, каб у нашым палацы не проста "вісела" дзяжурная выстава, а каб усе чарговыя выстаўкі былі ўрачыстымі, прывабліваліі сюды людзей штодня. Каб ад святочных сустрэч з мастацтвам прыгажэла жыццё нацыі.

...Бронзавыя скульптуры Андрэя Асташова, мармуровыя міфалагічныя істоты Аляксандра Козела, літаграфія Канстанціна Селіханава, ксілаграфія Анатоля Зайцава, садовыя ружы ды вяргіні Галіны Бараноўскай, плынь бясконцай і непаўторнай фантазіі ў пластычных кампазіцыях Валянціны Іваньковай, керамічныя персанажы Тамары Курачыцкай, вышываныя карціны Любові Кірылавай, стракатая сімфонія габеленаў Ларысы Густавай, Ніны Пілюзінай, Людмілы Пятруль... І праз пластычныя ці маляваныя выявы — сапраўдны парад аўтарскіх тэхнік! Гэтымі днямі, да 20 студзеня, жыццё наша расквечана і ўзрушана той дзівоснай мастацкай рэальнасцю, што ўтварылася дзякуючы таленту і натхненню многіх майстроў. Маладыя і сталыя, вельмі адрозныя ў творчасці, яны паяднаныя тым, што нясуць у сабе чыстае святло мастацтва і па-дзіцячы шчырае здзіўленне перад жыццём ды радасць ад праяў хараства.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Фота Віктара Кавалёва

З пошты «ЛіМа»

Вечар паэзіі

У актавай зале Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава адбыўся творчы вечар паэтэсы Тамары Красновай-Гусачэнкі, якая з'яўляецца лаўрэатам Міжнароднай літаратурнай прэміі імя Сімяона Полацкага, Міжнароднага фестывалю нацыянальных культур, аўтарам васьмі кніг і шматлікіх публікацый у літаратурных часопісах Расіі і Беларусі. Нядаўна яна была ўзнагароджана медалём Францыска Скарыны. Павіншаваць паэтэсу прыйшлі будучыя філолагі — студэнты універсітэта, віцебскія пісьменнікі, а таксама прыхільнікі яе творчасці.

Падчас вечарыны склалася атмасфера ўзаемнага даверу, шчырасці і адкрытасці. Гучалі вершы Т. Красновай-Гусачэнкі, якія заўсёды прасякнуты жыццялюбствам.

Нядаўна ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" пабачыў свет восьмы зборнік Т. Красновай-Гусачэнкі «Осень молодая». Таму сустрэча ва універсітэце сталася адначасова і прэзентацыяй гэтай кнігі.

Загадчыца кафедры беларускай літаратуры ВДУ Вольга Русілка засяродзіла ўвагу прысутных на праблематыцы вершаў паэтэсы. Сярод асноўных яе тэм — любоў да Радзімы, ідэя славянскай еднасці.

А пісьменнік Барыс Беляжэнка стварыў своеасаблівы слоўны партрэт Т. Красновай-Гусачэнкі, адзначыўшы галоўныя якасці яе натуры: спалучэнне сілы волі, мужнасці і дзіцячага светаўспрымання, працавітасці і шчодрасці душы.

Вечарына доўжылася каля двух гадзін. Паэтэса дэкламавала свае вершы, многія з якіх яе прасілі прачытаць студэнты. Здавалася, аўдыторыя прысутнічае пры нараджэнні крыштальна-празрыстых радкоў, якія ліліся, быццам песня.

І песні сапраўды гучалі. Музыку на вершы Тамары Іванаўны напісалі кампазітар Аляксандр Іваноў і былы выкладчык універсітэта Надзея Несцярэнка. Выканалі іх салістка Віцебскай абласной філармоніі Аксана Новікава і студэнт філфака Ігар Ягораў.

Валянціна АЛЕЙНІКАВА

Гасцёўня рыхтуецца стаць народнай

У гэты дзень на сустрэчу з паэтамі ў гарадскі Дом культуры Талачына прыйшлі вучні і настаўнікі мясцовых школ, аматары прыгожага пісьменства. Мерапрыемства чакалася не зусім звычайнае: сябры паэтычнай гасцёўні "Друць", якая дзейнічае ўжо больш як 10 год, трымалі своеасаблівы экзамен перад абласной камісіяй з навукова-метадычнага цэнтра на права насіць ганаровае званне "народнага" аматарскага аб'яднання.

Куратар гасцёўні Святлана Васільева прадставіла ўдзельнікаў паэтычнай "Друці": аўтара дзвюх паэтычных кніг, члена СПБ А. Мазура, а таксама Я. Дарафеева, В. Аўсіевіча, К. Кастрыцу, І. Буракову, У. Чаплянка, З. Шчыгельскую, В. Лазарэнку. Усе яны чыталі свае творы, прысвечаныя роднаму краю, маці, каханню... Мясцовыя спевакі К. Хадневіч, Р. Бладыка і Р. Забалотнік дарылі слухачам лірычныя песні.

Як стала вядома, абласная камісія годна ацаніла паэтычную гасцёўню і накіравала адпаведныя матэрыялы ў Міністэрства культуры Беларусі на наданне ёй звання "народнага" аматарскага аб'яднання.

Анатоль БЯРОЗКІН

Да чытачоў — у Бабруйск

Для бабруйскіх бібліятэкараў, якія сабраліся ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя М. Горкага, гэта быў своеасаблівы паказальны семінар на тэму "Як правесці сустрэчу з пісьменнікам". Арганізавалі ж яго начальнік рэдакцыйна-выдавецкага аддзела выдавецтва "Красіка-прынт" Людміла Несцяровіч і загадчык аддзела прозы часопіса "Полымя" Анатоль Зэкаў. На працягу гадзіны ішла зацікаўленая размова аб беларускай літаратуры і тэндэнцыях яе развіцця на сучасным этапе, аб выдавецкай дзейнасці "Красіка-прынт" і РВУ "Літаратура і Мастацтва", пра часопіс "Бібліятэка прапануе" і перыядычныя выданні Рэдакцыйна-выдавецкай установы. Анатоль Зэкаў чытаў вершы і пародыі, адказваў на пытанні прысутных, разважаў аб ролі кнігі ў выхаванні падрастаючага пакалення, удзеле пісьменнікаў у мерапрыемствах, якія праводзяцца бібліятэкамі.

У той жа дзень Анатоль Зэкаў сустрэўся таксама з навучэнцамі Бабруйскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа і вучнямі ды настаўнікамі СШ № 32. Зрэшты, школа прымала пісьменніка не ўпершыню.

Наталля АЛЯКСАНДРАВА

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Леанід ГАЛУБОВІЧ
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Жана МАЛЕВІЧ
(адказны сакратар)
Мікола СТАНКЕВІЧ
(намеснік галоўнага рэдактара)
Ірына ШАЎЛЯКОВА

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-66-71
літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3681
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 16.01.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 208

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686